WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЛЮТАГА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 23
(26631)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АСЦЯРОЖНА — ТУМАН І ГАЛАЛЁДЗІЦА!

У бліжэйшыя суткі, 9 лютага, у цэлым па Беларусі будзе воблачнае з прасяненнямі надвор'е, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры.

Ноччу месцамі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, днём пераважна па ўсходняй палове Беларусі пройдзе невялікі снег. Ноччу і раніцай месцамі згусціцца туман. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Рэспубліканскі гідраметэацэнтр перадаў папярэджанне аб гэтых негатыўных з'явах надвор'я па ўсіх рэгіёнах краіны.

Вецер усходні, ад 4 да 9 метраў у секунду. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 9—16 градусаў, пры прасяненнях яна панізіцца да 22 градусаў, днём будзе 4—10 градусаў ніжэй за нуль.

Выбары-2010

ПРАГРЭС ПАЙШОЎ

Вылучэнне ў склад акруговых выбаркамаў адзначылася ўзрослай актыўнасцю партый

Днямі прайшла сустрэча кіраўніцтва ЦВК з прадстаўнікамі дыпмісій Еўрасаюза. Дыпламаты Балгарыі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Фінляндыі, Францыі, Чэхіі, Швецыі, Эстоніі цікавіліся ходам выбарчай кампаніі, як ідзе вылучэнне ў склад выбаркамаў, асаблівасцямі агітацыйнай кампаніі і якім чынам яна будзе фінансавацца. Шырокая гама пытанняў хвалявала прадстаўнікоў пасольстваў, і гэта цалкам заканамерна, улічваючы, што многія з іх у нашай краіне нядаўна і ўпершыню прысутнічаюць пры электаральнай падзеі. У цэлым быў праяўлены інтарэс да беларускай выбарчай сістэмы, у тым ліку яе новых асаблівасцяў, што ўзніклі са зменамі ў заканадаўстве.

Паводле слоў сакратара ЦВК Мікалая ЛАЗАВІКА, які непасрэдна ўдзельнічаў у сустрэчы, яна насіла традыцыйны характар — падобныя мерапрыемствы праводзяцца падчас кожнай выбарчай кампаніі. «Натуральна, дыпламаты назіраюць за ўсімі сацыяльна-палітычнымі працэсамі ў нашай краіне, і выбары не могуць застацца па-за полем іх зроку, — канстатуе сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. — Зразумела, яны будуць цікавіцца ходам выбараў, тым, як удзельнічаюць у іх тыя ці іншыя суб'екты, рабіць заключэнні для сваіх урадаў. А калі захочуць, то і вывучыць сітуацыю больш паглыблена». Прадугледжваецца магчымасць удзелу дыпламатаў у назіранні за выбарамі ў асноўны дзень галасавання. Для гэтага ім варта звярнуцца ў Міністэрства замежных спраў з адпаведнай просьбай. Пры наяўнасці запрашэння з боку МЗС, Цэнтральная камісія зможа акрэдытаваць для назірання за ходам галасавання і падліку галасоў. Аднак гэта ўжо бліжэй да асноўнага дня выбараў — 25 красавіка.

Што да надзённых спраў, то якраз учора завяршылася фарміраванне акруговых выбаркамаў. А пакуль у ЦВК збіраюцца звесткі з усёй краіны, паглядзім, хто ж вылучаўся ў склад камісій гэтага ўзроўню. Прэтэндэнтаў на гэтым этапе сталася 5499. Працоўныя калектывы прадстаўленыя 910 (ці 16,5 адсотка) кандыдатурамі. Грамадзяне шляхам падачы заявы — 1888 (або 34,3 адсотка). І нарэшце колькаснае лідарства — за палітпартыямі і грамадскімі аб'яднаннямі: яны вылучылі 2701 прэтэндэнта (49,1 адсотка). Вядома ж, доля ГА ў гэтым паказчыку — куды больш істотная: 40,6 адсотка (2233 прадстаўнікі). У стане лідараў пакуль без перамен: ФПБ — 851 кандыдатура, БРСМ — 338, Белая Русь — 332, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў — 252, Беларускі саюз жанчын — 243 кандыдатуры і г.д.

Аднак партыі, несумненна, ажывіліся: на гэтым этапе выбарчай кампаніі яны «дэлегавалі» ў склад выбаркамаў 8,5 адсотка (468 чалавек). Нагадаем, што пры вылучэнні ў тэрытарыяльныя камісіі партыйцы «абазначыліся» ўсяго толькі адным адсоткам. Пашырыўся і «асартымент»: вылучэнне ў склад абласных выбарчых камісій адбылося з удзелам 13 з 15 зарэгістраваных у краіне партый (у параўнанні з дзевяццю, якія вылучаліся ў тэрытарыяльныя камісіі).

У лідарах — камуністы: КПБ вылучыла дзве сотні прадстаўнікоў, а Беларуская партыя аб'яднаных левых «Справядлівы свет» — 104. Лічбамі могуць пахваліцца таксама АГП (43 вылучэнцы), Беларуская аграрная партыя (23), Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі і БНФ (па 22). Больш сціплая статыстыка ў Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай згоды (14 вылучаных прэтэндэнтаў), Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці (12), Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) — 10, Беларускай патрыятычнай партыі (7), Беларускай партыі «Зялёныя» (6), Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі (4).

— Рэальную актыўнасць праяўляюць літаральна 5-6 партый, — каментуе вынікі вылучэння Мікалай Лазавік. — Астатнія ж занялі чакальную пазіцыю. Аднак, несумненна, прагрэс ёсць — у параўнанні з вылучэннем у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, дзе партыйцы склалі літаральна адзін адсотак.

Ён канстатуе павелічэнне актыўнасці партый на гэтым этапе выбараў і не сумняваецца ў яшчэ больш істотным яе росце пры вылучэнні ў склад участковых камісій:

— У тым, што актыўнасць будзе яшчэ большай, я не сумняваюся. Прадстаўнікі палітычных партый раней заяўлялі, што найбольш іх цікавяць менавіта ўчастковыя выбарчыя камісіі. І мяркую, што яны не пашкадуюць сваіх кадравых рэсурсаў, каб быць там максімальна прадстаўленымі.

Зоя ВАРАНЦОВА.

РАЗВІЦЦЁ АДНОСІНАЎ БЕЛАРУСІ З ЕС АБМЕРКАВАЎ СЯРГЕЙ МАРТЫНАЎ У ЧАС ВІЗІТУ Ў ФРГ

Пытанні далейшай актывізацыі беларуска-германскага ўзаемадзеяння, а таксама развіцця адносінаў па лініі Беларусь — ЕС былі абмеркаваны ў час візіту ў Германію міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргея Мартынава, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе МЗС.

Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства прыняў удзел у 46-й Мюнхенскай канферэнцыі па пытаннях палітыкі бяспекі, якая 5—7 лютага прайшла ў Мюнхене. У фармаце форуму Сяргей Мартынаў правёў перагаворы з віцэ-канцлерам, міністрам замежных спраў ФРГ Гіда Вестэрвеле, кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў Швейцарыі і Украіны — Мішлінам Кальмі-Рэем і Пятром Парашэнкам, саветнікам федэральнага канцлера Германіі па пытаннях знешняй палітыкі і бяспекі Крыстафам Хойсгенам. У час сустрэч прыярытэтная ўвага была ўдзелена абмеркаванню далейшых захадаў па актывізацыі двухбаковага ўзаемадзеяння, а таксама развіццю адносінаў Беларусі з ЕС.

Адбыліся сустрэчы Сяргея Мартынава з генеральным сакратаром АБСЕ Маркам Перэнам дэ Брышамбо, міністрам замежных спраў Італіі Франка Фраціні, кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Ірана Манучэхрам Матакі, міністрам замежных спраў Славеніі Самуэлем Жбогарам, прадстаўнікамі Савета Еўрасаюза і Савета нацыянальнай бяспекі ЗША Хаўерам Саланам, сааўтарам праграмы Нана-Лугара Сэмам Нанам.

Фота Анатоля КЛЕЧКА.

Жыхар Заслаўя Міхаіл ЕРМАЛОВІЧ і яго ўнук Аляксандр ідуць да вядомай прыдарожнай крыніцы ў вёсцы Рогава Мінскага раёна.

ДА РОГАЎСКАЙ КРЫНІЦЫ

Сяргей ПЯТКОЎ:

«ДЗЯРЖАЎНАЯ МАЁМАСЦЬ ПАВІННА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ЭФЕКТЫЎНА»

На пытанні карэспандэнта газеты «Звязда» адказвае першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Сяргей Пяткоў

— Сяргей Аркадзьевіч удакладніце, як ажыццяўляецца кіраванне дзяржмаёмасцю на сучасным этапе?

— Спачатку адзначу, што Дзяржаўны камітэт па маёмасці выконвае функцыі ў сферы кіравання, распараджэння, прыватызацыі, ацэнцы і ўліку маёмасці, што знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь. Гэтыя функцыі наш камітэт атрымаў згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 289 «Аб структуры Урада Рэспублікі Беларусь». Асноўнымі мэтамі кіравання дзяржаўнай маёмасцю ў 2009 годзе з'яўляліся: забеспячэнне ўліку і захаванасці дзяржмаёмасці, стварэнне ўмоў для маніторынгу маёмасці з мэтай прыняцця абгрунтаваных рашэнняў па яе выкарыстанні з улікам інтарэсаў дзяржавы, рэфармаванне дзяржпрадпрыемстваў для далейшага павышэння іх эфектыўнага функцыянавання, уцягванне ў гаспадарчы абарот дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца, а таксама кантроль за эфектыўным выкарыстаннем аб'ектаў дзяржаўнай маёмасці.

— Ці дастаткова эфектыўна сёння выкарыстоўваецца дзяржмаёмасць?

— Праблема эфектыўнага кіравання дзяржмаёмасцю даволі шматгранная. Ад таго, якім чынам дзяржава распараджаецца матэрыяльнымі і фінансавымі рэсурсамі, залежаць у выніку і тэмпы эканамічнага росту, і магчымасці забяспечваць сацыяльныя патрэбы насельніцтва.

Лепшым сведкам эфектыўнасці працы ў гэтым кірунку служаць канкрэтныя лічбы паступленняў даходаў у рэспубліканскі бюджэт. За мінулы год у рэспубліканскі бюджэт паступілі даходы ад выкарыстання і рэалізацыі дзяржаўнай маёмасці ў памеры 3646,7 млрд рублёў, што на 29,6 працэнта больш за запланаваныя на год паступленні, вызначаныя ўрадам краіны. Пры гэтым даходы ад выкарыстання дзяржаўнай маёмасці склалі 830,5 млрд рублёў, ад рэалізацыі дзяржаўнай маёмасці, у тым ліку акцый — 2816,2 млрд рублёў. У параўнанні з 2008 годам, летась паступленні ў бюджэт павялічыліся больш чым на 310 млрд рублёў.

— Якія новыя метады рэфармавання і рынкавыя механізмы прымяняюцца дзяржавай для больш рацыянальнага выкарыстоўвання дзяржаўнай маёмасці?

— Стварэнне адкрытых акцыянерных таварыстваў на працягу 2009 года ажыццяўлялася на базе як аднаго ўнітарнага прадпрыемства, так і некалькіх прадпрыемстваў, выходзячы з мэтазгоднасці развіцця той ці іншай галіны, неабходнасці стварэння аптымальнай і эфектыўнай структуры кіравання.

— Так, заўважу, што ў ходзе рэфармавання аўтатранспартных арганізацый, што ажыццяўляюць унутраныя і міжгароднія аўтаперавозкі, на базе рэспубліканскага аўтатранспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Гроднааблаўтатранс» і яго 19 даччыных прадпрыемстваў створана адно адкрытае акцыянернае таварыства; па аналагічнай схеме рэфармавана ў ААТ рэспубліканскае аўтатранспартнае ўнітарнае прадпрыемства «Гомельаблаўтатранс» сумесна з 17 даччынымі прадпрыемствамі.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 лістапада 2009 года № 549 «Аб некаторых пытаннях стварэння сумесным адкрытым акцыянерным таварыствам «Ферэйн» фармацэўтычнай вытворчасці ў Рэспубліцы Беларусь», прадпрыемства, як маёмасны комплекс навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дыялек», уключанае ў план прыватызацыі на 2009 год, перададзена ва ўласнасць СААТ «Ферэйн». Такая перадача маёмаснага комплексу ажыццяўляецца пры ўмове выканання акцыянерным таварыствам «Ферэйн» абавязкаў па фарміраванні статутнага фонду ў памеры не менш за суму чатырохразовага рынкавага кошту маёмаснага комплексу і чатырохразовай запазычанасці, а таксама пры перадачы ва ўласнасць дзяржаве акцый СААТ «Ферэйн» у памеры 25 працэнтаў плюс адна акцыя пасля фарміравання статутнага фонду.

Летась з агульнай колькасці створаных акцыянерных таварыстваў два ААТ арганізаваны з удзелам іншых, акрамя дзяржавы, заснавальнікаў. Гэта РУВП «Мебельная фабрыка «Усход», якое было рэфармавана ў ААТ з удзелам замежнага прыватнага гандлёва-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Беларуслес» (Расія), а таксама РУП «Мінскі прамысловагандлёвы камбінат «Верас», што быў створаны з удзелам закрытага акцыянернага таварыства «Сцяцкевіч» (Беларусь).

— Акрэсліце галоўныя мэты, што цяпер ставяцца дзяржавай перад правядзеннем прыватызацыі?

— Рэфармаванне дзяржаўнай маёмасці ў нашай краіне пачалося ў 1991 годзе і працягваецца цяпер з мэтай стварэння сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі, якая павінна мець дзейсны механізм дзяржаўнага і рынкавага рэгулявання, а таксама забяспечваць успрымальнасць да навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Сёння прыватызацыя — не самамэта, а сродак дасягнення ўстойлівага развіцця эканомікі, што дазваляе прыцягваць у рэальны сектар эканомікі інвестараў, гатовых, у тым ліку, браць на сябе абавязкі па забеспячэнні сацыяльных гарантый работнікаў.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

5273,4 МІЛЬЁНА ДОЛАРАЎ ЗША

на пачатак лютага мела Беларусь міжнародных рэзервовых актываў, разлічаных па методыцы Міжнароднага валютнага фонду: паводле папярэдніх звестак, за студзень золатавалютныя рэзервы скараціліся на 6,7 працэнта, ці на 379,1 мільёна долараў.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, міжнародныя рэзервовыя актывы рэспублікі ў нацыянальным вызначэнні за студзень зменшыліся на 377,3 мільёна долараў да 5601,2 мільёна долараў. У структуры міжнародных рэзерваў краіны рэзервовыя актывы ў замежнай валюце складаюць 2616,9 мільёна долараў, каштоўныя металы і камяні — 1114,9 мільёна долараў, іншыя актывы — 1869,9 мільёна долараў.

ТРАКТАР ВЫЕХАЎ НА ЧЫГУНКУ...

Учора каля 11 гадзін раніцы на перагоне Пухавічы — Рудзенск трактар выехаў на чыгуначны пераезд і сутыкнуўся з пасажырскім поездам «Гомель — Мінск».

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў групе інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС на транспарце МУС, 42-гадовы вясковец на трактары рухаўся на забараняльны сігнал святлафора. У выніку гэтага здарэння кіроўца трактара загінуў, а з пасажыраў поезда ніхто не пацярпеў. Трактар ужо не належыць узнаўленню, а ў поездзе пашкоджанае лабавое шкло і тармазная сістэма, абліцоўка лакамотыва. Затрымка ў руху поезда склала крыху больш за дзве гадзіны. З пачатку года гэта ўжо трэцяе ДТЗ на чыгунцы.

НУ І НУ!

ФОРТАЧНІК АБАКРАЎ... УЛАСНУЮ БАБУЛЮ

Мініяцюрны зламыснік, які пранікаў у чужыя кватэры праз форткі, не абмінуў кватэры і сваёй бабулі.

Паводле звестак **прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны ЛІСІЦКАЙ,** 21-гадовы мінчанін, які вызваліўся толькі напярэдадні гэтага года з месцаў пазбаўлення волі, залез у жыллё да пенсіянеркі і выкраў адтуль замарожаную курыцу, жаночыя боты і іншыя рэчы на суму каля 820 тысяч рублёў. Затрымалі ж зладзюжку падчас адной з гулянак, калі суседзі выклікалі міліцыю, каб праваахоўнікі супакоілі яго. А той, калі ўбачыў людзей у форме, адразу заявіў, што ён знаходзіцца ў вышуку, і прапанаваў забраць яго ў турму. Калі ж фортачніка везлі ў аддзел унутраных спраў, ён папрасіў яшчэ і заехаць дадому, каб забраць рэчы, падрыхтаваныя для такога выпадку раней. Між іншым, гэты злачынца пранікаў у кватэры пацярпелых з 4 да 6 гадзін раніцы, калі людзі спалі. Так, напрыклад, у адну з «вылазак» ён забраў з чужой кватэры 150 долараў і тэлефон, што ляжалі на халадзільніку.

Ігар ГРЫШЫН.

УЗБРОІЛІСЯ СЛЕСАР З МАЙСТРАМ

Дзесяць адзінак агнястрэльнай зброі, армейскі мінашукальнік з гарнітурай, штангай і электрадатчыкам канфіскавалі супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці ў двух жыхароў горада Гомеля ў ходзе правядзення мерапрыемстваў, накіраваных на прадухіленне незаконнага ўцягнення ў абарот незарэгістраванай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў.

У арсенале 51-гадовага грамадзяніна, які працуе слесарам на адным з прадпрыемстваў Гомеля, знойдзены рэвальверы «Маўзер» і «Скат», самаробны пісталет на базе «Марголіна», аўтамат МР-40 часоў Вялікай Айчыннай вайны, магазіны і камплектуючыя да зброі, а таксама армейскі мінашукальнік.

Тры аўтаматы ППШ, два пісталеты сістэмы «Наган», вінтоўку «Мосіна» часоў вайны і гранату Ф-1 захоўваў майстар вытворчага навучання адной з гомельскіх вучэбных устаноў. Дзе грамадзяне набылі зброю і для якіх мэтаў яе захоўвалі, высветліць праверка, паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

АБРАБАВАЛІ СКЛАД

У Брэсце абрабавалі склад прадпрыемства, якое выпускае будаўнічыя матэрыялы.

Зладзеі падабралі ключы ад склада па вуліцы Лейтэнанта Рабцава і вынеслі ПВХ-профіль і камплектавыя часткі для вытворчасці акон, усяго на суму каля 8 мільёнаў рублёў. Па падазрэнні ў крадзяжы затрыманы два рабочыя гэтага прадпрыемства.

Яна СВЕТАВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Уважаемые акционеры ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

19 февраля 2010 года состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Жабинковский сахарный завод»**, расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина.

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, Дом культуры ОАО «Жабинковский сахарный завод».

Повестка дня собрания:

1. Об утверждении разделительного баланса.
2. Об уменьшении размера уставного фонда Общества.
3. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
4. Об определении перечня акционеров ОАО «Столичный проспект».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник—пятница) начиная с 11.02.2010 г. по 18.02.2010 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 19 февраля 2010 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 19 февраля 2010 года, 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 8 февраля 2010 г.

Для регистрации при себе иметь следующие **документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 200037600.

ПУШКІНСКІ БАЛЬ

У Віцебску на галоўнай крытай канцэртнай пляцоўцы Прыдзвінскага краю — канцэртнай зале «Віцебск» упершыню пройдзе «Пушкінскі баль», падчас якога адновяць штрыхі эпохі Пушкіна, будуць танцаваць паланез, мазурку, вальс. На цікавае мерапрыемства запрасілі прадстаўнікоў Пасольства Расіі і работнікаў музея — сядзібы «Міхайлаўскае».

Як паведамілі «Звяздзе» ў Цэнтры культуры «Віцебск», баль адбудзецца 10 лютага. Ініцыятарамі і арганізатарамі праекта сталі гімназія № 3 імя Пушкіна, Цэнтр нацыянальных культур і гарадская грамадская арганізацыя «Рускі культурны цэнтр «Русь». На балі будуць дэкламаваць вершы паэта на французскай мове, выконваць рамансы на вершы Пушкіна, пакажуць сцэны з паэмы «Яўген Анегін» і аповесці «Пікавая дама».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.02.2010 г. (для б/н разлікаў)

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

1 долар ЗША	2 898,00
▲ 1 еўра	3 969,97
1 латвійскі лат	5 600,00
1 літоўскі літ	1 149,82
1 чэшская крона	152,34
1 польскі злоты	972,65
▼ 1 расійскі рубель	94,97
1 украінская грыўня	359,55

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,5158
10 UAH	37,8139
1000 BYR	10,5263
EUR	41,6937

ISSN 1990 - 763X

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КАМАНДА ЦІМАШЭНКІ ЗАЯЎЛЯЕ АБ ФАЛЬСІФІКАЦЫЯХ

Вынікі галасавання ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне з'яўляюцца скажонымі з-за фальсіфікацый, але каманда Юліі Цімашэнкі абараніць свой вынік, паведамляў учора афіцыйны сайт кандыдата ў прэзідэнты.

«Асаблівых маштабаў скажэнне народнага волевыяўлення дасягнула на усходзе, поўдні Украіны, часткова ў цэнтры. Гэта і занясенне выбарчымі камісіямі грамадзян у спісы выбаршчыкаў без рашэнняў судоў, і «каруселі», і зніклае чарніла, і маса іншых парушэнняў. Менавіта таму Віктар Януковіч пакуль «апярэджвае» Юлію Цімашэнку, аднак наша каманда прыкладзе ўсе намаганні, каб абараніць свой вынік», — заявіла намеснік старшыні фракцыі Блока Юліі Цімашэнкі Алена Шусцік.

Паводле звестак апрацоўкі 98,7 % пратаколаў участковых выбарчых камісій, на выбарах прэзідэнта Украіны за Віктара Януковіча прагаласавалі 48,64 %, за Юлію Цімашэнку — 45,78 % выбаршчыкаў. Не падтрымалі ні аднаго кандыдата 4,38 %. Такім чынам, разрыў паміж кандыдатамі склаў 2,86 %.

Цімашэнка ўжо відавочна не зможа дагнаць свайго апанента. У той жа час ЦВК пакуль не спяшаецца аб'яўляць пераможцу.

НЕ ДАЧАКАЎШЫСЯ ЗЕНІТАК АД РАСІІ, ІРАН РАСПРАЦАВАЎ СВОЙ АНАЛАГ С-300

У Іране распрацаваны зенітна-ракетны комплекс, які па характарыстыках «не толькі не саступае, але нават і пераўзыходзіць расійскую сістэму ППА С-300», заявіў інфармацыйнаму агенцтву ІРНА прадстаўнік іранскага ваеннага камандавання Хешматала Касіры.

Паводле яго слоў, новы комплекс, распрацаваны высілкамі адмыслоўцаў іранскага ВПК, хуткім часам паступіць на ўзбраенне нацыянальнай арміі. Гэты праект блізкі да завяршэння і рэалізуецца ў рамках праграмы дасягнення самазабяспечанасці нацыянальных узброеных сілаў у самых розных галінах, у тым ліку ў галіне супрацьпаветранай абароны.

Нагадаем, у 2007 годзе Іран і Расія склалі кантракт на пастаўку комплексаў С-300. Аднак, як паведаміў Касіры, пастаўкі дагэтуль не пачаліся. «Зенітна-ракетныя комплексы С-300 у рамках заключанага два гады таму кантракта ў Іран не пастаўляліся, — сказаў генеральны дырэктар «Росабаронэкспарт» Анатоль Ісайкін. — Пры гэтым сам кантракт паступова выконваецца».

ЗША ЗНІШЧЫЛІ 70 % СВАЁЙ ХІМІЧНАЙ ЗБРОІ

Армія ЗША знішчыла 22,3 тысячы тон хімічнай зброі, або 70 % ад агульнай колькасці яе запасаў, гаворыцца ў прэс-рэлізе Дэпартамента Арміі. У 2009 годзе на чатырох заводах у ЗША было знішчана больш за тры тысячы тон атрутных рэчываў, уключаючы зарын, іпрыт і нервова-паралітычны ві-ікс. На момант пачатку ліквідацыі ў першай палове 1990-х гадоў запасы хімзброі ў ЗША складалі 31,5 тысячы тон.

У той жа час Расіі засталося ліквідаваць 22 тысячы тон атрутных рэчываў. Хімзброя будзе ліквідавана ў рамках чацвёртага і апошняга этапа знішчэння запасаў хімічнай зброі. Выкананне чацвёртага этапа пачнецца ў 2010-м і завершыцца да 2012 года.

БРЫТАНСКІЯ ВУЧОНЫЯ ВЫСВЕТЛІЛІ, ЧАМУ АДНЫ ЛЮДЗІ СТАРЭЮЦЬ РАНЕЙ ЗА ІНШЫХ

Брытанскія вучоныя выявілі групу генаў, якія вызначаюць «хуткасць старэння». Іх адкрыццё можа перавярнуць падыход медыцыны да праблемы здароўя і лячэння «ўзроставых» хваробаў, такіх, як сардэчна-сасудзістыя захворванні, некаторыя віды раку і старэчая прыдуркаватасць, паведамляе The Guardian

Вызначаныя гены могуць прымусіць чалавека па шэрагу біялагічных прыкмет быць на цэлых 8 гадоў «старэйшым» за тых, у каго гэты генетычны матэрыял адсутнічае. Падобнае спалучэнне генаў ёсць прыкладна ў 7 % насельніцтва. Яшчэ 38 % людзей з-за генаў у сярэднім «старэйшыя» за сваіх аднагодкаў на 4 гады. У 55 % насельніцтва гэты генетычны матэрыял наогул не сустракаецца.

Такім чынам, навукоўцам атрымалася паказаць, што старэнне і зношванне арганізма звязаныя не толькі з ходам часу, уплывам навакольнага асяроддзя і шкодным звычкамі, але і са спадчыннасцю — некаторыя людзі з нараджэння асуджаныя на ранюю старасць.

КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА ЗА ПАРУШЭННЕ АЎТАРСКІХ ПРАВОЎ

Крымінальная справа заведзена ў дачыненні да трох жыхароў Наваполацка за парушэнне аўтарскіх правоў, паведаміў БЕЛТА начальнік аддзела 9-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК МУС Беларусі Яўген Сушынскі.

Індывідуальныя прадпрымальнікі 1967, 1987 і 1984 гадоў нараджэння рэалізоўвалі ў гандлёвых цэнтрах Полацка і Наваполацка кантрафактную аўдыё- і відэапрадукцыю. Усяго па месцы жыхарства і працы ў іх было канфіскавана 10,1 тыс. дыскаў. Выяўлена, што сваімі дзеяннямі мужчыны парушылі правы трох праваўладальнікаў на распаўсюджванне гэтага тавару, прычыніўшы ім урон на суму каля Br212 млн.

Фота БЕЛТА.

Намеснік начальніка 9-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК МУС Беларусі Андрэй КРАСКО.

У дачыненні да навапалачан заведзена крымінальная справа па арт. 201 ч. 1 Крымінальнага кодэкса Беларусі, які прадугледжвае да 5 гадоў пазбаўлення волі. Па справе вядзецца следства.

МАЛОЧНЫЯ АЎТАМАТЫ сталі вельмі папулярныя ў Чэхіі

Цікава

У Чэхіі папулярнасцю карыстаюцца аўтаматы для продажу малака, якія называюць малакаматамі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Аўтамат выглядае як устройства для продажу кавы або іншых напіткаў. Для таго каб купіць малако, неабходна кінуць у аўтамат манеты і падставіць бутэльку пад дазатар.

Ініцыятарамі продажу малака праз сетку аўтаматаў выступілі чэшскія фермеры. Гэтым спосабам яны хочуць змагацца з нізкімі закупачнымі цэнамі на малако і буйнымі гандлёвымі сеткамі, якія вымушаюць працаўнікоў вёскі прадаваць прадукт па мінімальных цэнах. На думку фермераў, малако з аўтамата больш смачнае і карыснае, чым з пакета, таму што трапляе да кліента непасрэдна ад вытворцы.

Пакуль малакаматы ўстаноўлены ў малых і сярэдніх гарадах. Аднак іх папулярнасць у мясцовага насельніцтва стала штуршком да пашырэння бізнесу: у сакавіку малочныя аўтаматы з'явяцца і ў Празе і Брно.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛОМО – ММЗ ИМЕНИ С.И. ВАВИЛОВА» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складского комплекса, расположенного в Минском районе, промузел «Колодищи» в составе:

1) Здание арочного складского помещения № 5, 679,5 кв.м; **2)** Здание арочного склада № 8, 697,5 кв.м; **3)** Здание арочного склада № 6, 373,3 кв.м; **4)** Здание склада, 652,8 кв.м; **5)** Здание котельной, 251,7 кв.м; **6)** Здание проходной, 36,6 кв.м; **7)** Здание сборно-щитового домика, 58,4 кв.м; **8)** Здание склада цемента и мела, 33,9 кв.м; **9)** Здание склада, 4316,5 кв.м; **10)** Здания блока металлических складов, 324,5 кв.м; 326,3 кв.м; **11)** Здание металлического склада, 68,2 кв.м; **12)** Здание склада древесного пека, 54,8 кв.м; **13)** Здание автовесов, 25,2 кв.м; **14)** Здание трансформаторной подстанции, 117,7 кв.м; **15)** Здание насосной станции, 57,5 кв.м; **16)** Здание блока складских помещений, 844,7 кв.м; **17)** Здания складов, 141,0 кв.м; 184,9 кв.м; 240,5 кв.м; 258,4 кв.м; **18)** Пристройка к сборно-щитовому домику, 70,5 кв.м; **а также сооружений и оборудования.** *Начальная цена с НДС – 8 227 770 300 бел. руб. Площадь земельного участка – 7,9748 га.* Задаток – 500 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009. Аукцион состоится **10.03.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.03.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ВЫЙШЛА Ў СВЕТ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАЕ ВЫДАННЕ «БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ»

Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выпусціў навукова-папулярнае выданне «Беларускі шлях» пад рэдакцыяй Алега Праляскоўскага і Льва Крыштаповіча. Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА доктар філасофскіх навук, прафесар Леў Крыштаповіч, аўтарскі калектыў лічыць, што адрасаванае шырокаму колу чытачоў выданне падштурхне навукова-даследчую думку ў Беларусі, у нейкай ступені дасць магчымасць стымуляваць дыскусію па пытаннях эканомікі, палітыкі, нацыянальнай ідэі.

Аўтары ставілі перад сабой мэту — прааналізаваць гісторыю постсавецкай Беларусі, г.зн. шлях развіцця краіны з пачатку 90-х гадоў да цяперашняга часу. «Ёсць шмат літаратуры, якая спрабуе разабрацца: у чым заключаецца феномен Беларусі. Але ў гэтай масе фактычна няма адзінага погляду на праблему, суцэльнага асэнсавання. Мы зыходзілі з таго, каб даць не храналагічную даведку перыяду, а пранікнуць у сэнс пераўтварэнняў, якія адбыліся за няпоўныя дваццаць гадоў», — сказаў Леў Крыштаповіч.

У выданні раскрываюцца найважнейшыя асаблівасці ўнутрыпалітычнага і міжнароднага развіцця Беларусі ў постсавецкі перыяд. Аналізуецца дыялектыка абвяшчэння незалежнасці, высвятляецца характар і дынаміка развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі, разглядаюцца пытанні станаўлення грамадзянскай супольнасці і сацыяльнай кансалідацыі, асэнсоўваецца феномен нацыянальнай ідэі і асноўныя прынцыпы ідэалогіі беларускай дзяржавы, асвятляюцца знешнепалітычныя прыярытэты, выяўляецца спецыфіка фарміравання нацыянальных інтарэсаў і забеспячэння нацыянальнай бяспекі, раскрываецца роля сродкаў масавай інфармацыі, паказваецца неабходнасць дэбюракратызацыі органаў дзяржаўнага кіравання, захавання і развіцця нацыянальнай культуры беларускага народа. У рабоце аўтары не адыходзілі ад вострых пытанняў, а паказалі, што шлях развіцця краіны сфарміраваўся і ў сутыкненні інтарэсаў.

Як адзначыў Леў Крыштаповіч, у кнізе зроблена спроба паказаць метадалогію асэнсавання нацыянальнага развіцця. «Не трэба нікуды ісці: ні на Усход, ні на Захад, трэба ўладкоўваць жыццё на сваёй уласнай зямлі. Гэта значыць, што дзяржаўная палітыка павінна грунтавацца на нацыянальным інтарэсе», — лічыць філосаф.

ЭСТОНСКІЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ПРЫЕХАЛІ ЗНАЁМІЦЦА З БЕЛАРУСКІМ БІЗНЭСАМ

Бізнэсмены з Эстоніі напраканцы мінулага тыдня наведалі Беларусь — Арнэ Сына і Андрэс Ціна, прадстаўнікі Асацыяцыі малых і сярэдніх эстонскіх прадпрыемстваў «EVEA», сустрэліся з кіраўніцтвам Беларускага саюза прадпрымальнікаў, дзе абмеркавалі магчымыя перспектывы для супрацоўніцтва. Прынамсі, эстонскія бізнэсмены прызналіся, што амаль нічога не ведаюць пра беларускую эканоміку і бізнэс, але пры гэтым цікавасць да нашай краіны існуе. Карэспандэнту «Звязды» ўдалося задаць некалькі пытанняў эстонскім бізнэсменам пра тое, што ж іх прывяло ў Беларусь.

— Чаму мы сюды прыехалі? Каб арганізаваць кантакты паміж беларускімі і эстонскімі прадпрымальнікамі, бо ў Эстоніі няма інфармацыі пра беларускае прадпрымальніцтва, — адказвае **Арнэ Сына, член Савета Асацыяцыі малых і сярэдніх эстонскіх прадпрыемстваў «EVEA».** — Прыехалі, бо бачым, што ёсць будучыня ў галіне бізнэсу паміж нашымі краінамі. Эстонцаў цікавяць беларускі рынак, кантакты, магчымасці інвестыцый.

— Якой інфармацыі пра Беларусь не хапае?

— Любой. Інфармацыі наогул няма, мы чуем пра Беларусь толькі тады, калі Беларусь і Расія спрачаюцца пра што-небудзь. А штодзённай інфармацыі няма, і таму мы тут.

— Якія могуць быць перспектывы ў бізнэсменаў з нашай і вашай краінай?

— Перспектывы вялікія, у першую чаргу ў галіне турызму. Але пра турызм мы ведаем, а пра астатняе — нічога. Дарэчы, як, напэўна, і вы не ведаеце, што ёсць у нас. Таму калі вы мне задасце такое пытанне праз паўгода, то я змагу адказаць больш дакладна.

— Якія ўражанні ад Беларусі ў вас засталіся?

— Чыста, акуратна, — адказаў Андрэс Ціна, які патрапіў у Беларусь упершыню. — Мы рабілі фотаздымкі, каб адправіць у талінскую мэрыю — хай пабачаць, як трэба дарогі чысціць! *(Смяюцца.)*

— Шчыра кажучы, мне падабаюцца людзі ў Беларусі, — працягвае Арнэ Сына. — Вы адкрытыя. Асабіста мне падаецца, што тут парадак. У тым сэнсе, што мы нідзе не бачылі п'яных людзей ці якіх-небудзь бандытаў...

— Нам прасцей, чым іншым замежнікам, — зноў пачынае гаварыць Андрэс Ціна. — Бо мы ж усё-такі па-руску таксама размаўляем, і калі што — нас зразумеюць. У гэтым плане нам будзе лягчэй прадстаўляць інтарэсы беларусаў у Фінляндыі ці Швецыі, бо мы разумеем і вас, і іх. Таму, я мяркую, ісці вам ў Скандынавію лепей праз эстонцаў, якія ведаюць і заходні, і ўсходні менталітэт.

Прадстаўнікі эстонскай асацыяцыі і Беларускага саюза прадпрымальнікаў дамовіліся перш за ўсё наладзіць абмен інфармацыяй паміж сабой, каб бізнэсмены абедзвюх краін ведалі магчымасці і зацікаўленасць суседзяў, дамовіліся правесці семінары для беларусаў пра ўмовы дзейнасці ў Эстоніі і наадварот — для эстонцаў пра ўмовы дзейнасці ў Беларусі, а таксама абмеркавалі магчымасць адкрыцця ў Эстоніі беларускага гандлёвага цэнтра. Акрамя таго, ужо ў сакавіку дэлегацыя беларускіх прадпрымальнікаў збіраецца паехаць ў Эстонію, каб на месцы ацаніць перспектывы для супрацоўніцтва, у тым ліку і ў галіне экспарту беларускіх тавараў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЗАТРЫМАЛІ ПЯЦЯРЫХ

У Маларыцкім і Камянецкім раёнах зніклі дзве аўтамашыны «Фальксваген-Пасат». Аператыўнікі двух раёнаў аб'ядналі свае намаганні і ім ўдалося выйсці на банду з пяці чалавек, якіх і затрымалі.

Жыхару Камянца пашчасціла — яму аўтамабіль вярнулі, а вось яго калегу на няшчасці не пашанцавала — другі «Фальксваген» зладзеі паспелі разабраць. Следства працягваецца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

РУЛЬ АСОБНА, АЛКАГОЛЬ АСОБНА

Аліварыя і сталічнае УДАІ правялі мяжу паміж кіраваннем аўто і ўжываннем спіртных напояў

— Ні за якія пернікі не сяду за руль п'янай — занадта пакутліва мне правы даліся, — любіць паўтараць мая сяброўка, якая з дзясятак разоў безвынікова «штурмавала» перакрыжаванні ў раёне Сямашка, пакуль у рэшце рэшт не вярнулася дамоў з пасведчаннем кіроўцы.

— Яна ж з алкаголем! — крычаў мой знаёмы аўтааматар, выплёўваючы цукерку, якой я без ліхога намеру, самі разумееце, толькі што яго пачаставала.

Тады я была гатовая пакрыўдзіцца, а як сама села за руль, дык перад ранішняй паездкай яшчэ і з вечара сабе нічога не дазваляла. І цвёрда веру — гэта якраз тая сітуацыя, дзе лепш, як кажуць, перадбаць, чым недадбаць...

Аднак многія падобнымі «ўмоўнасцямі» сябе не скоўваюць. І, прапусціўшы «шкляначку», не грэбуюць сесці за «штурвал». Адны з іх лічаць сябе віртуозамі: «прафесіянал у любым стане прафесіянал». Другія — не ацэньваюць свайго стану: «што мне будзе ад няшчасных 100 грамулек». Трэція — спадзяюцца нашармака. А прадстаўніцы прыгожай паловы часам банальна не бяруць у разлік, што з іх сціплай вагою перавысіць дазволеную норму ў 0,5 праміле лёгка нават паветрам, не тое што «маленькім келіхам». Штодня супрацоўнікамі сталічнага ДАІ затрымліваецца каля 20 такіх «умельцаў» (у выхадныя па традыцыі ўдвая больш), з пяток — прадстаўніц слабой паловы...

І самае сумнае, што «бізун» адказнасці не дапамагае. Паводле слоў **Жанны ТРАЙНО, начальніка аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама,** нават пасля ўзмацнення адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення і ўвядзення крымінальнай адказнасці за паўторнае парушэнне, нейкага глабальнага змянення сітуацыі не адбываецца. «У Мінску летась адбылося 73 ДТЗ па віне кіроўцаў, якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. 13 чалавек загінулі і 91 атрымаў раненні. Прычым часцей за ўсё церпяць у такіх аварыях зусім не п'яныя кіроўцы, а ні ў чым не вінаватыя людзі, нярэдка дзеці». Здавалася б, «тармазоў» хапае, аднак аматары кіраваць «пад чаркай» усё адно сцюнуць на газ. Значыць, вытокі трэба шукаць глыбей. У свядомасці. Ва ўнутраных межах. Якую кожны павінен правесці сам для сябе. І ў тактыцы ўшчування ДАІ падтрымлівае... піўзавод Аліварыя.

Днямі імі распачатая сумесная акцыя «Правядзі мяжу» (пры інфармацыйнай падтрымцы холдынга «Атлант-М»), арыентаваная на адасабленне ўжывання алкаголю і кіравання аўто. Кампанія «Аліварыя» ўжо зарабіла імідж сацыяльна адказнай — пачынаючы з экалагічных праектаў і заканчваючы памкненнем прывіць аматарам пеннага напою культуру яго спажывання. Тут яны цалкам паслядоўныя, і ў чарговай акцыі сабе не здраджваюць.

— Безумоўна, мы, як вытворцы, зацікаўленыя і ў выпуску піва, і ў яго продажы. Аднак ёсць такія сітуацыі, у якіх спажыванне піва ў прынцыпе немагчымае! — кажа **гендырэктар Аліварыі Міхаіл ЧЭЧАНЕЎ.** — Гэта не толькі пазіцыя нашага прадпрыемства, якое нясе карпаратыўную сацыяльную адказнасць за дзеянні, якія мы робім, але і асабістая пазіцыя нашых супрацоўнікаў. І паверце, з тымі, хто ў такой сітуацыі не праводзіць мяжу для сябе, мы развітваемся. Пазіцыя павінна быць адназначнай — тут не можа быць прамежкавых станаў і паўмераў: ужываць алкаголь за рулём нельга — і не так важна піва гэта, ці любыя іншыя алкагольныя напоі.

На самых папулярных гатунках піва «Аліварыя», якія карыстаюцца найбольшым попытам у амаратараў ячнага напою, з'явіліся піктаграмы акцыі «Правядзі мяжу» — каб як мага больш людзей даведаліся пра яе, каб як мага больш людзей задумаліся... і правялі выразную і такую неабходную мяжу. Інфармацыйныя буклеты з'явіліся на запраўках ды іншых месцах, дзе часта даводзіцца бываць кіроўцам. Постары і каляндарыкі лішні раз нагадаюць людзям, што праблема ёсць і на яе нельга закрываць вочы. Машына маёй калегі ўжо «надухмяненая» аўтамабільным араматызатарам з сімволікай акцыі. Такія вось лаканічныя і ёмістыя знакі небыякавасці.

— Акцыя «Правядзі мяжу» скіраваная не на абстрактныя вялікія арганізацыі, а на асобу, — робіць акцэнт Міхаіл Чэчаневіч.

Сапраўды, гэта датычыцца кожнага з нас, нават калі за рулём не мы самі. Ёсць нагода задумацца — ці варта, каб нас падвозіў кіроўца «пад чаркай»...

— Пачынай гэту мяжу з сябе і з таго, хто побач — не толькі за рулём, але і ў побыце, — дадае кіраўнік Аліварыі. — Гэта значна больш, чым проста: «Кіроўца, не пі»...

ААТ «Піўзавод Аліварыя» стала добрым прадаўжальнікам міжнародных ідэй:

— За мяжой праводзіцца шмат цікавых кампаній і півавары часта з'яўляюцца іх ініцыятарамі і ідэйнымі натхняльнікамі, — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу Надзея ДЗЕШКАВЕЦ.** — Стала добрай традыцыяй раз на год праводзіць так званую еўрапейскую ноч без здарэнняў. У рэстаранах, барах, клубах наведвальнікам-кіроўцам прапануюць на выхадзе прайсці тэст на алкаголь, і калі ён паспяховы, удзельнік атрымлівае прыз. Ці скажам, арганізуюцца бясплатныя аўтобусы падчас буйных канцэртаў, іншых забаўляльных мерапрыемстваў...

А ў сваю чаргу кампанія аддае прыгожы пас усім неабыякавым:

— Мы хацелі б, каб да акцыі падключыліся і нашы кліенты, і крамы, і бары з рэстаранамі, — заўважае спадарыня Дзешкавец. — Магчыма, спецыяльныя сэрвісы таксі, школы, дзе вучаць кіраванню аўтамабілем. Ды і звычайныя школы — прапаганду і адукацыю ў гэтым пытанні варта пачынаць як мага раней, тым больш, што менавіта маладыя людзі ўтвараюць групу рызыкі.

Арганізатары акцыі пакуль не ставяць перад сабой нейкіх колькасных паказчыкаў — усё яшчэ толькі пачынаецца. Калі як мага больш людзей правядзе гэтую мяжу ў свядомасці, раз і назаўсёды вызначыцца з прыярытэтамі, тады іх місія будзе выкананая. А альтэрнатыва ў кожнага з нас насамрэч ёсць. Зрэшты званок сябру, таксі ці безалкагольнае піва пакуль ніхто не адмяняў.

Ала МАЧАЛАВА.

«ДЗЯРЖАЎНАЯ МАЁМАСЦЬ ПАВІННА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЦА ЭФЕКТЫЎНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усе гэтыя гады прыватызацыя ў рэспубліцы ажыццяўляецца дыферэнцыявана выходзячы з фактычнага фінансавага стану прадпрыемстваў, перспектыў іх развіцця. Каб не дапусціць сацыяльных узрушэнняў, прыватызацыя ў нашай краіне ажыццяўляецца вельмі ўзважліва.

З 2008 года пачаўся новы этап у правядзенні ў краіне прыватызацыі, які, пры захаванні асноўных прынцыпаў, характарызуецца маштабнасцю. Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2008 г. № 7 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 сакавіка 1998 года № 3», прыватызацыя дзяржаўнай маёмасці ажыццяўляецца ў адпаведнасці з планамі прыватызацыі. План прыватызацыі фарміруецца на трохгадовы перыяд.

Для выканання гэтага дэкрэта пастановай Саўміна ад 14 ліпеня 2008 года № 1021 зацверджаны план прыватызацыі аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці на 2008—2010 гады. Згодна з гэтым дакументам, прыватызаваць неабходна больш за 450 прадпрыемстваў розных галін эканомікі: прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі, гандлю і будаўніцтва.

Падобныя планы зацверджаны і адпаведнымі мясцовымі органамі, згодна з якімі прадугледжана прыватызацыя больш як 350 прадпрыемстваў камунальнай уласнасці.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

— Як паспяхова вялася прыватызацыя рэспубліканскай і камунальнай уласнасці летась і якія задачы ставяцца на найбліжэйшыя некалькі гадоў?

— У 2009 годзе было рэфармавана 168 прадпрыемстваў рэспубліканскай уласнасці, на базе якіх створана 108 адкрытых акцыянерных таварыстваў. Гэта буйныя прадпрыемствы прамысловага комплексу, сярод якіх: РУВП «Беларускі аўтамабільны завод, РУВП «Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік», РУВП «Віцязь», ВРУП «Завод паўправадніковых прыбораў». Сярод буйных прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу, якія ажыццяўляюць гадоўлю птушак на мяса і вытворчасць яек — РУВСП «Птушкафабрыка «Дружба» і РУВСП «Смалявіцкая бройлерная птушкафабрыка». Былі рэфармаваныя торфапрадпрыемствы, прадпрыемствы будаўнічай галіны, лёгкай прамысловасці, прадпрыемствы іншых ведамстваў.

Агульная колькасць работнікаў на рэфармаваных прадпрыемствах складае больш як 83 тысячы чалавек.

Акрамя гэтага, прыватызаваны сёлета 63 прадпрыемствы камунальнай уласнасці, падчас рэфармавання 60 прадпрыемстваў створана 59 адкрытых акцыянерных таварыстваў, а 3 прадпрыемствы прададзены на аўкцыёне па конкурсу.

У распрацаваным Дзяржмаёмасцю праекце Закона «Аб аб'ектах, што знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і відах дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы» (Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аб'ектах, што знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы» — у новай рэдакцыі), прадугледжваецца, у прыватнасці, выключэнне з уліку аб'ектаў, што не падлягаюць прыватызацыі, магістральных нафта- і нафтапрадуктаправодаў, аб'ектаў чыгуначнага транспарту, а таксама прадпрыемстваў і арганізацый, што уваходзяць у склад Беларускай чыгункі. Праект Закона 19 снежня 2009 года прыняты Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у першым чытанні.

Прыняцце гэтага Закона ў новай рэдакцыі дазволіць скараціць пералік арганізацый, якія не падлягаюць прыватызацыі.

У другім квартале 2010 года будзе разглядацца пытанне аб фарміраванні плана прыватызацыі аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці на 2011—2013 гады. Нагадаю, што фарміраванне пераліку прыватызуемых аб'ектаў будзе ажыццяўляцца, у прыватнасці, за кошт: стратных дзяржаўных арганізацый; арганізацый, якія будуць прапанаваны рэспубліканскімі органамі кіравання ў мэтах аптымізацыі падначаленых структур; арганізацый, якія выключаюцца з пераліку арганізацый, якія не падлягаюць прыватызацыі і маёмасць якіх знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці.

Сяргей КУРКАЧ.

ЖЫХАРКА ЛІДСКАГА РАЁНА ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ЗАБОЙСТВЕ ПРЫЁМНАГА ДЗІЦЯЦІ

Жыхарка Лідскага раёна Гродзенскай вобласці падазраецца ў забойстве прыёмнага малалетняга дзіцяці, паведамілі БЕЛТА ў абласной пракуратуры.

Пакуль яшчэ няма поўнага заключэння экспертаў-медыкаў, таму акалічнасці смерці дзіцяці не да канца ясныя. Але ёсць падставы для таго, каб падазраваць прыёмную маці ў забойстве.

Па гэтым факце праводзіцца праверка. У дачыненні да жанчыны заведзена крымінальная справа па ч. 2 арт. 139 («Забойства») КК Беларусі. Артыкул прадугледжвае да 25 гадоў пазбаўлення волі, альбо пажыццёвае зняволенне, а ў некаторых выпадках смяротнае пакаранне.

Як паведамлялася раней, хлопчык раптоўна памёр у снежні 2009 года. Смерці наступіла ў ванным пакоі, куды ён адправіўся ўмыцца пасля прыступу ванітаў. Яго цела знайшла прыёмная маці. Тады медыкі знайшлі на целе дзіцяці прыкметы траўмы жывата.

ДОМ XIX СТАГОДДЗЯ НА РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЗНЕСЛІ ЭКСКАВАТАРАМ

Няўжо Міністэрства культуры і цяпер не звернецца ў пракуратуру?

Гэтую тэму «Звязда» адсочвае ад пачатку лістапада. Пачалося з таго, што прадпрыемства «Мінская спадчына» ледзьве не зруйнавала помнік архітэктуры — дом XIX стагоддзя на вуліцы Рэвалюцыйная, 24а ў Мінску, не маючы на гэта адпаведнага дазволу. Працы прыпынілі, «Мінская спадчына» атрымала ўрэшце дазвол, у якім чорным па белым было прапісана **«весці разборку ручным спосабам».** Па-першае, каб выявіць схаваныя архітэктурна-планіровачныя асаблівасці будынка. Па-другое, каб выкарыстаць старадаўнюю цэглу пры аднаўленні аб'екта. У пачатку снежня частку будынка знішчылі экскаватарам. На месцы сабралася камісія, уключна з прадстаўнікамі Міністэрства культуры. Аднак па выніках разбору Упраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны не прыняло ніякіх рэзкіх мераў — ніхто не быў пакараны.

Як вынік — «Мінская спадчына» завяршыла сваю чорную справу — у суботу (!) увечары (!!), калі ўжо было цёмна (!!!) будынак цалкам знішчылі экскаватарам.

У рэдакцыі ёсць заключэнне Навукова-метадычнай рады аб неабходнасці «ручной разборкі будынка». Гэта — закон, адмяніць які можа выключна сама Рада. Знішчэнне будынка экскаватарам — парушэнне закону, якое павінна атрымаць ацэнку з боку пракуратуры.

...Учора ўдзень на аб'екце зноўку сабралася камісія — навуковы кіраўнік аб'екта Аляксандр Кропатаў, галоўны архітэктар аб'екта Генадзь Босак, галоўны інжынер «Мінскай спадчыны» Міхаіл Жых, а таксама прадстаўніца ўлады — Аксана Сматрэнка, намеснік начальніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры.

Трэба сказаць, што на з'яўленне карэспандэнта «Звязды» некаторыя прысутныя адрэагавалі вельмі нервова.

— Чаго вы фатаграфуеце? Вы не маеце права здымаць! — усчыніў крык Генадзь Босак, галоўны архітэктар праекта (ніжэй вы зразумееце, чаму).

— Хто вас сюды пусціў? Я вас сюды не запрашаў! — далучыўся да яго Міхаіл Жых.

Галоўнаму інжынеру «Мінскай спадчыны», якая зруйнавала дом, напэўна, невядома, што журналісту не трэба прасіць ягонага персанальнага дазволу, каб выканаць сваю законную працу.

А Генадзь Босак хваляваўся абсалютна абгрунтавана. Чаму — стала зразумела са слоў навукоўца кіраўніка аб'екта:

— А крайнім у іх у выніку апынецца прараб!.. — злаваўся Аляксандр Кропатаў. — Вы толькі ўявіце: у суботу, увечары, цёмна ўжо было!.. На гэтым будынку ў іх нават каштарыс складзены на разборку ўручную!.. Бо гэта — патрабаванне Міністэрства культуры! У пятніцу спадар Босак напісаў у журнале аўтарскага нагляду рэкамендацыю: што ён не супраць механізаванай разборкі будынка. Але гэтая рэкамендацыя не мае юрыдычнай сілы, каб бурыць дом! Бо ёсць рашэнне Рады аб разборцы ўручную. І гэтае рашэнне — закон, адмяніць ці перайначыць які можа толькі сама Рада! Нават калі я, навуковы кіраўнік аб'екта, напішу, што не супраць механізаванай разборкі, — па новы дазвол на новы від работ трэба было б звяртацца ў Міністэрства культуры.

У журнале аўтарскага нагляду сапраўды ёсць такі запіс за мінулую пятніцу — Генадзь Босак піша, што «не супраць далейшай разборкі механізаванымі сродкамі, пры ўзгадненні з навуковым кіраўніком...» Паводле слоў навукоўца кіраўніка, ніхто да яго не звяртаўся. Натуральна — бо субота і нядзеля выхадныя дні! Замест гэтага ў суботу падганяюць экскаватар — і дом руйнуюць... Між іншым, разам з недаследаванымі фрэскамі XIX стагоддзя...

— Я лічу, што вінаваты замоўца, «Мінская спадчына», бо не пракантралявалі працы на аб'екце, і падрадчык, які супраць нормаў выканаў незаконнае руйнаванне будынка, — пракаментаваў «Звязде» **Антон АСТАПОВІЧ, старшыня Таварыства аховы помнікаў.** — Цяпер Міністэрства культуры павінна звярнуцца ў пракуратуру, каб там далі ацэнку гэтым дзеянням. Калі Міністэрства не зробіць гэтага — «Мінскай спадчыне» ўсё сыдзе з рук!..

Чыноўніца міністэрства Аксана Сматрэнка склала акт агляду месца здарэння.

— Я склала акт агляду, прапановы адлюструю там жа. Мы аддамо гэта кіраўніцтву — намесніку міністра культуры Курашу, ён будзе вырашаць, ці звяртацца ў пракуратуру, — кажа Сматрэнка.

— На вашую думку, ці ёсць тут склад злачынства?

— Згодна з запісам у журнале аўтарскага нагляду, працы выкананы паводле рэкамендацыі галоўнага архітэктара праекта...

Аднак Аксана Сцяпанаўна прызнала, што рашэнне Рады ні архітэктар, ні хто іншы адмяніць не мелі права.

Гэтая сітуацыя — як момант ісціны для Міністэрства культуры. Пададуць заяву ў пракуратуру (бо калі помнік архітэктуры руйнуюць экскаватарам, факт злачынства відавочны)? Ці спусцяць, як гэта бывае, на тармазах?..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Абзац

◢ Камітэт Дзяржкантролю Беларусі і Падліковая палата РФ правядуць сёння ў Мінску сумеснае пасяджэнне калегіі. Пасяджэнне правядуць кіраўнікі ведамстваў Зянон Ломаць і Сяргей Сцяпашын. Калегія дасць заключэнне па справаздачы Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы за 2008 г. Будзе абмеркаваны план сумесных мерапрыемстваў на 2010 г.

◢ 65 чалавек былі эвакуяваныя з псіханеўралагічнага дома-інтэрната ў вёсцы Тарасікі Барысаўскага раёна. Прычынай стала задымленне ў памяшканні на другім паверсе будынка. Аб надзвычайным здарэнні паведаміла сістэма аўтаматычнай пажарнай сігналізацыі «Маланка». Персанал вывеў жыльцоў інтэрната на вуліцу. Як высветлілася, адбылося кароткае замыканне электраправодкі ў прыбіральні на другім паверсе. Ніхто не пацярпеў.

◢ У Новалукомлі (Чашніцкі раён) у дачыненні да 28-гадовай і 32-гадовай мясцовых жыхарак распачата справа аб наўмысным нанясенні цяжкіх цялесных пашкоджанняў. 5 лютага пасля сумеснага распіцця спіртных напояў жанчыны да смерці забілі знаёмага. 42-гадовы мужчына памёр ад пералому рэбраў і разрыву лёгкага.

◢ У цэнтры Мінска, на праспекце Незалежнасці ў раёне станцыі метро «Акадэмія навук» сутыкнуліся дзве іншамаркі. Удар быў такой моцы, што адну з іх падкінула ўверх і перавярнула. Рух на праспекце спыніўся на паўгадзіны. Выратавальнікам давялося аўтагенам разразаць аўтамабіль, каб дастаць вадзіцеля. Згодна з папярэдняй версіяй, «БМВ Х5», які рухаўся ад вул. Броўкі ў бок Акадэмічнай, нечакана рэзка павялічыў хуткасць і стаў сыходзіць на суседнюю паласу. У выніку ўрэзаўся ў паток сустрэчнага руху і ў лоб сутыкнуўся з «Доджам Плімут». Абодва вадзіцелі ў цяжкім стане дастаўленыя ў бальніцу.

◢ Грамадзянін Грузіі спрабаваў даць хабар супрацоўнікам міліцыі ў Вілейскім раёне. Ён мае дазвол на пастаяннае жыхарства ў Беларусі і жыве ў пасёлку Партызанскі на Вілейшчыне. Аднак яго знаёмыя знаходзяцца ў краіне без рэгістрацыі. Каб міліцыя не прыцягвала іх да адміністрацыйнай адказнасці, грузін і спрабаваў даць хабар (Br200 тыс.) супрацоўнікам па грамадзянстве і міграцыі Вілейскага РАУС. У выніку раённая пракуратура завяла ў дачыненні да яго крымінальную справу.

◢ На Валыні начальнік аддзялення памежнай службы раскраляў дваіх аператараў АЗС. Падчас тэхнічнага перапынку работнікі АЗС адмовілі настойліваму кліенту ў тэрміновай запраўцы яго аўтамабіля. Тады ён выклікаў на падмогу таварыша, і зламыснікі з аўтаматычнай агнястрэльнай зброі пачалі страляць у безабаронных аператараў. У выніку 48-гадовы работнік АЗС быў смяротна паранены, а яго 40-гадовы напарнік — паранены ў галаву. Страляўшыя на джыпе зніклі з месца здарэння, але былі затрыманыя міліцыяй на гарачых слядах. Падазраецца начальнік аддзялення мясцовай памежнай службы. Матэрыялы перададзеныя ў ваенную пракуратуру.

Поўны абзац

◢ Нямецкі трукач і канатаходзец Ёхан Трабер праехаў на аўтамабілі Ford Fiesta 120 метраў па двух тросах, нацягнутых паміж дзвюма мачтамі на вышыні 20 метраў над зямлёй. Ён паставіў новы сусветны рэкорд, які будзе занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса, і стаў «самым хуткім чалавекам у паветры на чатырох колах». Яму ўдалося праехаць па канаце з хуткасцю 37,3 км/гадз. Трабер належыць да адной з самых старых цыркавых дынастый Германіі: сям'я дае прадстаўленні з 1799 года.

◢ У Маскве п'яны міліцыянер спрабаваў захапіць начны клуб. Лейтэнант, якога не пусцілі ва ўстанову з-за моцнага алкагольнага ап'янення, прарваўся праз ахову з траўматычным пісталетам і пачаў пагражаць наведвальнікам. Пасля гэтага ён схапіў хлопца, які стаяў блізка каля яго, і прыставіў пісталет да яго скроні. Нарад міліцыі затрымаў п'янага вартавога парадку. Ад медыцынскага агляду той адмовіўся.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

СУПРАЦОЎНІК КАЛОНІІ... СКРАЎ У АСУДЖАНЫХ СЕЛЯДЦЫ

Ну і ну!

Асуджаны афіцэр унутранай службы — былы начальнік аддзела тылавога забеспячэння папраўчай калоніі Глыбокага, які краў са сховішча агародніны калоніі 480 кілаграмаў свежамарожанага селядца.

Як расказаў «Звяздзе» **Міхаіл САШЧЭКА, пракурор аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па наглядзе за разгляд крымінальных спраў у органах пракуратуры,** вывозілі селядцы са сховішча калоніі сам былы начальнік і яго падначалены. Былы начальнік спадзяваўся, што рэалізуе скрадзенае ў краме праз свайго знаёмага, у якога сваякі маюць дачыненне да гандлю. Ля гаража знаёмага пры выгрузцы селядца падначалены папаўся прадстаўнікам праваахоўных органаў. Потым, калі расследавалі крымінальную справу, высветлілася, што ўсяго ў калонію прывезлі каля 1,5 тоны селядца. Асуджаны вырашыў трохі на гэтым зарабіць. Як мог пайсці на службовае злачынства чалавек, які павінен быць прыкладам у выкананні закона? — цяжка зразумець. Яго падначаленыя праходзіў па крымінальнай справе ў якасці сведкі. Рашэннем суда былы начальнік аддзела пазбаўлены на тры гады права займаць пасады кіраўніка і матэрыяльна-адказнай асобы, ды яшчэ абавязаны заплаціць штраф — 8 мільёнаў 750 тысяч рублёў. Для параўнання: кошт скрадзенай рыбы — меней за 1,5 мільёна рублёў. Таксама была прыменена даволі рэдкая санкцыя — канфіскавалі легкавы аўтамабіль асуджанага «Рэно», на якім перавозілі скрадзены селядзец.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЗЕ ГЭТА ВУЛІЦА, ДЗЕ ГЭТЫ ДОМ?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

У Калюжках вяскоўцы мусілі аплаціць расчыстку дарог са сваёй кішэні

Тамара Васільеўна Ждановіч пражывае са сваім мужам (86-гадовы бацька, інвалід вайны, з 1 лютага знаходзіцца ў шпіталі) у вёсцы Калюжкі Смалявіцкага раёна па адрасе... Зрэшты, заяўніца не змагла назваць вуліцу і дом, паколькі, як прызналася, папросту... не ведае іх. Але гэта ўжо другая частка пытання Тамары Васільеўны, хоць яна і звязаная з першай, галоўнай.

— Тройчы за мінулы тыдзень звярталася да старшыні Жодзінскага сельскага Савета з просьбай расчысціць ад снегу вуліцу, дзе мы жывём: у панядзелак, у сераду і пятніцу. Апошні раз падчас размовы ў пятніцу на маё чарговае пытанне старшыня адказаў таксама пытаннем: а што, няўжо не расчысцілі, — хвалюючыся, распавядала сутнасць справы жанчына. — Дык калі б расчысцілі, ці стала б я зноў турбаваць яго тым пытаннем!? Зразумейце, я гіпертонік, калі што — нават «хуткую дапамогу» не выкліч. Зноў жа — газ у балонах скончыцца, а як новы даставіць? Ніхто ж адрасу не ведае, ды і снегу на вуліцы па калена. У пятніцу якраз ціск падскочыў, сын звярнуўся да сваіх сяброў і тыя даставілі патрэбныя лекі. Карацей кажучы, ні на кога больш не спадзеючыся, у мінулую суботу мы за свае грошы нанялі ў суседняй гаспадарцы трактар, і чалавек за 100 тысяч рублёў расчысціў гэтыя прыкладна 500 метраў ад цэнтральнай вуліцы, дзе снег раней ужо прыбралі, да нашага дома. Цяпер мне па сутнасці нічога не патрэбна, але чаму мы мусілі чысціць дарогу за ўласныя сродкі? Магчыма, такая паслуга і каштавала б нам меней, але той трактар ехаў за шэсць кіламетраў. У той жа час, як ведаю, за сельскім Саветам замацавана тэхніка для расчысткі снегу. І ў многіх месцах дарогу сапраўды расчысцілі, пачынаючы з цэнтральных вуліц. Няўжо за тыдзень тэхніка не здолела дайсці да нашай?

Што ж датычыцца таго моманту, што Тамара Васільеўна не ведае назвы вуліцы і нумара дома, дзе пражывае, тут, паводле яе слоў, сітуацыя наступная. На вуліцы размешчаны новыя дамы, недзе тры месяцы таму насельнікі звярнуліся, каб ёй прысвоілі назву. «Чакайце рашэння выканкама», — такім быў адказ. Вось жыхары і чакаюць.

З гэтымі пытаннямі заяўніцы мы звярнуліся да **старшыні Жодзінскага сельскага Савета Андрэя БАРАЎЦОВА.** Каментуючы па нашай просьбе найперш сітуацыю з расчысткай вуліцы ў Калюжках, Андрэй Мікалаевіч увогуле заўважыў, што на тэрыторыі сельскага Савета знаходзіцца 35 населеных пунктаў, у кожным з якіх, каб забяспечыць праезд, патрэбна расчысціць мінімум па тры вуліцы.

— Зразумела, зрабіць гэта адначасова паўсюдна немагчыма, асабліва калі прыгадаць, якія снегапады абрынуліся больш за тыдзень таму на ўсю краіну. Натуральна, расчыстка ідзе ад цэнтральных вуліц да другасных, паколькі на тэрыторыі сельскага Савета працуе толькі адзін трактар, наняты па афіц

ІДЭОЛАГАМ — ЗНОСІНЫ БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ, ГАЗЕТЧЫКАМ — АНАЛІТЫКА І КРЫТЫКА

Ідэолагі Магілёўскай вобласці скіраваныя на дастойныя зносіны з людзьмі. **Начальнік упраўлення ідэалогіі Магілёўскага аблвыканкама Валерый ІЛЬЯНКОЎ** на выніковай калегіі нагадаў: з людзьмі трэба гутарыць так, як са сваякамі — натуральна і без фармалізму.

Прыкмета часу: выкарыстанне новых інтэрактыўных формаў і інфармацыйных тэхналогій. Інтэрнэт-сайты займелі органы ўлады і рэгіянальныя выданні.

Сярод мноства кірункаў дзейнасці ідэолагі Магілёўскай вобласці галоўным прыярытэтам называюць СМІ. Тым больш гэта важна ў год выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, святкавання 65-годдзя Перамогі і іншых значных падзей у краіне.

— Некаторыя выданні заселі ў мінулым стагоддзі: адны бравурныя справаздачы і нарматыўныя дакументы, — крытыкавалі газеты ідэолагі.

На калегіі журналістаў заклікалі пісаць рэгіянальную аналітыку, каб зацікавіць сваіх чытачоў: сёння супернічаць з радыё і тэлебачаннем у аператыўным інфармаванні людзей друкаваным СМІ не выпадае. Але менавіта аналітычныя артыкулы і справядлівая крытыка, на думку ідэолагаў, дазволяць прыцягнуць людзей да жывога абмеркавання праблем, якія сёння хвалююць грамадства.

Напрыклад, на старонкі газет прапанавана вынесці палеміку па праблеме роднай мовы. Валерый Ільянкоў звярнуў увагу ідэолагаў на пашырэнне ўжытку беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця, у сувязі з выкананнем рэгіянальнага комплексу мераў па прапагандзе роднай мовы на 2010—2012 гады.

Паводле сацыялагічнага апытання ў Магілёўскай вобласці, больш за 60 % апытаных лічаць сябе людзьмі сярэдняга дастатку, а гэта — знак стабільнасці грамадства. Валерый Ільянкоў нагадаў, што якасць жыцця людзей — гэта канчатковая мэта працы і ідэолагаў.

Ілона ІВАНОВА.

НЕ СПРАВІЎСЯ З КІРАВАННЕМ

На аўтадарозе Баранавічы—Ляхавічы жыхар в. Дарава-Чыж не справіўся з кіраваннем і яго аўтамашына «Форд-Эскорт» выехала на паласу сустрэчнага руху і сутыкнулася з «Опель-Астра». У выніку аварыі вадзіцель «Форда» і пасажыр сканалі на месцы, а пасажырку «Опеля» даставілі ў бальніцу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НОЖ З ПРЫЛАЎКА

схапіў у стане алкагольнага ап'янення 27-гадовы гамяльчанін, калі зайшоў у харчовую краму. Сярод белага дня ён пагражаў супрацоўнікам крамы фізічнай расправай і параніў руку сталаму грамадзяніну, які паспрабаваў яго супакоіць. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, дэбашыра затрымала міліцыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

І КІРАЎНІК, І ФУТБАЛІСТ, І НА ЛЫЖКАХ ГУЛЕЦ

Вядомую прымаўку, адаптаваную пад мясцовы каларыт, цяпер можна аднесці не да аднаго чыноўніка органаў дзяржаўнага кіравання, а да тысячы. Менавіта столькі прадстаўнікоў ад вертыкалі ўлады ўзялі ўдзел у спартакіядзе і конкурсе аматарскай творчасці сярод работнікаў выканкамаў і структурных падраздзяленняў Гомельскага аблвыканкама.

Вакальна-інструментальны ансамбль кіраўнікоў Буда-Кашалёўскага раёна.

Спартыўныя спаборніцтвы пачаліся з традыцыйнай лыжні, а потым перайшлі на розныя спартыўныя пляцоўкі Гомеля. У першынстве па більярдзе першым стаў кіраўнік адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Сяргей Краўцоў, а намеснік старшыні аблвыканкама Пётр Кірычэнка — сярод лідараў у стральбе з пнеўматычнага пісталета. Між тым, у спартыўных спаборніцтвах камандныя вынікі не падводзіліся. Вырашана было, што ўсё ж галоўнае — удзел, а не перамога.

Тры дні спецыялісты ў галіне кіравання ў футбол-валейбол-тэніс-шахматы гулялі, па мішэнях стралялі, дроцікі прыцэльна кідалі, а таксама спявалі, у танцы скакалі, вершы чыталі, і нават на лыжках ігралі. Больш за тое, сёлета высветлілася, што і жартаваць могуць добра — зала прыйшла ў захапленне, калі пабачыла «Джэнтельмен-шоу» з Акцябрскага раёна, у якім тон задавалі мясцовыя кіраўнікі. Не менш спадабалася праграма «Зорны дождж у Аўцюках», прывезеная з радзімы беларускага гумару — Калінкавіцкага раёна.

Прынамсі, прыклад кіраўнікі структурных падраздзяленняў падавалі паўсюль. Упершыню за 11 гадоў правядзення мерапрыемства журы адзначыла такую актыўнасць лідараў райвыканкамаў і раёнаў Гомеля — 14 з 25 асабіста былі на сцэне або на спартыўных пляцоўках.

Буда-Кашалёўскі раён стаў пераможцам у намінацыі «Лепшы вакальна-інструментальны ансамбль». Іх мужчынскі калектыў (старшыня райвыканкама Аляксандр Грыгарэнка і яго намеснікі) выканаў песню з рэпертуару Аляксандра Буйнова *(фота)*. Аляксандр Капыткоў, кіраўнік самага паўднёвага раёна Беларусі — Лельчыцкага — прызнаны лепшым спевакам сярод прадстаўнікоў вертыкалі ўлады Гомельскай вобласці.

У мастацкай творчасці намінацый хапіла, каб вызначыць лепшых сярод тэатральна-музычных кампазіцый, салістаў-вакалістаў, дэкламатараў, харавых і харэаграфічных калектываў, вакальных і вакальна-інструментальных ансамбляў... Ну а тым, хто аддае перавагу вышыванню, вязанню або калекцыянаванню, таксама было дзе прадэманстраваць свае ўменні. Між іншым, самай цікавай і незвычайнай прызнана калекцыя фуражак, прывезеная з Мазырскага раёна. «Танец з манекенамі», які прадэманстравалі гледачам прадстаўнікі чыноўніцтва Рагачоўшчыны, вызначыў камандную перамогу гэтага раёна вобласці.

Тры дні спаборніцтваў сталі для кіраўнікоў розных узроўняў Гомельскай вобласці своеасаблівым трэнінгам стасункаў, суперніцтва і, безумоўна, сяброўства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ГОША І ГЕРА ХОЛАДУ НЕ БАЯЦЦА

Афрыканскія страусы па мянушцы Гоша і Гера трэці год з'яўляюцца сталымі насельнікамі гасцінная падворка на 151-м кіламетры Мінск — Віцебск. Цікава, як гэтыя носьбіты афрыканскіх генаў (нягледзячы на тое, што яны інкубатарныя) пераносяць беларускую зіму? Работнік прыдарожнага аўтапаркінга **Уладзімір КАСЦЮКОВІЧ**, падстаўляючы птушкам скрыначку з кармавой сумессю (на фотаздымку), паведаміў, што нават 25-градусныя маразы птушкі перанеслі без праблем. На пачатку зімы, калі маразы былі зусім слабыя, паўднёвыя істоты нават пашчыпвалі траву з-пад снегу, а Гера несла яйкі. Цяпер жа трэба чакаць вясны, каб гурманы маглі пасмакаваць страусавую яешню.

Фота Анатоля Клешчука.

Кінавандроўка

ШТО ПАСЛЯ «МАСАКРЫ» ЗАСТАЛОСЯ?

У Жалудоцкім палацы графа Чацвярцінскага па заканчэнні здымак пабывалі карэспандэнты «Звязды»

НАША ДАВЕДКА:

«Масакра» — першы беларускі фільм жахаў (містычны трылер), што займеў ад рэжысёра-пастаноўшчыка Андрэя Кудзіненкі новы назоў жанру — «бульба-харар». Містычныя падзеі фільма развіваюцца ў XIX стагоддзі падчас паўстання Кастуся Каліноўскага. Бюджэт фільма — 1,78 мільёна долараў. «Масакра» займела папулярнасць яшчэ да пачатку здымак самой карціны.

ЗДЫМКІ першага беларускага фільма жахаў «Масакра», што працягваліся 4 месяцы, да радасці кінаманаў скончыліся яшчэ напрыканцы снежня мінулага года. Але ж усе аздабленні Жалудоцкага палаца, у якім і адбываліся здымкі, яшчэ пэўны час знаходзіліся ўсярэдзіне памяшкання. Што ж хавае гісторыя «Масакры» і што ўбачым на экране? Менавіта гэта мы і вырашылі высветліць...

Да Жалудка мы дабраліся чыгункай, спярша спрабуючы спаць у начным цягніку «Масква—Гродна», а потым услухоўваючыся ў абвесткі машыніста ў электрычцы «Ліда—Гродна»... Нарэшце, мы на чыгуначнай станцыі «Жалудок». Літаральна па калена ў снезе. Як потым нам распавядуць мясцовыя жыхары, пра паўстанак зусім забыліся: падыходы да станцыі не чысцяць... І вось, прайшоўшы, прадзёўбваючы снег, бадай, з кіламетр, мы выйшлі нарэшце на чыстую дарогу — наперадзе ехаў трактар, даючы дарогу такім, як мы. Праз сем кіламетраў снежна-чыстага шляху мы апынуліся ў Жалудку...

Што ёсць для мясцовых жыхароў тамашні палац і леташнія здымкі «Масакры»? Гэта, найперш, сапраўднае свята! Бо гэта быў жывы тэатр, дзе можна было не толькі прасачыць, як працуюць акцёры, як здымаюць фільмы, але і паўдзельнічаць у гэтым працэсе: некалькі жалудчукоў іграли нават не самыя апошнія ролі ў будучым фільме. У дадатак жыхары спадзяюцца, што Жалудок стане беларускай пляцоўкай гістарычнага кіно і ў мястэчка пацягнуцца і іншыя здымацъ сюжэты XIX стагоддзя. Гэта, дарэчы, ужо і цяпер спраўджваецца, бо ў хуткім часе тут маюць пачацца новыя кінапрацы — на гэты раз з удзелам расійскіх пастаноўшчыкаў.

...І вось мы стаім перад велізарнымі драўлянымі зачыненымі дзвярыма: недзе недалёка брэша сабака-вартаўнік, пад нагамі снег, а наперадзе трэшавы выгляд хораўскага памяшкання:

— Замок ёсць ці не? А не, дык палезеце праз акно, — **раіць нам наш праваднік спадар Леанід.** — А-а-а, не пашанцавала! А мо тут ёсць і падземны ўваход...

Праблукаўшы некалькі хвілін вакол палаца, мы вырашылі, што найлепшым варыянтам будзе... увайсці праз парадны ўваход. На шчасце, ланцуг злёгку саскочыў з жалезнай ручкі... Аўтэнтычная кафля і мадэрновая лесвіца, саламяная ў поўны рост фігура жанчыны і сляды крыві на другім паверсе — усё гэта нас яшчэ чакала наперадзе.

— Сюды прыязджала ўнучка графа Чацвярцінскага: яна хацела зрабіць тут дзіцячы інтэрнат — нават грошы выдзяляла пад гэта. Але ж чамусьці ёй адмовілі з гэтым, — **працягвае распавядаць нам спадар Леанід.** — Цяпер жа, хто хоча, можа ўзяць сабе гэты палац за адну мінімалку, але з умовай, што ён давядзе яго да ладу: ну, зробіць капітальны рамонт, будзе мэтанакіравана выкарыстоўваць... Вось, прыязджаў тут адзін ды хацеў увогуле палац набыць ва ўласнасць: зрабіць рэстаран, більярд — але зноўку чамусьці нічога не атрымалася...

Жалудоцкі палац мае не толькі незвычайны для беларускіх палацава-сядзібавых пабудоў вонкавы выгляд, але і арыгінальны ўнутраны, дзе шляхецкая грацыёзнасць сумяшчаецца з гаспадарнасцю, а заблытанае размяшчэнне пакояў рабіла з палаца, як ніякі іншы, падыходны аб'ект для здымак «Масакры».

На першым паверсе акрамя аўтэнтычнай кафлі пад нагамі мы пабачылі яшчэ і саламяную куклу жанчыны (салома, як прызналіся самі стваральнікі першага бульба-хорара, гэта беларускае золата), якая нібы прагульваецца па лесвіцы ўніз і ўверх, а таксама розныя тэхнічныя прыстасаванні, якія выкарыстоўваліся для стварэння адпаведнага духу часу. Напрыклад, адразу стала зразумела, якім чынам з'явілася ляпніна, што абавязкова аздабляла палац у пакоях, дзе праходзілі здымкі фільма. Сакрэт, аказалася, просты: яна робіцца з пенапласту, а затым прыклейваецца да сцяны. Яны, дарэчы, таксама былі зменены: дакладней, пафарбаваныя ў шэры колер. А зверху на нас глядзелі «гаплікі» для дэкаратыўных свяцільнікаў XIX стагоддзя...

МЯСЦОВЫ КРЭАТЫЎ

Як нам стала вядома ад тутэйшых жыхароў, якраз каля палаца Чацвярцінскіх знаходзіцца цудоўная прыватная сажалка з рыбай (найчасцей, карпам). Там вы маеце магчымасць парыбаліць і... заплаціць гаспадару сажалкі за злоўленую рыбу. Гэтае задавальненне вам абыдзецца ў 7 тысяч за кілаграм з магчымасцю выбару пэўнай часткі рыбы, каб набраць на грошах, калі вы злавілі гіганта. Вось такі прадпрымальніцкі крэатыў! Карацей, прыязджайце ў Жалудок — тут і палац з касцёлам, і адпачынак ля возера.

Калі ж мы падняліся на другі паверх па старадаўняй лесвіцы, з жалем заўважылі, што не толькі яна замярзае, пакрыўшыся тоўстым слоем лёду (здаецца, не шмат ёй засталося), але і ўвесь другі і трэці паверхі. Апошні дык увогуле ператварыўся ў змерзлае каралеўства, дзе пад нагамі таўшчэзны слой снегу, ад сценаў пры любым фізічным уздзеянні адколваецца кавалак шпаклёўкі, а са столі ўвогуле не перапыняючыся, падаюць, нібы снег, тонкія і працяглыя кавалачкі змерзлай пары... На другім паверсе быў яшчэ і цікавы чырвоны пакой з саламяным аздабленнем, якое, як нам падалося, служыць абазначэннем месца для карціну і ў фільме, магчыма, будзе свяціцца, як золата, на якое ўпаў прамень ад лучыны.

Ледзь не згубіўшыся ў палацавых катакомбах, мы выходзілі з жалудоцкага палаца Чацвярцінскіх з надзеяй на адраджэнне не толькі самога палаца, але і беларускага кіно — і першы беларускі фільм жахаў, як нам падалося, ёсць добрым сімвалам гэтага!

Мікола ТАМАШЭВІЧ.
Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.

Ведай сваіх!

Вядомы «Партрэт невядомай»

Учора наша краіна, наша грамадскасць адзначала двухсотгоддзе з дня нараджэння Івана Хруцкага, вядомага беларускага мастака, імя якога ўнесена ў піс культурнай спадчыны ЮНЭСКА.

Урачыстасці з нагоды распачаліся ў круглай зале сталічнага паштамта прэзентацыяй і спецыяльным гашэннем паштовага блока, які, па меркаванні дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміра Пракапцова, будзе добрым падарункам беларускім і замежным філатэлістам, паспрыяе прапагандзе нашай багатай культурнай спадчыны. Гэта

Фота Марыны Бегунковай.

Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, начальнік аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Алег СУБОЦІН, дырэктар выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта» Ірына ШЫПІЛАВА, першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Генадзь Дзям'яненка падчас урачыстай прэзентацыі паштовага блока і сам блок «200 гадоў з дня нараджэння І.Ф. Хруцкага».

не выклікае ніякіх сумненняў, бо паштовыя маркі, канверты, прысвечаныя юбілейнай даце з дня нараджэння слыннага мастака, безумоўна ж, разыдуцца па ўсім свеце. Да таго ж для афармлення паштовага блока мастакі Аксана Сузько і Іван Лукін абралі ці не самыя агульнавядомыя, а таму — лёгка пазнавальныя творы Івана Хруцкага: «Партрэт невядомай», «Аўтапартрэт», «Бітая дзічына, агародніна і грыбы»...

Трэба адзначыць, што гэта — далёка не першы сумесны праект Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Нацыянальнага мастацкага музея краіны. Раней у абарачэнне былі выпушчаны паштовыя блокі, прысвечаныя іконе XVI стагоддзя «Багародзіца Адзігітрыя Смаленская», слынным землякам Напалеону Орду, Язэпу Драздовічу, Міхасю Савіцкаму...

Што датычыцца Івана Хруцкага, то, па словах спадара Пракапцова, у дзень 200-годдзя з дня яго нараджэння ў музеі адкрыецца экспазіцыя твораў (яго, а таксама яго праўнучкі Ядзвігі Маціеўскай), прэзентацыя срэбнай манеты з выявай мастака і знакамітым «Партрэтам невядомай». На працягу года плануецца правядзенне міжнароднага пленэру, адкрыццё помніка-бюста, імя Івана Хруцкага будзе прысвоена мастацкай школе ў Полацку, вуліцы ў Мінску, шэраг іншых мерапрыемстваў пройдзе на роднай Віцебшчыне і далёка за межамі. Прынамсі, ёсць дамоўленасць, што работы нашага земляка будуць выстаўлены ў штаб-кватэры ЮНЭСКА і знакамітым Луўры.

Валянціна ДОЎНАР.

Дзяўчынка і печка

Пажар адбыўся 5 лютага ў вёсцы Шамаўшчына Мсціслаўскага раёна. Бацькі пайшлі на працу і пакінулі 9-гадовую дачку адну ў хаце. Яна самастойна паліла печку: адкрыла топку, каб падкласці дроў, нахілілася, і ў твар ёй ударыла полымя. Бедная малая моцна спужалася і пабегла да сваёй бабулі. Адтуль яе забрала брыгада хуткай медыцынскай дапамогі: цяпер дзяўчынка ў бальніцы, у яе апёкі твару 1-2-й ступені.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС, у выніку пажару ў доме знішчана частка маёмасці, сама будыніна моцна не пацярпела. Прычына здарэння — парушэнне правілаў эксплуатацыі печкі.

Ілона ІВАНОВА.

НЕЗАЛІК!

Ставім мы мясцоваму кіраўніцтву за добраўпарадкаванне чыгуначнай станцыі «Жалудок». Не пачышчаныя падыходы да навакольных населеных пунктаў могуць адпудзіць некаторых турыстаў. Прычым здзівіла тое, што на самой станцыі ў нармальным стане стаіць закінуты паўстанак, збудаваны яшчэ за польскімі часамі, а таму ніякіх цяжкасцяў узнавіць ягоную дзейнасць альбо зрабіць там мясцовую краму, на наш погляд, няма.

Падрабязнасці

ПЛЫВЕ РЫБА ДА ПАЛОНКІ

СЁЛЕТА зіма для рыбы выдалася вельмі цяжкай. Працяглыя маразы, тоўсты лёд і занесеныя снегам вадаёмы прывялі да замору.

Але не трэба думаць, што калі пад лёдам задыхаецца рыба, то гэта надзвычайная з'ява. Дастаткова азірнуцца гадоў на 40—50 таму, каб адзначыць, што ў суровыя і снежныя зімы пачыналася самая актыўная рыбалка ў вёсцы.

У тыя часы прасекчы ў вадаёме палонку, паставіць на рэчцы нерат не лічылася браканьерствам. Але прыродзе шкода наносілася, бо ў вузкіх і плыткіх месцах рэчка перагароджвалася матамі з чароту, пучкамі лазы. Рабілася гэта ў час марозу, і нераты правяраліся раз у дзень ці праз суткі. У нас хадзілі па рыбу на Шчару, за два кіламетры. Калі ў нерат ускоквала некалькі шчупакоў, то за рыбу іх не лічылі. І такое здаралася даволі часта. Бывала мароз закуе раку, а праз некалькі дзён адпусціць і на гэтым рыбалка заканчвалася. А вось калі мароз стаяў некалькі тыдняў, а лёд быў пакрыты снегам, то гэта гарантавала ўдачу.

А напярэдадні адлігі рыба пачынала рухацца, ці як казалі, «цыркаць». Першай не вытрымлівала плотка, за ёй ішоў шчупак, а калі тэмпература паветра падымалася да нуля, то ў нерат мог трапіць і рак — рыба ішла касяком. Гэтая дзея працягвалася нейкую гадзіну ці магла расцягнуцца на больш, але калі ў нерат залазіў лінь, то казалі: «Пайшоў лінь — рыбу кінь». Лінь — моцная рыба, але карась, на мой погляд, больш трывалы — у нерат не лез.

Падлеткам, калі зіма спрыяла, я разам з аднавяскоўцамі паліў вогнішча на стажарышчах пры Шчары і разам з іншымі чакаў, калі нехта выгукне з цемры ночы магічныя словы: «Рыба пайшла!» І тады ўсе кідаліся да сваіх нератаў.

Я не з тых, хто наракае на сённяшні дзень і кажа, што некалі лепш было. Чалавеку жылося горш, але рыбы хапала. Кашом можна было налавіць у нейкім ручайку ці лужыне. І ў тыя часы ніхто чапляў не страляў і сеткі ў рыбакоў не забіраў. Таптуха была ў кожным дварэ. Хутчэй за ўсё, карэкціроўку зрабіла меліярацыя. Зніклі шматлікія балотцы і лужынкі, рыбаводства было пастаўлена на прамысловую аснову.

Сёння такая рыбалка ўжо немагчымая, бо ўсе вадаёмы пад кантролем дзяржінспекцыі. І хоць вышэйапісаным (спрадвечным) спосабам рыбу не ловяць, але ж рыба ідзе. Сёлетняй зімой гэты ход прыпаў на 28—29 студзеня, калі пасля працяглых маразоў наступіла адліга.

Напэўна, пра гэта ведалі многія, бо рыбакі (ды і не толькі яны), кінуліся на вадаём «Атлант», які ўтварыўся на месцы торфараспрацовак пад Баранавічамі, і пачалі высякаць і выпілоўваць бензапіламі ў лёдзе палонкі. Вадаём займае каля 500 гектараў, таму развярнуцца народу было дзе.

Рыба шукае кісларод, плыве да палонкі, каб ухапіць паветра. Вось і хапалі яе амаль што рукамі. Калі нехта быў больш спрытным, то ўлоў у яго пацягнуў на дзясяткі кілаграмаў.

Тут да работы і падключылася Слонімская міжрайінспекцыя, бо рыбак можа вылавіць толькі 5 кг рыбы ў суткі. На некалькі дзясяткаў чалавек былі складзены пратаколы.

Палонка з адкрытай вадой — бадай што адзіны спосаб дапамагчы рыбе ў гэты зімовы перыяд. І хоць людзі высякалі тыя палонкі не дзеля выратавання шчупакоў і карпаў, тым не менеш спрыялі насычэнню вады кіслародам.

Вадаёмы са стаячай вадой у такую зіму, як сёлетняя, ператвараюцца ў пастку для рыбы, шанцу на выжыванне ў якой мала. То можа трэба было падысці да справы прадумана: вывесці людзей на вадаём і прабіць некалькі сотняў палонак-аддушын, а за работу няхай бы людзі вылавілі сабе па некалькі кілаграмаў рыбы. Толькі найлепш было б прабіваць палонкі яшчэ марозам, а не чакаць, калі рыба ад задухі будзе сама выскокваць на лёд.

Я папрасіў пракаментаваць сітуацыю з зімовым замарам рыбы **Аляксандра САСНОЎСКАГА, інжынера лясной гаспадаркі (Воранаўскі раён)**, з якім пазнаёміўся праз яго шматлікія публікацыі.

— У заморах нічога надзвычайнага няма. Давайце паглядзім, колькі гадоў іх не было — цяжка ўспомніць, калі так моцна замярзалі вадаёмы. Прырода скідвае празмерную нагрузку, і рыбныя запасы хутка папаўняюцца. Прырода абнаўляецца.

— Аляксандр Васільевіч, але ж не ва ўсіх вадаёмах тае рыбы навалам, і, напэўна, нейкі працэнт трэба было б захаваць. А то застанёмся з карасямі.

— Карась выжывае. З усёй рыбы карась самы хітры, бо ён, можна сказаць, «ачалавечаны» — эвалюцыянаваў побач з чалавекам. У маёй сажалцы карасёў шмат, але калі злавіў пару вялікіх, то больш ніводзін не клюне, а драбната хапае прынаду. Барацьбу з задухай весці вельмі складана. Вось у мяне ўсю зіму працавалі кампрэсары — гналі паветра пад лёд, а ўсе карпы загінулі. Калі паверхня вады вызвалена ад лёду, то для рыбы гэта добра. Але ж у 10—15 градусаў марозу вада хутка зацягваецца лёдам, а стаяць над палонкамі круглыя суткі — няўдзячная справа. Сам я не прымяняў, але ведаю, што ў ваду можна дадаваць перакіс вадароду і тым самым насычаць ваду кіслародам. Але бяда не ў гэтых замерах, якія былі заўсёды, — прырода вызваляецца ад стомы. Магчыма, і нам неабходна пазбаўляцца ад стомленасці — цаніць кожнае імгненне.

А зараз вернемся да вадаёма «Атлант», які не меў гаспадара, бо ў 2007 годзе райвыканкам ануляваў дагавор з паляўніча-рыбалоўнай гаспадаркай. Дырэктар мясцовага аб'яднання Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Алег Гейлаш упэўнены, што на вадаёме замору не было б, калі б ён належаў яго арганізацыі.

Дэпутаты райсавета тут жа адрэагавалі і на пазачарговай сесіі прынялі рашэнне аб перадачы вадаёма таварыству БАПР. І правільна зрабілі — няхай новы гаспадар за ўсё адказвае.

У Баранавічах побач з мікраёнам «Тэкстыльны пасёлак» знаходзіцца возера Жлобінскае. У нядзелю пайшоў паглядзець, якая там сітуацыя. Па перыметры, бліжэй да зараснікаў чароту, пяць рыбакоў гарбаціліся над лункамі. Памераў таўшчыню лёду — 12—15 см. На пытанне, ці задыхнулася рыба на Жлобінскім цяжка адказаць. У параўнанні з торфакар'ерам тут значна большая глыбіня. Калі вяртаўся назад праз чарот, то пад нагамі хлюпала вада, а гэта сведчанне таго, што дзесьці ёсць аддушыны.

А дзе паветра — там жыццё.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

ГІБЕЛЬ РЫБЫ ПАКУЛЬ НЕ ФІКСУЕЦЦА

Як мы ўжо паведамлялі, на большасці рыбалоўных угоддзяў з-за складаных умоў надвор'я ўзнікла пагроза замораў рыбы. Пакуль, на шчасце, яе гібелі не зафіксавана, удакладнілі нашай рэдакцыі ў Мінпрыроды.

Згодна са складзеным графікам, абследавана 213 рыбалоўных угоддзяў агульнай плошчай больш за 13 тысяч гектараў, 3,4 тысячы кіламетраў рэк, узята амаль 400 пробаў вады. Пра кар'ер Руднікі ў Брэсцкай вобласці, кар'ер Разліны ў Гродзенскай, усе рыбалоўныя ўгоддзі Гомельскай вобласці, дзе рыбаловам-аматарам дазволена лавіць рыбу без захавання прамысловай меры і нормы вылаву, мы пісалі. Да гэтага спісу трэба яшчэ дадаць азёры Мёртвае і Туша ў Гродзенскай, раку Палозу і вадасховішча Гарэніцкае ў Мінскай, азёры Крывое, Брошка, Любонічы, Валасовічы ў Магілёўскай абласцях. «Чыстай» пакуль застаецца толькі Віцебская вобласць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

САМ ВЫБРАЎСЯ З-ПАД ЛЁДУ

76-гадовы аматар падлёднай лоўлі ледзь не стаў ахвярай свайго захаплення. У затоцы ракі Прыпяць ён праваліўся пад лёд, пасля чаго змог самастойна выбрацца з вады і паведаміць аб здарэнні па мабільным тэлефоне знаёмаму, які ў сваю чаргу паклікаў на дапамогу выратавальнікаў. Іх сталы мужчына чакаць не стаў. Яго тэлефон не вытрымаў купання ў ледзяной вадзе, на дапамогу мужчына не разлічваў, таму пайшоў у бок вёскі Клінск Калінкавіцкага раёна. Акалічнасці здарэння сталі вядомымі пасля таго, як амаль праз чатыры гадзіны мокрага рыбака знайшлі ў лесе і даставілі да месца жыхарства. Ад шпіталізацыі грамадзянін адмовіўся.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Жыццё і вера

10 КРОКАЎ ДА НЯБЁСАЎ

6 лютага — дзень памяці блажэннай Валянціны Мінскай — самай блізкай да нас па часе святой

Фота Андрэя ІВАНОВА.

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 6 лютага.)

...Калоны машын, аўтобусаў на ўсіх пад'ездах да могілкаў каля вёскі Крысава. Гужам ішлі людзі да магілкі матушкі Валянціны: моладзь, людзі сярэдняга ўзросту, больш сталага веку, старыя, нават з кавенькай, дзеці, маці неслі нават немаўлят. Хто запальваў свечку, хто трымаў абразок са святой ці брашуры пра яе, якія можна было набыць тут жа, хто фотаздымкі родных; нехта ўскладваў на магілку кветкі, нехта ставіў ваду, клаў печыва, каб пасля асвячэння выкарыстаць у ежу. Усе маліліся, прыкладаліся да крыжа на магілцы, абраза са святой, хтосьці разам з царкоўным хорам спяваў песні пра матушку Валянціну, хтосьці плакаў... Слухаючы малебен настаяцеля Станькаўскай царквы свяшчэнніка Аляксандра і чакаючы чаргі, каб прыкласціся да крыжа са сваёй просьбай, я думала, які ж цяжкі лёс напаткаў Валянціну Мінскую.

Выпрабаванні лёсу

Маці Валянціны, Соф'я Пятроўна Чарняўская, дарэчы, сама з сям'і свяшчэнніка, была жанчынай валявой, строгай, якая набожна выхавала не толькі Валянціну, але і яшчэ трох дачок: Ганну, Ксенію і Вольгу. Сям'я была вельмі дружнай.

Атрымаўшы адукацыю ў Мінскім жаночым духоўным вучылішчы, Валянціна ўзяла шлюб з калежскім дарадцам Мінскага Павятовага праўлення Феадорам Васільевічам Сулкоўскім, які, як і жонка, паходзіў са свяшчэнніцкага роду. Але мірнае жыццё маладых працягвалася нядоўга: пачалася Першая сусветная вайна, і Феадор Сулкоўскі ўзяў у ёй удзел у якасці чыноўніка ваеннага ведамства, займаючыся вырашэннем пытанняў, звязаных з тылавым забеспячэннем армій Заходняга фронту. Жыццё ва ўмовах вайны было нялёгкім. Каб неяк звесці канцы з канцамі, Валянціна закончыла ў лютым 1917 года ў Мінску трохмесячныя курсы па перапісцы папер і навучылася рабоце на друкавальных машынках. У жніўні 1917-га яна выехала ў Оршу — верагодна, да мужа, дзе і пражывала да адступлення нямецкіх войскаў з Беларусі. Затым разам з мужам яна вярнулася на сваю малую радзіму. Яе бацька ў той час ужо не быў настаяцелем царквы ў Станькаве, бо моцна хварэў. Толькі зрэдку праводзіў богаслужэнні ў маленькім прыпісным Свята-Анінскім храме ў Косках. Ва ўзросце 69 гадоў 27 снежня 1919 года протаіерэй Феадор Чарняўскі памёр.

Валянціна дапамагала свайму мужу весці гаспадарку. Здавалася, што жыццё пакрысе наладжваецца... Але пачалася калектывізацыя, хваля ганенняў абрушылася на Царкву і яе служыцеляў. У 1931 годзе арыштавалі Феадора Сулкоўскага. У зняволенні апынуліся мужы сясцёр Ганны і Ксеніі — свяшчэннікі. Усе яны пакутніцкі загінулі. Дом у Чарняўскіх адабралі, а сям'я была выселена ў маленькую хатку вартаўніка.

Але Гасподзь не пакінуў Валянціну ў бядзе, паслаўшы добрых людзей, якія сталі дапамагаць ёй і маці. Вялікі клопат праявіў да іх пляменнік Феадора Васільевіча Аляксандр Аляксандравіч Сулкоўскі.

У пачатку 1937 года памерла маці Соф'я Пятроўна Чарняўская, у гэтым жа годзе ўлады арыштавалі і расстралялі апошнюю групу свяшчэннаслужыцеляў Мінскай епархіі. З-за цяжкай хваробы злегла Валянціна. У Коскі прыехала сястра Вольга і папрасіла суседзяў Антона і Ефрасінню Лойкаў дагледаць хворую Валянціну.

Аднак усе цяжкія жыццёвыя абставіны, перажытыя Валянцінай з вялікім душэўным болем, сталі для яе выпрабаваннямі, у якіх яна духэла духам. Паводле слоў святога апостала Паўла, «сила Божия в немощи совершается», і таму цялесную хваробу яна прыняла як заклік Госпада кіравацца апостальскім настаўленнем: «...совершать молитвы, прошения, моления, благодарения за всех человеков...»

Потым настаў перыяд, вельмі неспрыяльны для царкоўнага жыцця, канец 50-х — першая палова 60-х гадоў: ганенні на Царкву. Свой малітоўны подзвіг матушка Валянціна здзяйсняла дзеля сцвярджэння ў веры тых, хто з'яўляўся непасрэдным сведкам і ўдзельнікам супраціўлення Царквы ў яе мужным супрацьстаянні атэістычнай дзяржаве. І ўлады нічога не маглі зрабіць з немачнай жанчынай.

Празорца

38 гадоў праляжала блажэнная Валянціна, малілася за ўсіх людзей, дапамагала жыццёвымі і духоўнымі парадамі, вылечвала. Яна была не толькі пакорлівай малітоўніцай, але і праведнай выкрывальніцай, празорцай. Незадоўга да вайны матушка Валянціна папярэджвала людзей пра бедства, якое набліжаецца. А падчас вайны да яе ішлі жанчыны і прасілі сказаць, ці вернуцца іх родныя з вайны, і Валянціна заўсёды беспамылкова адказвала на іх пытанні, заклікала да пакорлівасці і спадзявання на Бога. Яна дапамагала сваёй малітвай да Госпада толькі тым людзям, якія не проста шукалі цудаў або цялеснага вылячэння, але імкнуліся знайсці ісціну, уступіўшы на шлях пакаяння і выпраўлення свайго жыцця. Выкрывала матушка і людскія заганы. Быў такі выпадак. Дзве жанчыны з суседняй вёскі ішлі да матушкі Валянціны, неслі ёй сала і яйкі, каб потым аддзячыць, але па дарозе вырашылі, што хопіць і яек, і схавалі сала ў жыце. Развітваючыся пасля з гэтымі жанчынамі, матушка сказала: «Ідзіце з Богам і не забудзьцеся забраць тое сала, што ў жыце схавалі». Не пытаючыся, часам, хто за чым прыйшоў, давала адказы на нявыказаныя пытанні і ў асноўным у форме іншасказанняў, якія былі зразумелыя толькі тым, на чыё ўнутранае пытанне яна адказвала. Так, у адной жанчыны спытала, чаму дзіця сваё тая аддала ваўкам. Жанчына пачырванела і выбегла з хаты. Высветлілася, што яна нядаўна зрабіла аборт.

Як успамінаюць сучаснікі, аднавяскоўцы, матушка Валянціна была чалавекам незвычайнай дабрыні і спачування, ніколі нікому ні на што не скардзілася, твар яе заўсёды ззяў усмешкай. Любіла дзяцей (сваіх не было), пляла і раздавала ім тасёмачкі для крыжыкаў. А яшчэ яна рабіла кветкі з паперы, пляла паясы з баваўняных і льняных нітак. Усё гэта шчодра раздавалася людзям, як і ўсё тое, што прыносілі людзі ў знак удзячнасці. Бо яна служыла Госпаду і людзям.

Ланіта ТАРАСЕВІЧ.

«Чаму цябе, Масленка, ды не сем нядзель?»

Так спявалі ў гэтыя дні нашы продкі. Масленіца пачалася! Яна будзе доўжыцца тыдзень, а шкада. Бо хоць гэты тыдзень, згодна з царкоўным календаром, павінен падрыхтоўваць праваслаўны народ да самага строгага і працяглага посту і мае свае абмежаванні — мясныя прадукты ўжо не ядуць, вянчанні не адпраўляюць — але яго надта любілі. Гэты тыдзень называлі таксама Сырны, Крывы, Пусты, Рабы і Развітальны. А яшчэ — Весяльніца. З зімой развітваліся весела і з размахам: каталіся на санках і конях, гушкаліся на арэлях, вадзілі карагоды, спявалі песні, хадзілі ў госці, цягалі «калодку», ладзілі масавыя катанні з горак, кірмашы, паказвалі батлейку. І ўсё гэта было не проста так, а мела магічны сэнс. Напрыклад, на арэлях гушкаліся, каб лён доўгі рос. А звычай цягання «калодкі» быў звязаны з выбарам пары.

Масленіцу можна лічыць адначасова апошнім зімовым і першым вясновым святам. Сімволіка свята звязана з ідэяй вясновага адраджэння, культамі ўрадлівасці, продкаў, сям'і і шлюбу. На Беларусі на Масленічным тыдні асабліва ўшаноўвалі маладажонаў, для іх спявалі магічна-абрадавыя песні з пажаданнем найхутчэйшага нараджэння здаровага дзіцяці. У гэтыя дні імкнуліся абавязкова наведаць сваякоў, асабліва — цешчу, і бабак-павітух.

Звычайна ў вёсцы месленку святкаваць пачыналі ў чацвер, але ў некаторых мясцінах жанчыны збіраліся яшчэ ў панядзелак, прывязвалі да «калодкі» адзін канец папружкі, а другі — да халастога хлопца, які сустрэўся ім, у пакаранне, што ён не ажаніўся за мінулы мясаед (перыяд пасля Калядаў). «Калодку» цягалі па ўсёй вёсцы з абавязковымі захадамі ў хаты, дзе былі сталыя дзяўчаты. Дзяўчаты павінны былі пачаставаць «калодку» і ўсю вясёлую працэсію. Калі хлопец не хацеў цягаць калодку ўвесь дзень, ён мог адкупіцца.

Сёння масленічныя гульні і абрады можна на свае вочы пабачыць і нават паўдзельнічаць у іх на тэрыторыі **Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту**. Там свята адбудзецца **14 лютага а 11-й гадзіне**.

— Традыцыйна ў апошні дзень Масленіцы ладзіцца вялікае вогнішча, якое збірае ўсіх жыхароў вёскі. Прадстаўнікі кожнай сям'і павінны былі прынесці да рытуальнага вогнішча якія-небудзь старыя рэчы, каб знішчыць усе гаротнасці. Бяспрэчна, агні, вакол якіх вадзіліся ў адзначаны дзень карагоды, мелі магічна-ачышчальны характар. Наш музей працягвае гэтую традыцыю і заклікае ўсіх гасцей свята да ўдзелу, — паведамляюць арганізатары свята. — Таксама ў гэты дзень у музеі адбудзецца старажытны абрад знішчэння масленічнай лялькі, якую ў свой час ўвасабляла славянская язычніцкая багіня Марэна. Гэтае рытуальнае дзеянне вядомае шматлікім народам Еўропы. Яно сімвалізавала адраджэнне пладаносных сілаў зямлі, перамогу жыцця над смерцю, выгнанне хваробаў, голаду, нечысці, забеспячэнне бяспекі, дабрабыту ўсёй грамадзе. Сёння ў святочнай культуры сусвету вельмі распаўсюджаны фэсты вогненных скульптур. Сёлета наш музей злучае традыцыі і сучаснасць, трансфармуючы масленічнае пудзіла ў вогненную скульптуру Марэны!

Традыцыі святкавання Масленіцы — адны з нямногіх, што не перараваліся і за савецкімі часамі. Не важна, што называлася гэта часцей «провады зімы», галоўнае, усе весяліліся, спаборнічалі ў лоўкасці і частаваліся блінамі. Так што для многіх сёння гэта яшчэ і магчымасць своеасаблівага вяртання ў дзяцінства і далучэння да ўжо абноўленых традыцый, уласных дзяцей. Дарэчы, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ладзіць конкурс масленічных лялек і запрашае усіх сваіх гасцей прыязджаць з самаробнымі лялькамі.

Знаходзіцца музей недалёка, за чатыры кіламетры ад аўтарынка «Малінаўка», адразу за вёскай Азярцо. Аўтобусы туды ідуць з аўтастанцыі «Паўднёва-Заходняя» з раніцы да вечара.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Крымінал

МАХЛЯР «ЗЛУПІЎ» З КЛІЕНТА $3500

Паабяцаўшы знаёмаму вырашыць за грошы пытанне аб непрыцягненні яго да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне аўто ў стане алкагольнага ап'янення, 21-гадовы прайдзісвет завалодаў буйнай сумай у СКВ.

Паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, зламыснік запатрабаваў за сваю паслугу 3500 долараў ЗША. Грошы ад даверлівага мужчыны ён атрымаў, прычым правёў здзелку з хітрыкамі: долары узяў ля РУУС, у будынак якога некалькі разоў заходзіў, маўляў, вырашаў там пытанне. І заспакоіў — усё «ціп-топ», баяцца няма падстаў. Аднак праз некаторы час гора-кіроўца не толькі быў пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам на 3 гады, але і заплаціў штраф у памеры 700 тысяч рублёў. Зразумела, падмануты чалавек звярнуўся ў міліцыю. Супрацоўнікі апошняй махляра затрымалі, а пры вобыску ў яго было знойдзена 10 тысяч долараў ЗША і 4 тысячы еўра. Праваахоўнікі не выключаюць таго, што хітрун падобным чынам «вырашаў пытанні» неаднаразова. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа.

ВАЛЮТУ СХАВАЎ У НІЖНЯЙ БЯЛІЗНЕ

Праваахоўнікі літаральна па «гарачых слядах» затрымалі кішэнніка, які «працаваў» у метро: злачынцу падвяла яркая куртка, у якой ён выбраўся на «працу».

Гэтае здарэнне, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, адбылося на станцыі «Кастрычніцкая». Да супрацоўнікаў міліцыі звярнулася ўсхваляваная госця сталіцы: невядомы выцягнуў у яе кашалёк з еўра і доларамі (у эквіваленце больш за 1 мільён 300 тысяч рублёў). Пацярпелая таксама распавяла пра падазронага мужчыну, які круціўся ў вагоне побач, на ім была яркая куртка. Апошняя акалічнасць і дапамагла выйсці хутка на след злодзея. У аддзяленні крымінальнага вышку АУС метро вядзецца ўлік кішэнных злодзеяў, якіх затрымлівалі калі-небудзь у падземцы, таму праваахоўнікі адразу здагадаліся пра каго ідзе гаворка. Оперупаўнаважаныя адразу ж выбылі да месца жыхарства магчымага злачынцы і затрымалі яго. Пры вобыску ў падазронага ў ніжняй бялізне былі знойдзены долары і еўра. Ён прызнаўся ва ўчыненым і паказаў месца, дзе выкінуў партманэт. Між іншым, зламыснік не ўпершыню сутыкаецца з законам: для яго гэта будзе ўжо шостая судзімасць.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЫКРАЛІ 870 Л ДЫЗПАЛІВА

Зламыснікі выкралі 870 л дызпаліва з нафтапрадуктапровода «Захад-Транснафтапрадукт», паведамілі БЕЛТА ў праваахоўных органах Беларусі.

Паблізу вёскі Старыя Крукі Міёрскага раёна 4 лютага ў 23.00 супрацоўнікі міліцыі затрымалі 3 аўтамашыны: «Фальксваген», «Опель» і «Аўдзі», якімі кіравалі жыхар Наваполацка 1980 года нараджэння, жыхары г.п. Ветрына Полацкага раёна 1960 і 1961 года нараджэння. Яны перавозілі 870 л дызпаліва, выкрадзенага шляхам урэзкі ў магістральны нафтапрадуктаправод прадпрыемства «Захад-Транснафтапрадукт».

Стыхія

БУДЗЬЦЕ НАПАГАТОВЕ — ЧАКАЮЦЦА ПАВОДКІ

ПРЫРОДНЫЯ катаклізмы, якія назіраюцца ў Беларусі апошнія паўгода, будуць мець свой працяг. Вясна 2010 прыняце з сабою не толькі сонца і цяпло, але і паводкі. Як расказаў «Звяздзе» прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ, на сёння ўжо падрыхтаваны два прагнозы развіцця падзей:

— Адзін — найбольш рэальны. Другі — найгоршы, які можа быць. Да канца лютага прагнозы будуць накладзеныя на картаграфічную аснову. На карце будуць бачныя басейны рэк, з пазначэннем зонаў найбольш верагодных падтапленняў, уключаючы і найгоршы варыянт. Прагноз будзе складзены па вялікай колькасці паказчыкаў — таўшчыня лёду, глыбіня прамярзання грунту, узровень вышыні снегу, утрыманне ў снезе вады... Адсочваем таксама сітуацыю, якая складваецца на тэрыторыі Украіны, бо частка вадазбору ідзе адтуль.

Даючы папярэдні прагноз, Віталь Навіцкі адзначыў, што найбольш верагодныя раёны затаплення — поймы рэк Прыпяці і яе правабярэжных прытокаў. Гэта тэрыторыя Столінскага, Лунінецкага, Жыткавіцкага і Петрыкаўскага раёнаў. У зоне рызыкі — рэкі Днепр і Заходняя Дзвіна.

— Акрамя вясновага разліву рэк, існуе і праблема, характэрная для ўсёй Беларусі, — падтапленне талымі водамі, — дадаў прэс-сакратар МНС. — У краіне вельмі вялікі ўзровень снежнага покрыва, таму практычна ў кожным раёне магчыма падтапленне. Не зусім бяспечным месцам можа стаць Барысаў, некаторыя вуліцы Брэста... Што датычыцца сталіцы, то якіхсьці катастрафічных наступстваў тут не прагназуецца. Усё будзе залежаць ад тэмпературнага рэжыму. Калі днём будзе невялікі плюс, а ўначы невялікі мінус, снег будзе раставаць больш плаўна. Калі ж наадварот, сітуацыя ў значнай ступені ўскладніцца.

— Тое, што паводка будзе, гэта дакладна, — зазначыў намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях у Беларусі Генадзь Ласута. — Будуць прынятыя ўсе неабходныя меры.

Аналізуючы папярэдні вопыт МНС, Віталь Навіцкі ўдакладніў, што падобная сітуацыя ў суверэннай Беларусі назіралася ў 1999-м і 2004 гадах, калі таксама адбываліся разлівы:

— На сёння ўжо зроблены запас медыкаментаў, вызначаныя месцы эвакуацыі людзей, выпрабаваная сістэма апавяшчэння. Папярэдне па інфармацыі Белгідраметцэнтра разводдзе чакаецца ў другой палове сакавіка—пачатку красавіка.

Ілья ЛАПАТО.

МІНСКІЯ КАМУНАЛЬШЧЫКІ АБ'ЯВІЛІ ВАЙНУ ЛЕДЗЯШАМ

У Мінску на гэтым тыдні неабходна актывізаваць расчыстку дахаў ад снегу і наледзі. Такую задачу паставіў **выконваючы абавязкі старшыні Мінгарвыканкама Мікалай ЛАДУЦЬКА** на аператыўнай нарадзе ў мэрыі, перадае карэспандэнт **БЕЛТА**. Паводле ацэнкі Мікалая Ладуцькі, калі ўборка снегу з праезнай часткі і тратуараў на мінулым тыдні была арганізавана даволі рэзультатыўна, то расчыстка дахаў — недастаткова.

Намеснік начальніка аддзела гарадской гаспадаркі гарвыканкама Андрэй МЕЛЬНІКАЎ паведаміў, што для барацьбы з гэтай сезоннай з'явай у Мінску штодзень было задзейнічана больш за 500 рабочых, працавалі 49 аўтавышак.

МЕДЫКІ ЗАКЛАПОЧАНЫЯ: МІНЧАНЕ НЕ ХОЧУЦЬ ПРЫШЧЭПЛІВАЦЦА СУПРАЦЬ «СВІНОГА» ГРЫПУ

«Вакцынацыя пачалася на гэтым тыдні, але прышчапілася пакуль крыху больш за 300 чалавек. Людзі тэлефануюць, цікавяцца, але штосьці іх спыняе», — адзначыла загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірына Глінская.

Для правядзення кампаніі па імунізацыі супраць пандэмічнага грыпу A/H1N1 у сталіцы закупленыя 5 тысяч дозаў інактываванай вакцыны «МонаГрыпал Плюс» (Расія). Кошт прышчэпкі каля 30 тысяч рублёў. «МонаГрыпал Плюс» — гэта апошняе пакаленне грыпозных вакцын, у склад якіх уваходзяць толькі асобныя паверхневыя антыгены віруса. Таму яе ўвядзенне ў арганізм не суправаджаецца ніякімі поствакцынальнымі рэакцыямі, нават у людзей з хранічнай паталогіяй», — удакладніла спецыяліст.

Вакцына рэкамендаваная дзецям пасля 3 гадоў, падлеткам і дарослым. Такое ўзроставае абмежаванне звязана з тым, што вывучэнне эфектыўнасці гэтай вакцыны ў дзяцей узростам да 3 гадоў не праводзілася.

Варта адзначыць, што дзецям ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў для фарміравання засцярогі ад захворвання неабходна двухразовае ўвядзенне вакцыны з інтэрвалам у 21 дзень. Дзецям ва ўзросце 7 гадоў, падлеткам і дарослым дастаткова аднаго ўколу.

УЗРОВЕНЬ ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ НА ВРВІ І ГРЫП У МІНСКУ ЗНІЖАЕЦЦА

Пра гэта паведаміла ўрач-эпідэміёлаг Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ала Дашкевіч.

У панядзелак, 1 лютага, па медыцынскую дапамогу з сімптомамі ВРВІ і грыпу ва ўстановы аховы здароўя звярнуліся 6072 мінчаніны, 2 лютага — 5100, у сераду — 4965, у чацвер — 4504.

Нагадаем, што з 25 па 31 студзеня, штодзень захворвалі каля пяці тысяч гараджан, з 18 па 24 студзеня — у межах 4 тысяч. Таму пра эпідэмію грыпу гаварыць яшчэ рана. Нагадаем, што медыкі аб'яўляюць правядзенне супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў, калі колькасць захварэлых на ВРВІ і грып перавышае парогавы ўзровень (для сталіцы гэта ад 6 тысяч і вышэй) на працягу трох дзён запар.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА,
«Мінск—Навіны».

ПАРТРЭТЫ Ў «ТЭЛЕ»

ДЫК УСЁ-ТКІ КІНО ЦІ МЕДЫЯПРАДУКТ?

Тэлеглядач іх проста глядзіць. А спецыялісты аналізуюць: работы Студыі дакументальнага кіно Галоўнай дырэкцыі тэлевытворчасці Белтэлерадыёкампаніі сталі нагодай для абмеркавання праблем і перспектыў беларускага дакументальнага тэлекіно.

«За тры гады працы студыі асвоены вялікі пласт айчыннай культуры і гісторыі, — сказала **Антаніна КАРПІЛАВА,** загадчыца аддзела экранных мастацтваў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. — Напрыклад, у студыі «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» ёсць свой усталяваны шлях і свой козыр — даследаванне этнічнага архетыпа. Прадукцыя «Белвідэацэнтра» — гэта вялікая культуралагічная панарама са сваімі перлінамі — фільмамі, прысвечанымі экалагічным і духоўным праблемам. А сярод работ Студыі дакументальнага кіно перш за ўсё прыцягваюць увагу творчыя партрэты. Безумоўна ж, хочацца выдзеліць фільмы мэтраў — Надзеі Гаркуновай і Зоі Катовіч, якія ўжо даўно зарэкамендавалі сябе ў дакументальным кіно. Творчыя партрэты такіх лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, як Уладзімір Цеслер у фільме «Партрэт на фоне сябе» (аўтар і рэжысёр Надзея Гаркунова), «Не Гульня ў бісер. Мастак Ганна Балаш» (аўтар і рэжысёр Надзея Гаркунова), Алена Папова — «Тут, цяпер, сёння» (аўтар Вера Савіна, рэжысёр Зоя Катовіч), праўмерна могуць стаць візітнай карткай студыі. Што датычыцца праблем, то яны эстэтычныя і агульныя для сучаснага дакументальнага кіно. Гэта і адрозненне тэлефільма ад тэлеперадачы, выбар паміж кіна- і відэаплёнкай, праблемы рэжысуры, якія ў першую чаргу датычацца маладых рэжысёраў. Увогуле ж для работ студыі характэрна высокая візуальная і гукавая культура».

Прафесар **Анатоль КРАСІНСКІ** адзначае: «Карціна «Партрэт на фоне сябе» зроблена бліскуча, але ёсць адно «але» ў сувязі з гэтым фільмам. Вобраз падаецца з самых першых кадраў, калі галоўны герой, падобны на бамжа, садзіцца ў цудоўную машыну, дзе ўжо сядзіць прыгожая жанчына. Я лічу, што гэта знаходка, калі мы хочам расказаць пра чалавека вобразна. Але той факт, што і ў наступным ён пададзены гледачу не ў лепшым выглядзе... Неабходна ўлічваць, што гаворка ідзе не пра звычайнага чалавека, а пра надзвычай адоранага і таленавітага. Адсюль у мяне ўзнікае пытанне — каму адрасаваны гэты фільм? Магчыма, вузкаму колу спецыялістаў, такіх, як мастацтвазнаўцы, пісьменнікі, мастакі. Але ж тэлевізар глядзяць усе. А калі б перад фільмам падавалася інфармацыя аб тым, што гэта вялікі мастак, то ў гледача з'явілася б магчымасць адчуць усю неардынарнасць гэтай асобы...

Выклікае пытанні фільм, прысвечаны Алесю Адамовічу, — «Адкрыццё» (аўтар сцэнарыя і рэжысёр — Сяргей Агеенка). Пра такую шматгранную асобу нельга расказваць пры дапамозе вырваных з запісных кніжак фраз, звязаных з глабальнымі праблемамі існавання свету. Неабходна ўлічваць: тое, што здавалася глабальным у 60-я гады, сёння — прапісная ісціна, і ўсе крыкі па прычыне таго, што зямны шар загіне з-за ядзернай катастрофы, сёння ўспрымаюцца інакш. «Адкрыццё» зусім не дае ўяўлення аб тым, якім цудоўным і шматбаковым чалавекам быў Адамовіч».

Анатоль Красінскі закрануў складаную праблему пастановачных сцэнаў у дакументальным кіно: «Пастаноўкі існавалі заўсёды і існуюць і сёння, але ўжо зусім у іншай якасці. Калі ў 40—50-я гады аўтары-дакументалісты займаліся інсцэніроўкамі, каб паказаць людзей і рэчаіснасць вакол іх у больш спрыяльным святле, то цяпер сітуацыя іншая — ідзе падмена матэрыялу з дапамогай персанажаў. І адметнае ў гэтым плане рэжысёрскае рашэнне фільма «Прывітанне, мае дарагія...» (аўтар сцэнарыя і рэжысёр Надзея Гаркунова). Хочацца адзначыць, што тут усе інсцэніроўкі вельмі да месца, таму што працуюць на інтанацыю фільма. Гэта карціна пра надзвычай сціплага і добрага чалавека, які заслугоўвае цёплых слоў. Ён хацеў стварыць школу для адораных дзяцей, хоць сам і не з'яўляўся вялікім мастаком. А інсцэніроўкі фільма «Небяспечны талент. Яўгенія Янішчыц» (аўтар сцэнарыя Раіса Баравікова, рэжысёр Андрэй Леўчык) вымушаюць чакаць лепшага. Я лічу, што яны ўвогуле недапушчальныя, калі гаворка ідзе пра чалавечую трагедыю. У цэнтры аповеду — гібель паэткі, прычыны самагубства, а я не ўпэўнены, што дакументаліст-мастаку гэта павінна быць больш цікава, чым сама гераіня. У карціне павінны былі гучаць лепшыя вершы Яўгеніі Янішчыц, а не набор думак».

«Я вылучаю тыя, дзе буйныя і яркія маштабы асобы, дзе мне цікавыя вочы і духоўны свет герояў, — адзначыла **Вольга НЯЧАЙ**, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. — Студыя дакументальнага кіно валодае цэлай партрэтнай галерэяй такіх людзей. Асаблівасць гэтых партрэтаў у тым, што Надзея Гаркунова любіць сваіх герояў, умее з імі зблізіцца, уступіць у кантакт. Мне глядзець на гэта цікава, і я за тое, каб гэта тэма развівалася. Фільмы «Папая» (пра спявачку Цэзарыю Эвару) і «Мама» (пра актрысу Галіну Макараву) можна залічыць у свой залаты фонд. Галоўныя гераіні абодвух фільмаў падобныя нават знешне, яны натуральныя, з глыбокім позіркам, у якім чытаюцца і трагізм, і міласэрнасць, і каханне».

«У работах студыі для мяне каштоўнае тое, што аўтар, акрамя партрэта героя, стварае свой уласны партрэт, — падкрэсліла **Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. — Інтанацыя бязмежнага даверу ўсё цэментуе, а без яе дакументальнае кіно немагчымае. Эмоцыі згладжваюць усе недахопы карціны, выходзяць за рамкі экрана, калі бачыш вочы героя і адчуваеш стаўленне да яго аўтара — цёплае, трапяткое і душэўнае. Радуюць і тэмы, часам правакацыйныя і няёмкія, пытанні, якія адразу ж выклікаюць жаданне пагаджацца або спрачацца. І мне крыўдна, калі пра фільмы гавораць як пра прадукт. Вельмі добра, што, нягледзячы на ўплыў медыяфармацыі, галоўным застаецца чалавек».

Студыя дакументальнага кіно Галоўнай дырэкцыі тэлевытворчасці Белтэлерадыёкампаніі пачала сваю працу восенню 2006 года. Кожны месяц творчы калектыў студыі выносіць на суд гледачоў тэлекампаніі «ЛАД» новы дакументальны фільм. Такім чынам, у актыве студыі на сёння — больш як 30 фільмаў.

Марына БЕЛАВОКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»
проводит 3-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности 12 марта 2010 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
24.	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. К0121819, дв. 866182	г. Витебск, в/часть 52287	1989	215383	12 000 000	1 200 000
25.	Грузовой Урал-4320 ш. 039855, дв. 766168	г. Брест, в/часть 92504	1985	123267	9 000 000	900 000
26.	Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 104544, дв. 308954	г. Ст. Дороги, в/часть 48668	1988	138015	9 000 000	900 000
27.	Грузовой КамАЗ-43105 ш. 010380, дв. 018688	г. Борисов, в/часть 32377	1986	140101	11 000 000	1 100 000

Аукцион состоится в 11.00 12 марта 2010 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж.

Прием документов на участие в аукционе заканчивается **в 17.00 10 марта 2010 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт (копия) и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица – копии юрдокументов и необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **12 марта 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ
Аукцион состоится 12 марта 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лотов	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Алтайская в районе ост. «СШ №13» (огран. – р. Днепр)	0,0022	1 год	размещение объекта розничной торговли	740100000005004359	135 000	12 000
№ 2	улица Сурганова, ост. «Улица Сурганова» (в центр)	0,0017	до 1.01.2011	установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000003005853	103 000	9 000
№ 3	улица Челюскинцев, ост. «Рабочий поселок» (в центр)	0,0010	до 1.01.2011	установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000007004878	59 000	5 000
№ 4	проспект Шмидта, ост. «Проспект Шмидта» (в центр)	0,0009	до 1.01.2011	установка и обслуживание торгового киоска (№ 6) в остановочном павильоне	740100000005004358	94 000	8 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона**, **возместить затраты на организацию и проведение аукциона,** в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма затрат (на всех победителей) составляет 6 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 05.03.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Краіна здароўя

Выпуск № 6 (175)

Фота БЕЛТА.

Спартыўна-масавае свята "Мінская лыжня", якое прайшло 6 лютага на лыжароленай трасе ў мікрараёне Вяснянка, сабрала каля 12 тыс. удзельнікаў.

Прамая лінія

Нетрадыцыйныя «іголкі», масаж, і лазер, і магніт...

Лазер, ультрагук, магніт, іголкаўколванне і г.д. — добра вядомыя кожнаму з нас метады лячэння ўваходзяць, як вядома, у склад рэфлексатэрапіі. Апошняя ж нейкі час з'яўлялася складнікам так званых нетрадыцыйных метадаў лячэння, аднак нядаўна была вылучана ў самастойную катэгорыю. У ліку ж уласна нетрадыцыйных метадаў аказаліся, напрыклад, гірудатэрапія, фітатэрапія, апітэрапія, выкарыстанне прэпаратаў мінеральнага, раслiннага, жывёльнага паходжання і інш. На сёння вядома каля 40 метадаў рэфлексатэрапіі. Не так даўно з'явіліся новыя сучасныя тэхналогіі электрамагнітатэрапіі, шматкаляровай лазерапунктуры, вегетатыўна-рэзананснай тэрапіі, эндагеннай і экзагеннай вегетатыўна-рэзананснай тэрапіі, ультрагукавой тэрапіі, электрапунктуры і г.д.

Прызначыць падобны метад лячэння можа любы вузкі спецыяліст, а рэфлексатэрапеўт выступае ў якасці кансультанта (за выключэннем выпадкаў, калі ён з'яўляецца спецыялістам па профілі захворванняў). Нездарма не ўдакладнены дыягназ лічыцца адным з супрацьпаказанняў да выкарыстання як рэфлексатэрапіі, так і нетрадыцыйных метадаў. У гэтым выпадку нельга кіравацца прынцыпам «не дапамагае медыкаментознае лячэнне, дык, можа, лазерапунктура ўратуе». Эфектыўнасць лячэння дасягаецца пры канкрэтным дыягназе, комплексным падыходзе да лячэння.

Найбольшую эфектыўнасць гэтыя метады дэманструюць пры захворваннях перыферычнай нервовай сістэмы, саматавегетатыўных дысфункцыях і памежных станах, функцыянальных стадыях парушэнняў у рабоце страўнікава-кішачнага тракта, дыхальнай і сардэчна-сасудзістай сістэм і некаторых іншых праблемах. А на пытанні чытачоў на гэты раз адказаў <u>прафесар, доктар медыцынскіх навук, загадчык кафедры рэфлексатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, галоўны спецыяліст па нетрадыцыйных метадах лячэння Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аляксандр СІВАКОЎ</u>.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

☎— Маладзечна, Валянціна Сцяпанаўна. 69 гадоў. Дыягназ — ішэмічная хвароба сэрца, атэрасклераты чны атэрасклероз, атэрасклероз аорты, каранарных і цэрэбральнай артэрый. Парушэнне рытму, мярцальная арытмія. Рытм парушаецца даволі часта. У гэтым месяцы ляжала з гэтай прычыны ў бальніцы. Яшчэ ёсць вузлавы валляк, невялікія вузельчыкі, халецыстыт. Якім чынам, акрамя таблетак, можна лячыць пералічаныя хваробы?

— З улікам вашага ўзросту і вашых дыягназаў магу сказаць, што нетрадыцыйныя метады лячэння маюць адноснае паказанне да прымянення ў такіх выпадках. Асноўнае ваша лячэнне — па тэрапеўтычным і кардыялагічным профілях. Нашы метады могуць выкарыстоўвацца вельмі абмежавана. Разам з асноўным медыкаментозным лячэннем можна выкарыстоўваць хіба толькі лазерапунктуру, але наколькі гэта мэтазгодна, павінен вырашыць спецыяліст — тэрапеўт або кардыёлаг.

☎— Слаўгарадскі раён, Ганна Іванаўна. Муж — яму 65 гадоў — вельмі дрэнна спіць. У Магілёве выявілі паталагічную звілістасць абедзвюх ВСА, кінкінг злева, гемадынамічнае нязначнае атэрасклераты чнае пашкоджанне БЦА, зніжэнне кровазвароту ў абедзвюх аса і ПА. Прызначылі аперацыю — чыстку сонных артэрый. Ці можна палепшыць сітуацыю без аперацыі?

— Нашы метады — нетрадыцыйныя і рэфлексатэрапія — будуць не эфектыўныя ў такім выпадку. Мужу трэба назірацца ў неўролага і нейрахірурга.

☎— Мінская вобласць, Таццяна Пятроўна. 54 гады. У маі перанесла інфаркт, у ліпені — аперацыю на сэрцы. Дыягназ — хранічная рэўматычная хвароба сэрца і мітральна-артальны парок сэрца. Устаноўлены пратэз мітральнага клапана, пластыка іншых клапанаў. Пасля аперацыі на сэрцы ў перыкардзе збіраецца вадкасць. Сярод іншых прэпаратаў прымаю мачагонныя. Урач сказаў, трэба павялічыць іх дозу. Я павялічыла, і абвастрыўся, пэўна, панкрэатыт, адчуваю боль. Ці можа гэта быць звязана? Ці можна прымаць якія-небудзь травы?

— Вы маеце патрэбу ў сур'ёзнай кансультацыі спецыялістаў-кардыёлагаў. Метады рэфлексатэрапіі могуць выкарыстоўвацца тут разам з прынятымі сучаснымі праграмамі рэабілітацыі. Спадзявацца ж на нейкі адзін метад, тым больш на травалячэнне, на жаль, не выпадае. Магчыма, па месцы жыхарства вас накіруюць у рэабілітацыйны цэнтр.

☎— Дзятлаўскі раён, Соф'я Міхайлаўна. 72 гады. Сёлета раптам пачалі балець рукі — косці, мышцы... Рабілі нейкія ўколы, лазер. Але лягчэй не стала. Ноччу боль вельмі моцны. Немагчыма трываць. У які цэнтр у Мінску можна звярнуцца?

— Хутчэй за ўсё, у вас маюць месца сістэмныя працэсы і захворванні апорна-рухальнага апарату. Ваш боль можа быць праявай неўралагічнага захворвання... Вельмі важна ўстанавіць прычыну вашых боляў. Звярніцеся, калі ласка, па кансультацыю да кваліфікаваных спецыялістаў — артапеда-траўматолага, рэўматолага, неўролага, тэрапеўта, якія працуюць, напрыклад, у блізкім да вас санаторыі «Радон». Там урач пракансультуе вас адносна метадаў санаторна-курортнага лячэння.

☎— Гомель, Таццяна Васільеўна. У сына — яму 34 гады — хранічны бранхіт, бранхіяльная астма сярэдняй цяжкасці. Ёсць скрыўленне насавой перагародкі, пастаянны насмарк. Нядаўна пачаў дыхаць з дапамогай інгалятара гармонамі. Ездзіў сёлета ў Крым, міскораўскі санаторый. Але потым паўгода хварэў, з'яўлялася інфекцыя. Як яму можна лячыцца? Чым яму дапамагчы?

— Што да адпачынку і лячэння ў паўднёвых краінах, то сапраўды, у некаторых пацыентаў мае месца пэўная адаптацыя да змены клімату. Тым не менш, у тым санаторыі, які вы ўзгадвалі, прымяняюцца нетрадыцыйныя метады і рэфлексатэрапія. Я парэкамендаваў бы вашаму сыну іголкаўколванне, вельмі эфектыўным можа быць усходні масаж, які расшырае бронхі, спрыяе адыходу макроты, дзейнічае якраз на тыя звёны, якія спрыяюць развіццю захворвання. Вельмі добры тэрапеўтычны эфект дае метад гемамагнітатэрапіі — амагнічванне крыві.

— Як можна трапіць на кансультацыю да вас?

— Калі ласка. 10-я клінічная бальніца г. Мінска, гарадское аддзяленне медыцынскай рэабілітацыі, клінічны цэнтр традыцыйнай в'етнамскай медыцыны. Тэлефон — 340 42 37.

☎— Узда, Аляксандр Васільевіч. 62 гады. Ці існуюць народныя метады лячэння катаракты? Ці можна ў хатніх умовах лячыць грудны і шыйны астэахандроз?

— Пытанне аб выдаленні катаракты, што робіцца, як вядома, хірургічным шляхам, вырашае ўрач-афтальмолаг. Што да астэахандрозу, то спачатку неўролаг павінен устанавіць адпаведны дыягназ, пасля чаго даць рэкамендацыі адносна таго, якім метадам можна лячыць гэтае захворванне — тэрапеўтычным або хірургічным. Важна, на якой стадыі выяўлена хвароба. У любым выпадку лячэнне ў медустановах і лячэнне санаторна-курортнае больш эфектыўнае за хатнюю фізіятэрапію. Сярод метадаў лячэння астэахандрозу — медыкаментозны, фізіялячэнне плюс метад аднаўлення, рэабілітацыі.

☎— Мінск, Людміла Мікалаеўна. 56 гадоў. Як змагацца з прылівамі? Бываюць да 40—50 разоў у суткі. Пакутую ад бяссонніцы... Прымала клімаксан, клімадынон.

— Звярніцеся, калі ласка, з гэтай праблемай у гарадское аддзяленне медыцынскай рэабілітацыі, што на базе мінскай 10-й клінікі. Неабходна будзе спачатку прайсці абследаванне, высветліць узровень гармонаў. Урач прызначыць вам замяшчальную тэрапію і метады фізіяпунктуры.

☎— Нясвіжскі раён, Святлана Міхайлаўна. 62 гады. Моцна шуміць у галаве. Ёсць павышаны ціск. Піла стугерон, ад ціску — эналапрыл, каптапрыл. Чым мне можна дапамагчы?

— Вам можна прымяніць масаж, іголкаўколванне, лазерапунктуру. Спачатку пацікаўцеся, ці робяць гэта ў раённай Нясвіжскай бальніцы.

☎— Пружанскі раён, Іван Міхайлавіч. 77 гадоў. Атрымаў у бальніцы востpую крапіўніцу з-за ўколаў. Як пазбавіцца?

— Крапіўніца — гэта вынік алергічных рэакцый у арганізме хворага. Бываюць выпадкі і непераноснасці медыкаментаў. Пакажыцеся, калі ласка, алерголагу, напрыклад, Брэсцкай абласной бальніцы. Часам пры такіх станах дапамагае іголкаўколванне, лазерапунктура ў комплексе з медыкаментозным лячэннем, якое таксама выконваюць у вобласці.

☎— Баранавіцкі раён, Казленка. Мне 52 гады. Раней былі праблемы з нізкім ціскам, да страты прытомнасці. А цяпер наадварот, калі ціск усяго 150, то я ўжо дрэнна сябе адчуваю. Часцей ён узнімаецца ноччу. Прачынаюся ў 3-4 гадзіны. Як змагацца з гэтай праблемай? Як нармалізаваць ціск?

— З нашых нетрадыцыйных метадаў лячэння вам рэкамендуецца іголкаўколванне, банечны масаж, магнітапунктура. Такія віды дапамогі вам могуць прапанаваць у Баранавічах ці Брэсце. Калі пасля прымянення пералічаных метадаў ціск нармалізуецца, можна будзе параіцца з урачом адносна змяншэння дазіроўкі прэпаратаў.

— А як змагацца з такім захворваннем, як поліартрыт рук?

— Можна прымяніць іголкаўколванне ў спалучэнні з магнітатэрапіяй і водалячэннем — ванны, грязевыя аплікацыі.

— І яшчэ. Пазногці сталі цвёрдымі, дэфармаваліся. Кажуць, гэта грыбок. Можа, вы падкажаце, як ад яго пазбавіцца?

— Спачатку трэба ўстанавіць, ці сапраўды на пазногцях ёсць грыбок. Зрабіць гэта павінен дэрматолаг. Такі спецыяліст ёсць у Баранавічах.

☎— Мінск, Тамара. Нядаўна выдаліла зуб. Як можна пазбавіцца болю і дапамагчы больш хуткаму зажыўленню дзясны? Паласкала карой дуба, але ўсё адно баліць...

— Зняць непрыемныя сімптомы дапаможа іголкаўколванне, электраакупунктура і лазерапунктура. Курс лячэння — 10—12 працэдур. Сапраўды, адных толькі паласканняў настоямі траў бывае недастаткова.

☎— Гомель, Ірына. Якія метады могуць прыпыніць рост фібраміёмы?

— Фібраміёма — адноснае супрацьпаказанне для прымянення метадаў рэфлексатэрапіі. Пытанне пакуль дыскутабельнае. Шэраг гінеколагаў прызначаюць такія працэдуры ў залежнасці ад памеру міёмы. Некаторыя фізіятэрапеўты кажуць, што да 8 тыдняў можна прымяняць электралячэнне. З метадаў рэфлексатэрапіі эфектыўным будзе прымяненне электрамагнітнага выпраменьвання крайневысокай частаты (КВЧ-пунктура).

— Пры бясплоднасці нетрадыцыйныя метады могуць дапамагчы?

— Пры эндакрынна-гарманальных формах могуць выкарыстоўвацца ў комплексе метады аднаўленчага лячэння і рэфлексатэрапіі. Ва ўсіх астатніх выпадках такія метады будуць проста не эфектыўнымі. У любым выпадку неабходна кансультацыя ўролага, сэксапатолага і іншых спецыялістаў.

☎— Мінск, Тэрэза Мікалаеўна. Ва ўнука — павялічаныя адэноіды. Пачалі лячыцца біяцынкам. Яго нібыта можна піць, закапваць у нос...

— А дзе вы ўзялі гэты біяцынк?

— У распаўсюджвальнікаў купілі. Ды за немалыя грошы.

— Я нікому б не раіў набываць і прымяняць прэпараты, якія распаўсюджваюцца такім не афіцыйным чынам. Распаўсюджвальнікі не нясуць за гэта ніякай адказнасці... Наогул да свайго здароўя, і тым больш да здароўя дзіцяці неабходна ставіцца ашчадна. Праверкі паказваюць, што ў шэрагу выпадкаў тое, што напісана на этыкетках так званых «лекавых сродкаў» не адпавядае таму, што знаходзіцца там у сапраўднасці. У лепшым выпадку там будуць рэчывы, якія ўвогуле ніяк не ўздзейнічаюць на арганізм. Што ж да адэноідаў, то вам усё могуць растлумачыць атарыналарынголагі Навукова-практычнага цэнтра, што па вуліцы Сухой у Мінску. Нетрадыцыйныя ж метады лячэння тут тут будуць недастаткова эфектыўнымі.

Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

ХАРЧОВЫЯ ДАБАЎКІ: «ЗА» І «СУПРАЦЬ»

Здароўе на талерцы

Сёння мала каго можна здзівіць смятанай, якая без аніякіх наступстваў для здароўя можа «жыць» у халадзільніку па два-тры тыдні, малако, якое ўвогуле можа захоўвацца доўгі час без халадзільніка, ці пячэнне, якое застаецца свежым і пасля шасці месяцаў захоўвання. Істотна павялічыліся апошнім часам таксама «тэрміны жыцця» хлеба, ёгуртаў, маянэзаў, марожанага, каўбасных вырабаў і многіх іншых прадуктаў харчавання. Вытворцы тлумачаць такое «доўгажыхарства» сучасных прадуктаў выкарыстаннем новых упаковачных матэрыялаў з павышанымі ахоўнымі ўласцівасцямі і ўдасканаленнем тэхналагічных працэсаў. Аднак ёсць яшчэ адна акалічнасць, пра якую згадваюць значна радзей — гэта шырокае выкарыстанне ў харчовай вытворчасці кансервантаў і антыакісляльнікаў (рэчываў, якія павялічваюць тэрміны захоўвання прадуктаў, абараняюць іх ад псавання і акіслення). Як правіла, яны хаваюцца ў маркіроўцы прадуктаў пад літаркамі «Е». Некаторыя з кансервантаў, напрыклад, воцатная ці малочная кіслоты і кухонная соль, прымяняюцца ўжо не адно тысячагоддзе. Аднак найбольш масавае прымяненне кансервантаў, араматызатараў і фарбавальнікаў распачалося ў другой палове XX стагоддзя па меры пашырэння знешняга гандлю, а таксама развіцця рэкламнага рынку. Усё ж рэклама робіць галоўны акцэнт на візуальнае і каляровае ўспрыманне ўбачанага, таму трэба было палепшыць «прэзентабельнасць» рэкламуемых прадуктаў. А як можна зрабіць з варанага мяса «прыгожую» каўбасу без выкарыстання фарбавальнікаў? Ці як атрымаць алей з прыгожым залацістым адценнем і працяглым тэрмінам захоўвання? Ды каб ён яшчэ і не пеніўся на патэльні...

— Харчовыя дабаўкі — гэта прыродныя ці штучныя рэчывы і іх спалучэнні, якія спецыяльна ўводзяцца ў харчовыя прадукты ў працэсе іх вытворчасці і гандлёвага абароту для надання ім пэўных уласцівасцяў і захавання іх якасці, — патлумачыў журналістам падчас «круглага стала», прысвечанага бяспечнасці прымянення харчовых дабавак, **загадчык лабараторыі спектраметрычных даследаванняў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены Віктар ЗАЙЦАЎ**. — Харчовыя дабаўкі могуць уносіцца ў прадукт на любых этапах яго вытворчасці, каб палепшыць ці палегчыць тэхналагічны працэс і павялічыць трываласць прадукту да розных відаў псавання, для захавання структуры і знешняга выгляду прадукту. Акрамя кансервантаў і фарбавальнікаў у харчовай вытворчасці шырока выкарыстоўваюцца таксама рэгулятары кіслотнасці, рыхліцелі, эмульгатары, жэліруючыя агенты, стабілізатары, загушчальнікі, пенаўтваральнікі, спецыяльныя рэчывы для апрацоўкі мукі, рэчывы, якія перашкаджаюць высыханню харчовых прадуктаў, паляпшаюць хлебапякарныя ўласцівасці і іншыя харчовыя дабаўкі. Згодна з прынятай у Еўрасаюзе сістэмай лічбавай класіфікацыі, кожнай харчовай дабаўцы прысвойваецца трох- ці чатырохлічбавы нумар, якому папярэднічае літара «Е» (скарачэнне ад Europe). Гэтыя коды выкарыстоўваюцца ў спалучэнні з назвамі функцыянальных класаў, якія падзяляюць усе харчовыя дабаўкі па іх тэхналагічных функцыях. Скажам, харчовыя дабаўкі Е100—Е182 — гэта фарбавальнікі, Е200-299 — кансерванты, Е300—Е399 — антыакісляльнікі і гэтак далей.

Не сакрэт, што некаторых асабліва ўражлівых пакупнікоў пералічэнне на ўпакоўцы шматлікіх харчовых дабавак элементарна адпужвае. І для іх не мае значэння: натуральныя гэта дабаўкі ці штучныя. Тым больш што мала ёсць дасведчаных у гэтым пытанні людзей.

— Аднак калі вы заходзіце ў хлебны аддзел, а там на паліцах ляжыць толькі чэрствы хлеб, ці вам гэта спадабаецца? — пацікавіўся ў журналістаў із меркаваннем **начальнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Васіль ЦЫГАНКОЎ**. — А калі б у муку ці цеста паклалі харчовыя дабаўкі, што паляпшаюць уласцівасці хлеба, вам бы такі хлеб спадабаўся больш? Пэўны час таму паўсюдна друкаваліся табліцы і артыкулы пра канцэрагенныя дабаўкі, якія быццам бы выкарыстоўваюцца ў вытворчасці прадуктаў. Прычым сярод «канцэрагенаў» згадвалася нават дабаўка Е330. Між іншым, пад гэтай лічбай хаваецца звычайная лімонная кіслата. Аднак гэта поўная бязглуздзіца працягвала тыражавацца з газеты ў газету. Таму я хачу заявіць афіцыйна: усе дабаўкі, дазволеныя для выкарыстання ў харчовай вытворчасці на тэрыторыі нашай краіны, цалкам бяспечныя, і канцэнтрацыі, у якіх яны прымяняюцца, не выклікаюць анкалагічных захворванняў, захворванняў печані, нырак ці нейкіх іншых праблемаў са здароўем.

Дазвол на прымяненне тых ці іншых харчовых дабавак выдаецца спецыялізаванай міжнароднай арганізацыяй — аб'яднаным камітэтам экспертаў FAO/WHO па харчовых дабаўках (Сусветная арганізацыя аховы здароўя і Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН). Камітэт экспертаў вызначае так званую дапушчальную сутачную норму паступлення харчовых дабавак у арганізм чалавека. Гэта норма вызначаецца наступным чынам: бярэцца максімальная колькасць рэчыва, бяспечнага ў эксперыментах на жывёлінах, і змяншаецца ў 100, а зрэдку і ў 500—1000 разоў, і толькі ў такой мінімальнай колькасці дапускаецца да прымянення ў харчовай вытворчасці. Да таго ж пры вырашэнні пытання аб дапушчальнасці прымянення тых ці іншых дабавак улічваецца таксама суміраванае ўздзеянне розных дабавак, верагоднасць рызыкі для здароўя і прагнознае ўздзеянне на арганізм пры іх сістэматычным спажыванні, а таксама інфармацыя аб таксічнасці, канцэрагеннасці і іншых якасцях рэчыва, што прапануецца ў якасці харчовай дабаўкі.

Пры вырашэнні пытання аб дапушчальнасці прымянення тых ці іншых дабавак улічваецца суміраванае ўздзеянне розных дабавак, верагоднасць рызыкі для здароўя і прагнознае ўздзеянне на арганізм пры іх сістэматычным спажыванні, а таксама інфармацыя аб таксічнасці, канцэрагеннасці і іншых якасцях рэчыва, што прапануецца ў якасці харчовай дабаўкі.

КЛАСЫ ХАРЧОВЫХ ДАБАВАК:

Е100-Е182 — фарбавальнікі: узмацняюць ці аднаўляюць натуральны колер прадукту.

Е200-Е299 — кансерванты: павялічваюць тэрмін захоўвання прадуктаў, абараняюць іх ад бактэрый і грыбкоў. У гэты ж клас трапляюць і хімічныя стэрылізуючыя дабаўкі для спынення працэсу саспявання вінаў і дэзынфектанты.

Е300-Е399 — антыакісляльнікі: абараняюць прадукт ад акіслення, напрыклад, каб тлушчы не рабіліся горкімі, і адпаведна ад змянення колеру.

Е400-Е499 — стабілізатары, загушчальнікі: захоўваюць кансістэнцыю, павышаюць вязкасць.

Е500-Е599 — эмульгатары: ствараюць аднароднуюсумесь фазаў, якія дрэнна змешваюцца, напрыклад вады і алею.

Е600-Е699 — узмацняльнікі смаку і водару: узмацняюць смак і водар, якія страчваюцца ў працэсе захоўвання.

Е900-Е999 — пенагасіцелі: перашкаджаюць ці зніжаюць утварэнне пены.

Глазуравальнікі, падсаладжальнікі, разрыхляльнікі, рэгулятары кіслотнасці і іншыя не класіфікаваныя дабаўкі ўваходзяць ва ўсе згаданыя групы, а таксама ў новую групу Е1000.

— Аднак рэкамендацыя спыніць ці абмежаваць яе выкарыстанне. Свае высновы павінны зрабіць тыя незалежныя акрэдытаваныя лабараторыі, — патлумачыў Васіль Цыганкоў. — І ўжо на іх падставе прымаецца канчатковае рашэнне. Калі існуе нават тэарэтычная рызыка, дабаўка выключаецца з пераліку дазволеных. Зразумела, што даць стапрацэнтную гарантыю, што тое ці іншае рэчыва абсалютна бяспечнае для чалавека, ніхто не можа. Да 1938 года ніхто ў свеце не ведаў, што курэнне выклікае рак лёгкіх, наадварот, лічылася, што курэнне дапамагае пры грыпе і некаторых іншых інфекцыйных захворваннях. Аднак навука на месцы не стаіць, тэхналогіі даследаванняў удасканальваюцца, таму не выключана, што могуць з'явіцца новыя навуковыя звесткі. Пакуль што працяглы міжнародны маніторынг не пацвярджае таго, што сукупнае ўздзеянне розных дабавак прыводзіць да непажаданага эфекту. Увогуле пералік дабавак даволі кансерватыўны і абнаўляецца рэдка.

Цікава, што сам Васіль Цыганкоў не вельмі паважае прадукты, якія ўтрымліваюць пяць, шэсць, сем харчовых дабавак.

— Маё асабістае меркаванне як урача — хацелася б зменшыць у адным прадукце колькасць прымяняемых харчовых дабавак. І менавіта на гэта мы арыентуем нашых вытворцаў. Калі тыя ці іншыя ўласцівасці прадукту дасягальныя без прымянення харчовых дабавак, то прыярытэт будзе аддавацца менавіта такой рэцэптуры і тэхналагічным умовам такога прадукту. Усе рэцэптуры праходзяць працэдуру афіцыйнага зацвярджэння, і вытворца самастойна ўжо не можа змяніць у сваім прадукце адну харчовую дабаўку на іншую. У гэтым выпадку яму трэба зацвярджаць ужо новую рэцэптуру. Дарэчы, беларускія вытворцы не выкарыстоўваюць у дзіцячым харчаванні для дзетак першага года жыцця ўвогуле ніякіх харчовых дабавак, акрамя солі. Прымяненне генетычна мадыфікаванай сыравіны забаронена ў прадуктах для дзяцей да трох гадоў. А ўжо з трох гадоў дзіця, як мы пераканаліся, харчуецца з аднаго стала разам з бацькамі. **У любым выпадку на этыкетку ў краме заўсёды карысна глядзець, хоць бы для таго, каб даведацца пра тэрмін прыдатнасці і склад прадукту**, — параіў Васіль Цыганкоў. — А права выбару застаецца за спажыўцом. І пакупнік можа аддаць перавагу, напрыклад, прадукту **з маркіроўкай «Натуральны прадукт»**. Гэты знак дазваляецца змяшчаць толькі на прадукцыі, выраблянай з натуральнай сыравіны жывёльнага, раслiннага або мінеральнага паходжання без прымянення метадаў геннай інжынерыі і штучных харчовых дабавак. Такія прадукты адпавядаюць вельмі жорсткім патрабаванням. І сертыфікат на права маркіроўкі атрымаць даволі складана...

Журналістаў цікавіла таксама, што хаваецца за вызначэннямі «араматызатар, ідэнтычны натуральнаму» і «мадыфікаваны крухмал». Не сакрэт, што многія блытаюць мадыфікаваны крухмал з генетычна мадыфікаванымі прадуктамі. Спецыялісты патлумачылі, што з ГМ- прадуктамі мадыфікаваны крухмал не мае нічога агульнага. Яго мадыфікуюць, а прасцей відазмяняюць, без дапамогі генетыкі. Існуюць розныя фізічныя і хімічныя спосабы апрацоўкі прыроднага крухмалу, дзякуючы якім можна атрымліваць разнавіднасці з зададзенымі ўласцівасцямі. Ёсць крухмал, пазбаўлены паху, рассыпісты, са змененым колерам і гэтак далей. Крухмал могуць дабаўляць да парашкападобных харчовых прадуктаў для папярэджвання ўтварэння там камякоў, у цукровую пудру, дзіцячыя прысыпкі і гэтак далей. Крухмал, які набухае, шырока выкарыстоўваюць пры рыгатаванні соусаў, кетчупаў, маянэзаў, ёгуртаў, пудзінгаў, крэмаў, дэсертаў, паўфабрыкатаў для тортаў і пірожных... Тэрмічна расшчэпленыя крухмалы — дэкстрыны — вядомыя ўжо шмат стагоддзяў, і іх пачалі атрымліваць, калі пра генную інжынерыю ніхто нават не марыў.

Цяпер пра розніцу паміж натуральнымі араматызатарамі, араматызатарамі, ідэнтычнымі натуральным, і штучнымі араматызатарамі. Натуральныя араматызатары ўтрымліваюць толькі натуральныя смакавыя і пахкія рэчывы, напрыклад, эфірны алей. Араматызатары, ідэнтычныя натуральным, атрымліваюць, вобразна кажучы, не на градцы, а ў лабараторыі: араматызатары «суніцы», «персік», «чорныя парэчкі», «абрыкос» складаюцца з тых жа кампанентаў, што і натуральныя ягады і садавіна, толькі атрымліваюць іх метадам хімічнага сінтэзу, цалкам паўтараючы іх хімічную формулу. Выкарыстоўваюцца ў харчовай вытворчасці таксама і штучныя араматызатары — яны могуць утрымліваць адно ці некалькі штучных рэчываў, якія не існуюць у прыродзе. Напрыклад, смак і водар ванілі можа надаваць прадукту не толькі ванілін, але і этылванілін — спалучэнне, не знойдзенае ў прыродзе, а атрыманае хімічнымі метадамі.

Узнікае цалкам заканамернае пытанне, навошта дабаўляць араматызатары, калі можна выкарыстаць натуральныя садавіну і ягады? Сутнасць у тым, што большасць спалучэнняў, якія перадаюць смак і водар натуральнай садавіны і ягад, нестабільныя да ўздзеяння высокіх тэмператур. Таму і выкарыстоўваюцца харчовыя дабаўкі...

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ЗУБАСТЫЯ» МІФЫ

Хто не марыць пра беласнежную ўсмешку? А гэта ж цалкам магчыма. Дастаткова правільна даглядаць зубы і дзясны, раз у паўгода хадзіць на прафілактычны агляд да стаматолага, і тады вы зможаце радаваць сябе і навакольных здаровымі зубамі і прыгожай усмешкай.

Міф 1. Зубы трэба чысціць пасля снедання...

Так, чысціць зубы трэба пасля яды. Але раніцай лепш рабіць гэта двойчы: да снедання (для зняцця налёту, які назбіраўся за ноч і для сябе асабіста — каб адчуць свежасць) і абавязкова пасля снедання — для ачышчэння поласці рота ад рэшткаў ежы.

Міф 2. Пасля яды трэба выкарыстоўваць жавальную гумку...

Можна. Але не больш як 5—10 хвілін. Пасля яды ў роце мяняецца кіслотна-шчолачны баланс, што садзейнічае развіццю карыесу. Баланс можна аднавіць з дапамогай гумкі. Але доўга жаваць не нельга, бо працэс жавання стымулюе выпрацоўку страўнікавага соку. А пакалькі ён не паступае, страўніку даводзіцца «ператраўліваць» самога сябе, ад чаго пакутуе яго слізістая.

Міф 3. Трэба лячыць хворы зуб «да апошняга», перш чым выдаліць яго...

Так. Выдаленне зуба прыводзіць да паступовага зрушэння суседніх зубоў, што адаб'ецца на знешнім выглядзе і можа стварыць сур'ёзныя праблемы з жаваннем. Зрушэнне адбудзецца абавязкова, бо кожны з зубоў зубасківічнай сістэмы нясе сваю функцыю і нагрузку. Таму лепш лячыць зуб «да апошняга». Але, калі выдаленне не пазбегнуць, лепш адразу паставіць імплантат. Дарэчы, выдаленне зуба «мудрасці», у адрозненне ад выдалення іншых зубоў, не пагражае значным скрыўленнем прыкусу, які ўзнікае пры зрушэнні суседніх зубоў на месца выдаленага.

Міф 4. Малочныя зубы лячыць неабавязкова — усё адно выпадуць...

Не. Трэба абавязкова звяртацца менавіта да дзіцячага стаматолага. Малочныя зубы выпадаюць у выніку фізіялагічнага разыходжання іх каранёў. Паміж імі ўвесь гэты час знаходзяцца пастаянныя зубы, якія прарэзваюцца на месцы малочных. Калі не лячыць карыес малочнага зуба, ён можа прывесці да запалення, парушэння тэрмінаў прарэзвання, недаразвіцця эмалі або нават да поўнага расплаўлення зачатка пастаяннага зуба.

Міф 5. Калі зубы не баляць, хадзіць да стаматолага не трэба...

Не. 1—2 разы на год неабходна наведваць стаматолага. Пачатковую стадыю карыесу можа ўбачыць толькі спецыяліст. Акрамя таго, трэба рэгулярна здымаць зубны налёт і зубныя адкладанні (камяні). Апошнія могуць хавацца пад дзясной, і яны больш небяспечныя за наддзясенныя адкладанні.

Міф 6. Здаровая эмаль — белая эмаль...

Не. Абсалютна белых зубоў у прыродзе не бывае. Іх колер залежыць ад дэнціну і перадаецца ў спадчыну. Лічыцца, што самыя моцныя тканкі зуба — тыя, колер якіх жаўтаваты.

Міф 7. Зубы можна адбяліць содай...

Так, але выкарыстоўваць соду можна не часцей як адзін раз на тыдзень, бо яна можа падрапаць эмаль. Іншая рэч — пасты, якія ўтрымліваюць соду бікарбанат. Там часцінкі соды нашмат меншага памеру і не так траўмуюць эмаль. Такімі пастамі можна карыстацца штодзень, але не больш чым месяц, затым трэба зрабіць перапынак.

Міф 8. Для добрай засцярогі і правільнай чысткі пасты трэба шмат.

Няправільна. Расход пасты павінен быць умераным, дастаткова пакрыць галоўку зубной шчоткі. Сутнасць у тым, што фтор вельмі актыўны і ўступае ва ўзаемадзеянне з тканкамі зуба нават у невялікай колькасці. Для прафілактыкі стаматалагічных захворванняў важная зусім не колькасць, а менавіта якасць ачышчэння. Паняцце якаснага ачышчэння ўключае ў сябе правільны механізм ачышчэння і час — не менш як 2—3 хвіліны.

Міф 9. Час ад часу пасту трэба мяняць...

Так. Мікробы поласці рота вельмі хутка прывыкаюць да карысных уласцівасцяў пасты (асабліва калі паста ўтрымлівае антысептыкі — трыклазан, хлоргексідзін) і перастаюць на іх рэагаваць.

Міф 10. Вадкасць для паласкання роту засцерагае ўчасткі, недаступныя для зубной шчоткі.

Не. Паласканне не выдаляе налёт. Бальзамы і апаласквальнікі адносяцца да дадатковых сродкаў гігіены і выкарыстоўваюцца па жаданні. Яны ўтрымліваюць рэчывы, якія перашкаджаюць прымацаванню бактэрый да паверхні зуба. Толькі старанная ручная чыстка, асабліва прамежкаў паміж зубамі і па лініі дзясны, гарантуе працяглую засцярогу.

Міф 11. Чым большая шчотка, тым лепш ёю чысціць зубы...

Маленькай шчоткай лягчэй маніпуляваць у роце. І яна лепш можа ачысціць зубы. Вялікая шчотка не ўсюды можа памясціцца, не кажучы ўжо пра тое, што ёю складана нават паварушыць. Маленькай жа шчотачцы даступныя ўсе паверхні зубоў. Таму лепш набываць шчоткі з невялікімі галоўкамі, якія адпавядаць памеру 1,5—2 зубоў.

Міф 12. Здароўе або хваробы зубоў перадаюцца ў спадчыну, а прафілактыка не мае вырашальнага значэння...

Сапраўды, спадчынны фактар адыгрывае некаторую ролю ў стане зубоў, але, пры захворваннях поласці рота, у прыватнасці, пры карыесе, яго роля вельмі нязначная. Таму ўсё, што звязана з прафілактыкай, можа прадухіліць карыес, незалежна ад спадчыннасці.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Прачытала водгук MADONNы (5 лютага) на артыкул Аляксандра Пятрова «Скажыце дзіцяці «Так» (3 лютага). І вырашыла выказацца з нагоды аднаго толькі пасылу аўтаркі. Пра непажаданых дзяцей. Лічу, што пытанне гэта куды больш складанае і тонкае, чым яго падае апанент Аляксандра Пятрова.

Пра нежаданых дзяцей

Назіральнік

Аборты — увогуле вельмі складаная і драматычная тэма. Да таго ж, непрыемная. Хочацца яшчэ сказаць — вельмі асабістая. У 1991 годзе я, студэнтка трэцяга курса журфака, вырашыла напісаць рэпартаж з абартарыя. Была такая медустанова на вуліцы Стаханаўскай у Мінску. Там штодня з раніцы да абеду рабілі адзін і той жа від «малой медыцынскай аперацыі». Спачатку я проста прыйшла і стала разам з жанчынамі, дзяўчатамі і іх маўклівымі спадарожнікамі ў фае. Фае было перапоўненае, але я не паспела ні прыгледзецца, ні пачуць ціхіх стрыманых размоў. У восем раніцы адчыніліся дзверы ў прыёмны пакой і прагучала патрабаванне здаць медыцынскія дакументы. Я выскачыла на вуліцу, каб зайсці ўсярэдзіну ўжо са службовага ўвахода. Не хацела, каб нехта з тых, у фае, здагадаўся пра сапраўдную мэту майго прыходу.

Урачы сустрэлі добразычліва: «Хочаце напісаць пра аборты? Узгаднілі з Міністэрствам аховы здароўя? Ну што ж, калі ласка, праходзьце, апранайце халат, бахілы...». Урач-мужчына, які аглядаў жанчын у прыёмным пакоі, падчас перапынку паміж пацыенткамі палічыў патрэбным выказацца: «Яны не ад добрага жыцця прыйшлі сюды. У кожнай — свае абставіны. Аборт падобны на вымушаную пасадку самалёта».

А потым я стаяла ў аперацыйнай побач з урачамі. І ўсё бачыла на свае вочы. І чула іх размовы. І мне было страшна шкада... жанчын. Падчас аперацыі яны знаходзіліся пад наркозам, у большасці выпадкаў нічога не адчувалі. Праз 15 хвілін іх будзілі, яны з дапамогай санітаркі падымаліся з крэсла, пераходзілі спачатку на кушэтку побач, а потым у іншы пакой. Босыя, у адноллькавых сарочках, з акрываўленымі пялюшкамі паміж ног.

Асабліва запомніліся дзве. Адна была надзвычай прыгожай, такіх прыгожых, здаецца, я ніколі не бачыла. «20 гадоў, не замужам, першая цяжарнасць...» У маёй галаве ніяк не магло ўмясціцца, як такая прыгожая магла прыйсці на такую жудасную працэдуру. Няўжо той шчасліўчык, ад якога яна зацяжарала, не хацеў ад яе дзіця?

Яна плакала. І напэўна таму, што вельмі баялася, наркоз не адключыў яе цалкам. Падчас аперацыі яна раптам закрычала і стала кідацца, спрабавала ўстаць. Яе трымалі і супакойвалі, а яна крычала, што на яе нясецца статак буйвалаў, і што гэтыя пачвары яе зараз растопчуць. Яна прасіла дапамогі.

Другую я запомніла таму, што яна не павінна была зацяжарыць. «29 гадоў, замужам, ёсць дзіця». Яна засцерагалася, але цяжарнасць наступіла. Чамусьці я запомніла, што ўрачы заўважылі ў яе прыкметы сур'ёзных гарманальных парушэнняў. У яе быў вельмі добры твар. Больш за ўсё ўрачы баяліся, што трапіцца жанчына, якая падманула з тэрмінам. Ультрагукавое даследаванне тады яшчэ не было распаўсюджана. Падманы, напэўна, сустракаліся. Чаму ўрачы іх баяліся? Таму што пасля 12 тыдняў, тлумачылі яны мне, часткі дзіцяці ўжо бачныя: ручкі, ножкі... Значыць урачы, падумала я тады, таксама ахвяры.

Як выглядала тая, у якой не разарвалася плоднае яйка, не памятаю. Быццам бы паўнаватая, невысокая, нічым не прыкметная. Тэрмін у яе быў 6 тыдняў. «33 гады, замужам, ёсць дзіця.» Урач, якая паказвала мне празрыстыя пузырок са скручаным дзіцяткам унутры, сказала, што гэта можна лічыць шанцаваннем, бо захаваць падчас аперацыі плоднае яйка складана. Мяне ўразіла, што ў дзіцяці ўжо былі вочкі і нават пальчыкі на руках. Чамусьці я вырашыла, што гэта быў хлопчык, але дакладна не памятаю, ці было гэта бачна. Урач змясціла эмбрыён у шклянку з вадкасцю і паставіла ў лядоўню, сказала, што перадасць потым у медінстытут для дэманстрацыі студэнтам.

Аперацыі скончыліся, і я прыйшла ў палату да жанчын. Мне трэба было з імі паразмаўляць. Я хацела пачуць ад іх, што яны думаюць пра аборт, пра засцярогу. Памятаю, як адна сказала, што пагадзілася б на стэрылізацыю, але ў яе толькі адно дзіця, і дзе гарантыя, што з ім нішто не здарыцца? Неяк крыўдна стала за другое яе дзіця. Ды і за першае.

І што мяне падштурхнула загаварыць з той адзінай, дзіця якой я бачыла? Напэўна, гэта было бесчалавечна. Яна папрасіла мяне прынесці яго і паказаць ёй. І я паказала. А потым зноў паставіла ў лядоўню.

Некалькі часоў у аперацыйнай зблізілі мяне з урачамі. На развітанне яны сказалі: «Прыходзьце, калі што, мы вас вельмі якасна пачысцім!»

Удзельнік

Праз пяць гадоў я ўсё гэта ўзгадала.

Другому сыну было год і два месяцы. Гэта мала. Ён проста не злазіў з рук. Ні на хвіліну. І калі думка пра тое, што я, магчыма, зноў зацяжарала, упершыню прыйшла ў галаву, мяне ахапіў жах. Жах і пратэст. Я адчувала, што ў мяне няма на гэта ніякіх сілаў. Што я яшчэ не паспела забыць, які цяжкі і вялікі ў мяне быў жывот, што паўтара года ўжо я ніводнай ночы не спала цалкам: з вечара да раніцы... Мне было сябе шкада. Мне не хацелася гэтай цяжарнасці. Яна была НЕПАЖАДАНАЙ.

Нас тады запрасілі знаёмыя на хрэсьбіны, і я з гора маханула кілішак гарэлкі. Што ніколі не рабіла ні да гэтага, ні пасля. Каб упэўніць саму сябе, што не цяжарная. А потым прыйшла дамоў, стала перад люстэркам, адцягнула сукенку перад жыватом і... расплакалася. У доме ў мяне тады яшчэ не было абразоў. Я стала на калені перад акном і стала прасіць Бога, каб ён паслухаў мяне...

Паясніца ныла, і я спадзявалася, што гэта проста затрымка. Што ўсё яшчэ наладзіцца. З малым на руках не проста было выбрацца ў паліклініку.

Тым часам у маёй бабулі здарыўся інсульт. Трэба было тэрмінова ляцець у Расію, бо пасля складанай аперацыі маці нельга было падымаць цяжар, а значыць яна не магла сама даглядаць паралізаваную бабулю.

У аэрапорце я брала ў адну руку свайго малодшага сына, даволі цяжкога, у другую — яшчэ больш цяжкі чамадан. А калі прыехала, то не толькі смела пераварочвала бабулю вагой у сто з лішнім кілаграмаў, гэта было не цяжка, бо я ўмела. Я хапала вёдры з запаранай кашай для парасят і несла адразу абодва. Гэта было вельмі цяжка. А потым я ляжала ў гарачай ванне, пакуль не стала дрэнна з сэрцам.

Нарэшце, здавалася, я дабілася свайго. З палёгкай паведаміла пра гэта мужу, і не стрымала сваёй радасці — расказала маці. Але «нездароўе» маё доўжылася толькі адзін дзень. Маці западозрыла няладнае. Наперадзе былі майскія святы, у паліклініках выхадныя. І маці знайшла ў нейкіх жаночых часопісах рэцэпт абартыўнага адвару. Заварыла мне, і я піла. Праўда, толькі пад яе наглядам. Адна рэч, калі я падманвала сама сябе, «аднаўляючы цыкл» вёдрамі з кашай і гарачай ваннай, другая — абартыўны адвар. Нешта было ў гэтым больш праўдзівае і больш бязлітаснае. Больш цынічнае.

Нарэшце, святы закончыліся і бацька павёз мяне ў раён. Урач паглядзеў і накіраваў на УГД. Там сказалі, што ў мяне ўжо распачаты выкідыш: кроў у поласці маткі, адслаенне плацэнты. Цяжарнасць — 4—6 тыдняў. Усё гэта было напісана на паперцы з заключэннем. І яшчэ там было напісана адно слова, і стаяў адзін знак. Слова было: «сэрцабіццё». А знак: «+».

Гэта вырашыла ўсё.

Урач УГД казала мне, што захоўваць такое дзіця няма сэнсу, што для гэтага трэба класціся ў стацыянар і прымаць шмат лекаў, — наўрад ці дзіця народзіцца потым нармальным. Гінеколаг, прачытаўшы заключэнне УГД, сказаў толькі: прыходзь заўтра з пашпартам і сарочкай.

Вось тады я ўзгадала босых жанчын у абартарыі. І зразумела, што не асуджу сябе на халодную кафлю пад ступнямі і на мокрую пялюшку паміж нагамі. Замест «сэрцабіццё «+».

Разам

Мне ў некаторым сэнсе пашанцавала. Я ж на свае вочы бачыла, як выглядае дзіця ў 6 тыдняў цяжарнасці. Сэрца яго я, вядома ж, уявіць не магла. Яно само было такое маленькае — з трэць майго мезенца. Якім жа павінна быць сэрца? Сэрца майго дзіцяці. Напэўна, вельмі моцным. Цяпер я яшчэ ведаю, што вельмі любячым...

На зваротным шляху мы сустрэлі маю маці. Яна ўсё зразумела. Але доўга яшчэ, доўгіх 6 наступных тыдняў, роўна столькі, колькі можна яшчэ, спрабавала мяне ўгаварыць альбо прымусіць зрабіць аборт. Яна ў мяне вельмі валявая жанчына і ўмее дабівацца свайго. І яна была ўпэўненая, што трэцяе дзіця мне не патрэбна. Так што нам было няпроста. Але цяпер нас было двое. І калі гэта крыха вытрымала так шмат, то няўжо мы разам не вытрымаем усё астатняе?

У бальніцу я не лягла. Не было магчымасці. Бо на руках у мяне былі паралізаваная бабуля, маці пасля аперацыі, маленькі сын. Я, безумоўна, баялася за наступствы сваіх дзеянняў у першыя дні цяжарнасці. Памятала словы ўрача УГД. Але вельмі, вельмі цяпер хацела, каб гэтае дзіця ўтрымалася, каб выкідыш не адбыўся. Каб у гэтай сваёй адчайнай барацьбе за жыццё маленькае смелае сэрца выйшла пераможцам.

Начамі я з дзіцем размаўляла. Часцей за ўсё я казала, паклаўшы руку на жывот: «Трымайся. Усё будзе добра. Нічога не бойся. Я — з табой!»

У тыя дні я ўпершыню ў жыцці памалілася перад абразом. Маці баялася, што бабуля памрэ, і павесіла ў пакоі, дзе тая ляжала, ікону Багародзіцы, вялікую і старую, ад дзядоў. На той час гэта была адзіная для мяне падтрымка. Не ведаючы ніводнай малітвы, сваімі словамі, нягучна, я папрасіла Маці Божую захаваць гэта дзіця ўнутры мяне. І папрасіла Яе папытаць у Бога дараванне за маё нядаўняе маладушша. А потым, калі было асабліва цяжка, час ад часу проста пазірала на абраз. І рабілася лягчэй.

Узнагарода

Я пра тое, што нельга цяжарнасць і дзяцей, ды і дарослых ужо людзей, мераць словамі «жаданыя» і «нежаданыя». Магчыма, гэта добра, калі людзі хочуць зачаць дзіця і ў іх гэта атрымліваецца. Але ў жыцці ўсё не так проста. З усіх маіх траіх, любімых і цудоўных дзяцей, ніводны не быў запланаваны. Мы цяпер смяёмся, калі ўзгадваем абставіны, з-за якіх яны з'явіліся на свет. І дзякуем за іх Богу. За келіхам віна я з задавальненнем расказваю пра гэтыя абставіны і чужым людзям. Тут, на газетнай старонцы, устрымаюся. Няхай дзеткі яшчэ падрастуць. Яны, я ўпэўненая, зразумеюць, і даруюць. Як дараваў мой муж сваёй маці тое, што яна... Апранулася ўжо, сабрала ўсё неабходнае, але мой будучы свёкар прамовіў ёй у спіну: «Не вяртайся тады». Яна заплакала і... не пайшла.

Madonna ставіць знак роўнасці паміж «нежаданы» і «нешчаслівы». Але і з гэтым я не магу пагадзіцца. Адно з аднаго, насуперак моднаму меркаванню сучасных псіхолагаў, зусім неабавязкова выцякае. Шчасце — надта спрэчнае паняцце. І можа я надта самаўпэўненая, але, зноў жа, каб не хадзіць далёка, узгадваю свайго мужа. І сябе, канешне. І кажу, што ўсё гэта глупства. Калі б нейкі псіхолаг унушыў бы маёй будучай свекрыві ў свой час, што нежаданае дзіця не варта нараджаць, бо ўсё роўна будзе нешчаслівае...

Тут такая казуістыка атрымліваецца: жанчына ў выпадку незапланаванай цяжарнасці быццам бы «ахвяруе» сабой — ідзе на непрывабную працэдуру... І сёння ж гэта спрацоўвае!

Калі б гэта спрацавала ў выпадку з маёй будучай свекрывёю, тады б не было не толькі адзінага майго на ўсім свеце каханага чалавека, але не было б нашых дзяцей. Страшна падумаць. Не было б цэлага сусвету — усёй нашай сям'і.

Дарэчы, галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя падчас інтэрв'ю заўважыў, што часцей за ўсё тыя, хто сёння вельмі адказна падыходзіць да планавання цяжарнасці, а такіх усё больш, раней мелі іншых палавых партнёраў. З рознай, я так разумею, ступенню «расплаты» за сваё права на гэта. Так што прыгожае «планаванне» часта проста прыкрывае страх пакарання.

Дарагая Madonna, уся таямніца чалавечага сэрца ў тым, што яно здольнае любіць. Што любоў гэта можа прыйсці не адразу. Нават да ўласнага дзіцяці. Але якраз у выпадку з дзіцем, яна, як правіла, праходзіць. У гэтым і ёсць Божы падарунак. Бо, хто ведае, ці зведалі б мы сваё сэрца інакш. І ў гэтым сэнс усяго.

Цяжарнасць — увогуле складаны стан для жанчыны. Пра гэта яшчэ Дастаеўскі шмат разважаў у сваіх «Дзённіках». Таму я не бяруся судзіць тых, хто спасаваў, як сама калісьці. Проста шкада гэтых жанчын за тое, што ніхто не дапамог ім тады. І нішто.

Вось я падумала, калі і яны — ахвяры, хто ж тады — кат?

...Хачу яшчэ напісаць пра снег. Дачка нарадзілася снежаньскай ноччу. А раніцай мы з жанчынамі ў палаце адчынілі акно. І ў наш пакой улятаў снег. Ён іскрыўся на сонцы нібы трыльёны зорак невыказнай прыгажосці, нібы золата і срэбра, нібы святочны салют у гонар тых, хто мае смеласць і мужнасць, а таксама любоў з'яўляцца на свет і жыць на гэтай грэшнай і цудоўнай зямлі. Мая дачка, ростам 54 сантыметры і вагой 3 кілаграмы 900 грамаў, ляжала побач. Чамусьці смуглявая, з чорнымі валасамі і трошкі раскосымі вачыма. (Пра гэта я потым распытвала свякроў, якая нарадзілася ў паўночным Казахстане, але нічога не высветліла). Дачка спала. А я глядзела на снег і слухала, як маё сэрца смяецца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Рэзананс

Забарона — тупіковы шлях

ПРАБЛЕМА абортаў — праблема глыбінная і датычыцца не адной краіны, а ўсіх, якія адносяцца да эканамічна развітых. Аборты асуджае Ватыкан, супраць і Руская праваслаўная царква, іншыя канфесіі, але ж грамадства да гэтай праблемы ставіцца даволі спакойна.

У немаладым узросце, магчыма, нехта і разважае, што аборт — гэта амаральна. А ў 17—35 гадоў, калі часта сэксуальнасць пераважвае іншыя пачуцці, аборт успрымаецца як самы просты спосаб выйсці з далікатнага становішча. Паглядзім наўкол сябе і ўбачым, што аборты мала каго турбуюць. З аднаго боку — праблема вялікая, а з іншага — яе быццам і няма.

Грамадства на нейкім этапе свайго развіцця пераступіла маральную мяжу і палічыла, што аборт не з'яўляецца забойствам. Калі чалавек не нарадзіўся, то яго і няма. І ўвогуле, жанчына сама павінна прымаць рашэнне...

Аборты супярэчаць Прыродзе. Кожная жывая істота імкнецца даць патомства, а тут чалавек ідзе наперакор Прыродзе. Але ці можна нешта змяніць?

Вяртанне ў мінулае і сцвярджэнне, што некалі нашы продкі дрэнна ставіліся да абортаў і таму іх амаль не было, уводзіць у зман. Абортаў не было, а дзеці паміралі ў небывалым маштабе.

Прыходзіцца паўтарацца. У маёй бабулі па бацьку памерла 8 дзяцей з 12, а ў бабулі па маці з 6 аж 5. Карціна жахлівая і гэта пры тым, што абортаў не рабілі. Бог даў — Бог узяў. Нарадзілі, пахавалі, зачалі... Цынічна, але яшчэ ў першай палове XX стагоддзя сітуацыя была менавіта такой. Выжывалі самыя дужыя — існаваў натуральны адбор.

Але ж чалавецтва не стаяла на месцы, навукова-тэхнічная рэвалюцыя непазнавальна змяніла свет і чалавек апынуўся ў зусім іншых сацыяльна-эканамічных умовах. Падпаў пад сацыяльную эвалюцыю і пачаў сам кантраляваць дзетанараджэнне. Людзі сталі больш адукаванымі, пачалі хоць трохі разбірацца ў сваёй фізіялогіі, а шырокае выкарыстанне супрацьзачаткавых сродкаў спрыяе такому кантролю.

А што датычыцца аборту, то да яго ніхто не імкнецца, але ж калі жанчына «падзаляцела», а муж на аборце настойвае... А ёсць выпадкі, калі без аборту не абысціся.

Пры сваім негатыўным стаўленні да аборту я не спяшаюся кідаць камень у жанчын, якія пайшлі на гэты крок. Хоць бы таму, што і мужчына ў такіх выпадках нясе не меншую адказнасць.

Вунь яшчэ нядаўна ў Кітаі было забаронена мець у сям'і болей за адно дзіця. Урад краіны быў вымушаны пайсці на такі крок — краіна не магла пракарміць празмерную колькасць насельніцтва. У Афрыцы і Азіі ёсць краіны, у якіх дзеці паміраюць у пылу дарог і ніхто на іх не звяртае ўвагі, і якраз там абортаў найменш ці яны ўвогуле забаронены.

Але давайце прааналізуем сітуацыю ў сваёй краіне. Праблема завязана на маральна-этычным стане грамадства. І як мы можам разабрацца з абортамі, калі толькі на Брэстчыне ў наркалагічных дыспансэрах знаходзіцца на ўліку болей за 28 тысяч алкаголікаў, а незарэгістраваных п'яніц у разы болей. У краіне дзясяткі тысяч кінутых дзяцей пры жывых бацьках жывуць у інтэрнатах і дзіцячых дамах, а колькі дзяцей гадуюць дзядулі і бабулі... Без вырашэння гэтых праблем немагчыма падступіцца да праблемы з абортамі.

Што такое аборт для жанчыны, якая адмовілася ад дзіцяці, якое яна адчула?

І размова павінна ісці пра прафілактыку, каб справа да аборту не дайшла.

Забараніць аборты, як гэта ў свой час зрабіў Сталін, — тупіковы шлях. Пасля вайны, калі склалася цяжкая дэмаграфічная сітуацыя — гэты крок быў вымушаны, а ці даў ён эфект? Сказаць, што ў пасляваенны перыяд з'явілася вялікая колькасць шматдзетных сем'яў, нельга.

Забараніць аборты сёння — гэта загнаць іх у падполле. Вельмі хутка нелегальныя аборты стануць бізнэсам. І добра, калі ўрачы зоймуць нішу, а то спецыялістамі адчуюць сябе медсёстры ці звычайныя шаптухі.

Не будзем шукаць ворагаў, якія, нібыта, прынеслі нам усе гэтыя праблемы з-за мяжы. Наша краіна — неад'емная частка еўрапейскай цывілізацыі, і ўсе працэсы, якія адбываюцца там, закранаюць і наша грамадства.

Аборты — гэта кепска, разводы — таксама, а камусьці не падабаецца, што дзяўчаты носяць джынсы. І што тут рабіць? Забараняць? Але ж гэта мы ўжо праходзілі.

Ёсць і даволі цывілізаваныя сродкі, якія даюць магчымасць пазбегнуць абортаў.

Вось нарадзілася ў сям'і трое дзяцей і палову жыллёвага крэдыту дзяржава спісвае, а калі з'явілася пятае, то поўнасцю. Безумоўна, гэта праблемы не вырашае, але ў маладых сем'яў ужо ёсць выбар.

А калі адкінуць эмоцыі, то аборты звязаныя і з непаважлівым стаўленнем да жанчыны, якое закладзена было яшчэ ў біблейскія часы і з сітуацыяй у шматлікіх нашых сем'ях, і з бытавой культурай...

Бянтэжыць у гэтай праблеме і той факт, што супраць абортаў, найперш, выступаюць мужчыны. Дастаткова паглядзець некаторыя тэлешоу, ды і не толькі...

Няхай царква і ўрачы аб'ядноўваюць свае намаганні і супрацоўнічаюць — займаюцца асветніцкай працай па праблеме абортаў. Хто супраць?

Але грамадства патрабуе комплекснага рашэння, і пачынаць трэба з п'янства. Можа, тут аб'яднаемся?

Я чалавек нерэлігійны і для мяне ўсе канфесіі аднолькавыя. Але калі я пабываў у шматдзетных сем'ях (пра некаторыя пісаў), то адзначыў, што тыя сем'і, як правіла, пратэстанцкія. Не ўсё мне там падабалася і не ведаю, у чым там шчасце, але ў гэтых сем'ях няма разводаў, абортаў, п'янства і кінутых дзяцей. Чаму?

Калі ў чалавека ёсць стрыжань і яго жыццё акрэсленае, то многія праблемы адпадаюць.

Я так думаю.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Верш з канверта

Мяцеліца

У белым раздоллі
Вятроў і снягоў
Усхліпваюць болем
Скрыпкі гаёў.

Лятучыя коні
Над кронамі дрэў,
У стылым прадонні
Мяцеліцы гнеў.

І гнеў і жалоба...
Калючая раць
Разгульвае побач,
Павек не разняць.

Змаганне да стомы...
Хутчэй бы ў сяло!
Хутчэй бы дадому!
Туды, дзе цяпло!

Святло і сутонне
Ў мірганні павек.
Ад белай пагоні
Ўцякаў чалавек.

Галіна БАБАРЫКА.
в. Мачуль Брэсцкай вобл.

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» информирует об отмене аукциона, назначенного **на 26 февраля 2010 г. в 10.00.** по продаже имущества ОАО «Витебскмебель».
Телефоны для справок: 8 (0212)435 435, 435 495; 8 (029)591 00 02.

МНОГІЯ НАВАСЁЛЫ НЕ СПЯШАЮЦЦА ПРАПІСВАЦЦА Ў СВАЕ НОВЫЯ КВАТЭРЫ

У Фрунзенскім раёне за апошнія два гады пабудавана каля аднаго мільёна квадратных метраў жылля. За гэты час тут былі здадзеныя ў эксплуатацыю прыкладна 15 тысяч кватэр. У той жа час, як расказаў кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна Барыс Васільеў, колькасць насельніцтва за гэты час прырасла ўсяго на 10 тысяч, г.зн. многія навасёлы не спяшаюцца прапісвацца ў свае новыя кватэры. Усяго ў раёне на сёння пражываюць 373 тысячы чалавек.

Барыс Васільеў адзначыў, што ў Фрунзенскім раёне будуецца 40 % ад агульнага аб'ёму жылля, што ўзводзіцца ў сталіцы. У 2009 годзе будаўнікі здалі 538 тысяч квадратных метраў, план на 2010 год — каля 700 тысяч квадратных метраў.

Па стане на 1 лютага гэтага года ў адміністрацыі раёна зарэгістраваны 50,5 тысячы асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. На 31 снежня 2009 года на ўліку знаходзіліся 49,5 тысячы чалавек.

Аліна ПІШЧЫК, *«Мінск—Навіны».*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АД ЛЯЛЬКІ ПА САКРЭЦЕ

Слухаць, раіцца, дапамагаць

Больш за тры тысячы сацыяльна-значных і асабістых праблем грамадзян было вырашана летась на Гродзеншчыне па выніках Дзён інфармавання насельніцтва. Такую лічбу прывёў намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар Жук на абласным семінары ідэалагічнага актыву ў Ваўкавыску.

Пры гэтым вельмі важна, адзначыў памочнік Прэзідэнта, начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Усевалад Янчэўскі, што ў сваёй працы з людзьмі ідэалагічныя работнікі вобласці абапіраюцца на вынікі сацыялагічных даследаванняў і апытанняў па розных, самых надзённых пытаннях.

Удзельнікі семінара маглі пачарпнуць шмат карыснага з вопыту ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», «Ваўкавыскі мясакамбінат», «Беллакт», у лакаматыўным дэпо Ваўкавыск, аўтобусным парку № 4, у Ваўкавыскіх электрычных сетках, а таксама ў аграрным каледжы, рэдакцыі раённай газеты «Наш час» і ваенна-гістарычным музеі імя П.І. Баграціёна. Акрамя таго, на «заняткі» запрасіла «Школа ідэалагічнага майстэрства» — так называлася абласная выстава. На ёй, дарэчы, былі прадэманстраваныя не толькі метадычныя матэрыялы, навінкі літаратуры і відэатэка, але і ўзоры творчасці ідэалагічных работнікаў Гродзеншчыны. Яны, як высветлілася, спецы не толькі ў працы з людзьмі, але і ў фатаграфіі, жывапісе, вышыўцы, разьбе па дрэве, бісерапляценні...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Кватэрнае пытанне

БЫЛО ЖЫТЛО...

Па радыё прамільгнула інфармацыя аб тым, што з новага года будзе больш спрошчаным парадак пераводу жылых памяшканняў у нежылыя для вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці. У нашай сям'і ёсць свабодная кватэра, атрыманая ў спадчыну. Ці можна яе перавесці ў разрад нежылых?

Марыя Л., *г. Мінск.*

Сапраўды, з 1 студзеня 2010 года ўвайшоў у сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 верасня 2009 г. № 479, якім у мэтах стварэння дадатковых умоў для развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці ўстаноўлена магчымасць пераводу жылых памяшканняў у нежылыя.

Адразу адзначым, што ў шматкватэрных дамах новым парадкам змогуць скарыстацца ўласнікі толькі тых жылых памяшканняў, кватэры якіх размешчаныя на першым паверсе дома.

Раней (да ўваходжання ў сілу Указа № 479) дапускалася практычна толькі адна магчымасць пераводу жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў шматкватэрным доме, у нежылыя — у выпадку прызнання іх не адпаведнымі санітарным і тэхнічным патрабаванням, што прад'яўляюцца да жылых памяшканняў, і непрыдатнымі для пражывання. Пры гэтым канчатковае рашэнне аб пераводзе кожнага канкрэтнага жылога памяшкання ў нежылое прымалася аблвыканкамамі (Мінскім гарвыканкамам).

З 1 студзеня 2010 г. у разрад нежылых у вызначаным парадку могуць быць пераведзеныя і прыдатныя для пражывання аднакватэрны жылы дом альбо жылыя памяшканні ў такім доме, жылыя памяшканні ў блакіраваным жылым доме, жылыя памяшканні, размешчаныя на першым паверсе шматкватэрнага жылога дома. Рашэнне аб такім пераводзе прымаецца гарадскімі (раённымі) выканаўчымі камітэтамі і адміністрацыямі раёнаў у гарадах у 15-дзённы тэрмін з дня падачы ўласнікам заявы (з усімі неабходнымі дакументамі), а ў выпадку запыту выканкамаў дакументаў і (або) звестак ад іншых дзяржаўных органаў, іншых арганізацый — на працягу аднаго месяца.

Найважнейшай асаблівасцю пераводу жылых памяшканняў у нежылыя на першых паверхах шматкватэрных жылых дамоў побач з захаваннем правілаў горадабудаўніцтва, прыродаахоўных, санітарных, супрацьпажарных і іншых патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў з'яўляецца яшчэ і абавязковасць наяўнасці (або магчымасці абсталявання) асобнага доступу да такіх памяшканняў (без выкарыстання дапаможных памяшканняў шматкватэрнага жылога дома). Таму, пры неабходнасці правядзення рэканструкцыі ў памяшканні, якое пераводзіцца ў адпаведнасці з Указам № 479 у нежылое, у рашэнні аб пераводзе жылога памяшкання ў нежылое прадпісваецца правесці такую рэканструкцыю (у тым ліку вынас агульнадамавых сетак вода-, газа-, электра- і цеплазабеспячэння, усталяванне прыстасаванняў індывідуальнага ўліку расходу цеплавой і электрычнай энергіі, вады) у парадку, вызначаным заканадаўствам.

Неабходна таксама мець на ўвазе, што не дапускаецца размяшчэнне ў памяшканнях, пераведзеных у нежылыя, прамысловых вытворчасцяў, а таксама аб'ектаў, якія з'яўляюцца крыніцамі выдзялення шкодных рэчываў, шуму і вібрацыі ў памерах, якія перавышаюць вызначаныя нарматывы, аказваюць негатыўны ўплыў на паказчыкі якасці навакольнага асяроддзя, умовы пражывання ў жылым доме іншых грамадзян і могуць прывесці да распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў.

Віктар САВІЦКІ.

Зварот у карпункт

А Ў НАС У ДВАРЫ...

ВУЛІЦА Герцэна знаходзіцца недалёка ад чыгуначнага вакзала і ад галоўнай плошчы Віцебска.

— Так, цяпер не сезон для катання на каруселях і гульняў дзяцей у пясочніцы. Але, як і зіма, цёплае надвор'е прыходзіць часта «раптам». На дваровай тэрыторыі дома № 24 корпус 2 па вуліцы Герцэна ў Віцебску (побач дом 24 корпус 1) ёсць пясочніца, па перыметры якой чамусьці не драўляныя «элементы», а бетонныя! — абураецца адна з жанчын. — А недалёка карусель, аснова якой чамусьці вышэй за ўзровень зямлі, больш за тое, над ёй ва ўсе бакі выходзяць металічныя канструкцыі. Пагадзіцеся, лёгка можна параніцца дзецям, катаючыся на такіх каруселях. Ужо было некалькі выпадкаў, калі дзеці падалі з каруселі і атрымлівалі траўмы. Ды і ў пясочніцы, калі малы ўпадзе, ён жа можа галавой ударыцца аб бетон. Вось паведамлялі пра тое, што пракуратура правярала стан дзіцячых пляцовак. Вельмі хочацца, каб прыйшлі пракуроры і ў наш двор...

Нельга сказаць, што жыльцы да звароту ў рэдакцыю не спрабавалі самастойна вырашыць вышэйназваную праблему.

— Грамадзяне, дзеці якіх гуляюць у двары, звярталіся ў жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак № 11, які абслугоўвае тэрыторыю нашага мікрараёна. Там растлумачылі, што не яны рабілі пясочніцу і ўсталёвалі карусель, — расказвае яшчэ адна тутэйшая жыхарка. — А зварот да забудоўшчыка скончыўся канстатацыяй таго, што тую ж пясочніцу зрабілі згодна з праектам.

Жыхары вуліцы Герцэна паскардзіліся і на транспартную праблему. Паводле іх слоў, калі раней з вуліцы Герцэна ў бок вельмі папулярнага сярод гараджан і гасцей горада гандлёвага цэнтра «Эвікам» (на вуліцы Церашковай) хадзіла маршрутка, то зараз такія рэйсы не ажыццяўляюцца. Без цяжкасцяў яны не могуць таксама даехаць і на праспект Фрунзэ, вуліцу Лазо.

Погляд на праблемы з гарвыканкама

Па каментарый праблемных пытанняў карэспандэнт «Звязды» звярнуўся ў Віцебскі гарвыканкам.

У афіцыйным адказе з аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарвыканкама паведамляецца, што (далей цытата ў перакладзе з рускай мовы): «Дваровая тэрыторыя жылога дома № 24 корпус 2 па вуліцы Герцэна належыць таварыству ўласнікаў «Новабудоўля» і знаходзіцца на іх поўным абслугоўванні.

Малыя архітэктурныя формы на дваровай тэрыторыі (пясочніцы, каруселі і г.д.) пабудаваны згодна з праектам на сродкі забудоўшчыкаў, таму знаходзяцца ў распараджэнні таварыства.

Улічваючы зварот грамадзян, ЖЭУ-11 накіраваны ліст старшыні таварыства ўласнікаў «Новабудоўля» з мэтай разглядзець пытанне аб бяспечнай эксплуатацыі малых архітэктурных формаў, размешчаных на дзіцячай пляцоўцы.

Віцебскім гарвыканкамам зацверджана маршрутная сетка гарадскога пасажырскага транспарту, дзе прадугледжаны рух мікраўтобусаў і па вуліцы Герцэна...

Віцебскі гарвыканкам пастаянна прапаноўвае патэнцыйным перавозчыкам свабодныя графікі маршрутаў №№ 40 — Т, 41 — Т, 87 — Т, інфармацыя аб якіх размешчана на афіцыйным інтэрнэт-сайце гарвыканкама»...

Пракуратура разбярэцца

Аўтар гэтых радкоў насамрэч пісаў летась пра пракурорскія праверкі дзіцячых пляцовак. Вялікі рэзананс выклікалі артыкулы і ў мясцовых СМІ. Вышэйназваны двор, па словах бацькоў дзяцей, не правяралі. Каб «выканаць мары» незадаволеных грамадзян, цяпер як прадстаўнік «Звязды» падрыхтаваў і адправіў у пракуратуру раёна ліст з просьбай разабрацца і пракантраляваць, як будзе разглядацца пытанне (зноў словы з цытаты): «аб бяспечнай эксплуатацыі малых архітэктурных формаў». Няўжо той жа старшыня таварыства раней не мог унікнуць у праблему? Дарэчы, дом 24 корпус 1 па Герцэна, дзеці з якога таксама гуляюць на дзіцячай пляцоўцы, цяпер, у адрозненне ад суседняга дома, ужо не таварыства ўласнікаў (так мне растлумачылі жыльцы), ён абслугоўваецца жыллёва-эксплуатацыйным участкам. Мо і суседняму дому (корпус 2) перайсці пад апеку ўпраўлення, каб праблемы таго ж двара вырашаліся хутчэй? Вырашаць, вядома ж, гэта ўласнікам. А мо не зразумеў нешта старшыня?

Наконт таго, што, як адзначылі ў Віцебскім гарвыканкаме, пастаянна прапаноўваюцца свабодныя графікі маршрутаў патэнцыйным перавозчыкам, хочацца задаць некалькі пытанняў. Мо дрэнна прапаноўваюцца? Насамрэч без перасадак не дабрацца з Герцэна ў многія куткі горада. А тыя маршруткі, якія ўсё-такі ходзяць, магу адзначыць (асабіста праверыў), вельмі рэдка ездуць па Герцэна.

Чаму ў тым жа афіцыйным адказе не гаворыцца нічога пра магчымасць хоць бы ў перспектыве арганізаваць перавозку пасажыраў дзяржаўным перавозчыкам — аўтобусамі? Няма каманды зверху, з аблвыканкама? Так шмат мясцовых СМІ пішуць пра перспектывы развіцця новых сучасных мікрараёнаў Віцебска з фарміраваннем добрага руху перавозкі пасажыраў. А ў іншых месцах горада? Разумею, калі жыхары кожнай вуліцы будуць патрабаваць, каб дзяржаўны транспарт часцей да іх прыязджаў, або каб арганізавалі новыя маршруты, грошай не хопіць, каб набыць аўтобусы, давядзецца часта мяняць сетку руху. Але неяк жа трэба ўлічваць грамадскую думку. І яшчэ можна падлічыць магчымую карысць. Тая ж вуліца Герцэна і тыя, што за ёй, калі ўсё

ВОСЬ ЯНА ЯКАЯ, «УКРАІНІЗАЦЫЯ»

ЗГОДНА з папярэднімі звесткамі Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) Украіны, Віктар Янукovіч апярэджвае Юлію Цімашэнку ў другім туры з невялікім адрывам 2,91 %. Пасля апрацоўкі 98,84 % пратаколаў лідар Партыі рэгіёнаў набіраў 48,66 % галасоў, прэм'ер-міністр — 45,75 %. Сёння раніцай стануць вядомыя ўдакладненыя папярэднія вынікі галасавання, канчатковыя — 17 лютага.

Нагадаем, у першым туры пераможцам стаў Янукovіч, які атрымаў 35,32 % галасоў, другі вынік быў у Цімашэнкі — 25,05 %. Яўка выбаршчыкаў склала 66,76 %.

Амаль тры працэнты не хапае, каб для таго у такой краіне, як Украіна, святкаваць перамогу ў прэзідэнцкай кампаніі. Вось хоць бы на 6—8 %, тады можна было б быць упэўненым у заўтрашнім дні. Хоць для перамогі ў другім туры трэба было атрымаць элементарную большасць галасоў.

Другі тур прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне зрабіў важкі ўнёсак у пашырэнне і паглыбленне паняцця «ўкраінізацыя» палітычнага жыцця краіны. Гэты тэрмін з адмоўным адценнем, калі не памыляюся, увялі расійскія палітолагі. Нядаўна і прэм'ер-міністр Уладзімір Пуцін выкарыстаў яго ў негатыўным сэнсе, калі пахваліў сённяшнюю расійскую ўладу за тое, што яна не дапусціла «ўкраінізацыі» палітычнага жыцця грамадства. Дык якая ж яна, «украінізацыя», ва Украіне?

За ходам прэзідэнцкай кампаніі ў гэтай краіне вельмі многія сачылі як за своеасаблівым цікавым палітычным рэаліці-шоу ў рэжыме онлайн. І сапраўды, падзеі ў ім часам разгортваліся ў адпаведнасці з законамі прыгодніцкага жанру. І было што пачуць і на што паглядзець. Гнеўныя выступленні кандыдатаў, нестандартныя для выбараў такога кшталту дэмаршы іх прыхільнікаў і праціўнікаў, мудрагелістыя піяр-кампаніі пастаянна трымалі электарат у напружанні — а што далей? Нездарма сотні журналістаў асвятлялі перыпетыі барацьбы камандаў кандыдатаў, якія хто з песнямі, а хто набажэнствам завяршалі сваю публічную падрыхтоўку да выбараў. Яна была багатая на маляўнічыя сюжэты і скандальныя эксцэсы, экстравагантныя дзеянні кандыдатаў, на яркія прамовы і ваяўнічыя заявы. Каб верылі выбаршчыкі, ведалі і баяліся нядобразычліўцы з варожага лагера. Праўда, трохі сапсавала сюжэтную лінію палітычнага шоу адмова Януковіча ад удзелу ў дэбатах у прамым тэлеэфіры з Цімашэнкай. Гэта пазбавіла мільёны тэлегледачоў атрымаць асалоду ад палемічнага майстэрства Юліі Уладзіміраўны, але ў астатнім сумна не было.

Кульмінацыяй гэтага, шчыра скажам, неадназначнага працэсу «ўкраінізацыі» стаў дзень галасавання — 7 лютага. Яго чакалі ў краіне з трывогай па шматлікіх прычынах. Шмат было разважанняў, плётак і чутак наконт пагрозы зрыву выбараў. Агучваліся розныя варыянты: ад захопу выбарчых участкаў да масавых майданаў па ўсёй краіне, магчымага паўтору «памяранцавай рэвалюцыі». Масла ў агонь падліла Цімашэнка, якая напярэдадні дня цішыні на выпадак фальсіфікацый і несумленнага падліку галасоў публічна ўсіх строга папярэдзіла: «Я звярнуся да народа Украіны проста паўстаць». Дзе тут расслабляцца дзейнай уладзе. Кандыдаты могуць ненаўмысна ў пошуку справядлівасці справакаваць палітычны крызіс.

Таму Юшчанка, які выдатна ведае характар тэмпераментнай і здольнай на сюрпрызы былой паплечніцы і рашучасць лідара рэгіяналаў змагацца да канца, вырашыў загадзя не дапусціць спробаў кандыдатаў паўплываць на работу Цэнтральнай выбарчай камісіі. Каб тыя ў азарце барацьбы не адважыліся на радыкальныя дзеянні, прэзідэнт выдаў загад аб узмоцненай ахове вялікімі сіламі міністэрства ўнутраных спраў па знешнім перыметры будынка ЦВК, а Дзяржаўнай службе аховы — узмацніць прапускную сістэму ў будынак ЦВК. Прэзідэнт таксама даручыў Службе бяспекі Украіны і Дзяржаўнай службе спецыяльнай сувязі і абароны інфармацыі ўзмацніць абарону дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў. Напрыклад, на ўсялякі выпадак зрабіць немагчымым з'яўленне так званых транзітных серверaў або скажэнне паведамленняў ад

Фота БЕЛТА.

акруговых камісій у ЦВК. Па словах прэзідэнта, прынятыя меры павінны былі забяспечыць у краіне законнасць і правапарадак у час выбараў і тым самым пазбегнуць вялікага грамадскага супрацьстаяння.

Гэтыя меры перасцярогі аказаліся не лішнімі. Учора раніцай каля будынка ЦВК тысячы прыхільнікаў Януковіча пачалі мітынг у падтрымку свайго кандыдата, дзе якраз ішоў падлік галасоў. Яны патрабавалі абараніць «выбар народа і абараніць перамогу Януковіча». Дарэчы, мітынгавалі пад гучнымі і сакавітымі лозунгамі, напрыклад, «Фальсіфікатары, вучыце Крымінальны кодэкс», «Юля, годзе істэрык!» Апошні лозунг датычыцца нервовай рэакцыі Цімашэнкі на нечаканыя змены ў выбарчым заканадаўстве за некалькі дзён да галасавання. Такі падыход справакаваў шторм эмоцый у парламенце, даў падставу незадаволеным дэпутатам Блока Цімашэнкі ўзняць гвалт на ўсю краіну аб маючых адбыцца масавых фальсіфікацыях з галасамі выбаршчыкаў.

І сёння яе прыхільнікі паўсюдна паўтараюць аб фальсіфікацыях. На думку многіх палітолагаў, гэта рыторыка мае на мэце выклікаць не толькі сумненні ў чысціні перамогі Януковіча. А калі той усё ж пераможа, то потым на больш выгадных умовах весці з ім палітычны гандаль. І Януковіч можа, вядома, у інтарэсах краіны, пайсці на супрацоўніцтва з Цімашэнкай, бо яе Блок мае ўнушальную палітычную вагу ў краіне. Яна па-ранейшаму прэм'ер-міністр, якая з сыходам Ющчанкі не складзе аўтаматычна свае паўнамоцтвы, вызваліць яе ад пасады — кампетэнцыя парламента. Таму без дамоў з Блокам Цімашэнкі не забяспечыць шматчаканай народам стабільнасці ў дзяржаве, не выканаць перадвыбарных абяцанняў, не пераадолець крызісу. І з гэтым нельга не лічыцца Януковічу, калі ён будзе названы новым прэзідэнтам. Таму часовы саюз гэтых непрымірымых на сёння палітыкаў, можа тым самым узбагаціць практыку «ўкраінізацыі» вышэйшай улады новым зместам.

А яна, гэтая практыка, часам набывала не заўсёды зразумелыя павароты і адхіленні ад агульнапрынятай практыкі кіравання дзяржавай. Як вядома, дзейнасць палітыка на пасадзе прэзідэнта мае шмат як прыемных акалічнасцяў, так і малаприемных абмежаванняў і строгіх абавязкаў. Даводзіцца пастаянна разрывацца паміж «хачу» і «трэба», не забываць, што ты на службе ў народа, а не народ у цябе. А значыць рабіць усё тое, што ідзе зараз ці пойдзе потым на яго карысць. Напрыклад, падтрымліваць і ў меру магчымасцяў развіваць добрыя адносіны з суседзямі. Аксіёма. Але, відаць, рамантыка «ўкраінізацыі» натхніла Юшчанку напрыканцы свайго прэзідэнцкага тэрміну прызнаць бандэраўцаў барацьбітамі за незалежнасць. Няўжо Віктар Андрэевіч не ведаў, што гераізацыя УПА і яе лідараў выкліча моцную крытыку, удар па іміджу Украіны за мяжой? Сумніўна. Не сцікліі яшчэ міжнародныя рашучыя пратэсты супраць ухвалення галаварэзаў Бандэры, як нацыяналісты пачалі патрабаваць ад Ющчанкі адмяніць святкаванне 23 лютага Дня абаронцы айчыны і зрабіць замест гэтага дзяржаўным святам 14 кастрычніка — дзень стварэння Бандэрам Украінскага паўстанцкага войска і Зброі, а таксама абавязаць мясцовыя ўлады забяспечыць належную сацыяльную падтрымку гэтым барацьбітам за свабоду і іх сем'ям.

Сапсаваныя адносіны з Расіяй, дэманізацыя яе ролі ў гісторыі Украіны, што нанесла велізарныя страты эканоміцы краіны — асобная вялікая тэма, якая поўнасцю ляжыць у рэчышчы «ўкраінізацыі». Як і празмерна сардэчныя і амаль сваяцкія адносіны з Грузіяй. Дзіўныя вектары знешняй палітыкі.

А пакуль у Кіеве і далёка за яго межамі папулярная зараз тэма майдана. Многія лічаць, што цяпер эфектыўная «памяранцавая рэвалюцыя» малаверагодная, паколькі да майдану, як палітычнага фактара, падрыхтаваліся прыхільнікі абодвух кандыдатаў. Кожны можа стварыць уласны майдан. Не выключана, што праціўнікі памітынгуюць, пакрычаць, але затым будуць шукаць кампрамісы. А можа і не будуць.

Цікавая дэталь, у лістападзе 2004 года Янукovіч, згодна з тагачаснымі звесткамі ЦВК, перамог у другім туры прэзідэнцкіх выбараў з адрывам у 2,7 %. За яго тады прагаласавалі 49,42 %, а за Юшчанку — 46,69 % выбаршчыкаў. Але прыхільнікі апошняга, сярод якіх самым актыўным чынам праявіла сябе Цімашэнка, пачалі масавыя акцыі пратэстаў. Іх потым рамантычна назвалі «памяранцавай рэвалюцый», а Цімашэнку за выключны ўклад у яе здзяйсненне — «памяранцавай прынцэсай». Акрамя гэтага, міжнародныя назіральнікі ад АБСЕ, ПАСЕ, Еўрапарламента прызналі другі тур не адпаведным еўрапейскім стандартам дэмакратычных выбараў. Пад небывалым ціскам з усіх бакоў Вярхоўны суд адмяніў пастанову ЦВК аб выніках выбараў і рэкамендаваў правесці трэці тур, у якім пераможцам стаў Юшчанка. Цяпер сітуацыя нібы паўтараецца, толькі ў ролі суперніка Януковіча выступае «памяранцавая прынцэса». Толькі ці дачакаецца яна трэцяга тура?

Але, відаць, на ўсялякі выпадак Вышэйшы адміністрацыйны суд Украіны да канца лютага будзе працаваць у надзвычайным рэжыме з 9.00 да 24.00. А 7 лютага суд увогуле дбаў круглыя суткі. А як жа інакш, гэта важная структура, якая вырашае ўсе пытанні, звязаныя з выбарамі прэзідэнта Украіны. І сапраўды, прафесійны досвед суддзяў яшчэ абавязкова спатрэбіцца для аператыўнага разгляду выбарчых калізій і скаргаў. Ва Украіне выбары без палітычных землятрусаў — гэта не выбары.

Цімашэнка яшчэ ў нядзелю паабяцала адстойваць кожны голас. Яна ўчора ўдзень збіралася правесці прэс-канферэнцыю па выніках другога тура, потым перанесла на вечар, а нарэшце ўвогуле адмяніла. Магчыма, прычына ў тым, што міжнародныя назіральнікі станоўча ацанілі правядзенне другога тура выбараў. А кіраўнік місіі назіральнікаў ад Еўрапарламента Павел Коваль назваў іх «празрыстымі і дэмакратычнымі». Засталося таксама задаволенымі ходам галасавання і назіральнікі ад АБСЕ і Савета Еўропы. На іх погляд, выбары адпавядалі міжнародным стандартам, яны былі канкурэнтныя і добра арганізаваныя. Можа таму, каб лепш выпрацаваць тактыку паводзінаў на найбліжэйшую перспектыву, Цімашэнка перанесла прэс-канферэнцыю на сёння.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Выстава

КНІЖНЫ ШАРМ

Францыя прывабіць чытачоў... канцэртам Патрысіі Каас

АРГАНІЗАТАРЫ XVII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу спадзяюцца, што сёлета наведвальнікаў у Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» будзе не менш, чым у мінулыя гады. Летась выставу наведалі каля 40 тысяч чалавек. І ёсць спадзяванне, што сёлета іх будзе больш. Бо вельмі імкнуліся стварыць умовы для таго, каб людзі не толькі ішлі гляджэць на прадукцыю кніжных выдаўцоў, але і маглі набыць самыя розныя кнігі без нацэнкі, што асабліва падкрэсліваюць арганізатары, прызнаўшы аднак, што гэта не зусім правільна: кніга павінна каштаваць аднолькава і ў краме, і на выставе. Аднак пакуль у нас дбаюць пра тое, каб захаваць у людзей цікавасць да чытання і жаданне набываць кніжныя навінкі.

Ігар ЛАПЦЁНАК, намеснік міністра інфармацыі Беларусі:

— Сёлета ў нашай выставе-кірмашы прымае ўдзел 26 краін, усяго 619 экспанентаў. Самыя вялікія стэнды будуць сёлета ў нашага ганаровага госця Францыі — 204 квадратныя метры. Агульнанацыянальны расійскі стэнд роўны французскаму, але будуць дадатковыя стэнды расійскіх выдавецтваў (яшчэ 80 метраў). Вялікім будзе і нацыянальны беларускі стэнд. Мы запрасілі ўсе 805 суб'ектаў гаспадарання. Так, ёсць дробныя выдаўцы, іх можа гэта і не зацікавіць, але больш вялікія выдавецтвы будуць удзельнічаць. Мы цяпер імкнёмся захаваць рынак, нягледзячы на тое, што па ім быў нанесены ўдар, выкліканы сусветнымі крызіснымі з'явамі.

Аднак пераадольваць іх арганізатары кніжных выстаў збіраюцца паступова, пакрысе. І калі арганізатары кніжных кірмашоў іншых краін пакуль працуюць у «мінус», то Беларусь на сваім кніжным форуме ўсё-такі атрымлівае бясспрэчны плюс. Калі іншыя ў аснову асноў ставяць эканоміку, імкнучыся зарабіць нават на продажы квіткоў, то беларускі міжнародны кніжны кірмаш у эканоміку выставы ўкладвае, працуючы пры гэтым на галоўнае — на імідж дзяржавы. Таму ёсць магчымасць для своеасаблівага беларускага цуду: уваход на выставу абсалютна вольны. Дзе яшчэ такое ёсць?!.

А сёлета яшчэ і з шармам, які дадасць прысутнасць французскіх кніг, літаратараў і мастакоў. Францыя робіць націск на сваю сучасную літаратуру.

Людовік РУАЕ, дарадца па супрацоўніцтве і культуры Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь падкрэсліў:

— Вы на нашым стэндзе не знойдзеце творы такіх пісьменнікаў, як Флабэр, Мапасан і іншых, якіх усе ведаюць. Каго была магчымасць чытаць у перакладзе на рускую ці беларускую мовы, а магчыма і па-французску. Тады навошта нам прывозіць такія кнігі? На нашым стэндзе гаворка ідзе пра сучасную літаратуру. Гэта для нас самае галоўнае. Таму што ў Беларусі ўжо шмат хто ведае такіх пісьменнікаў, як Бегбедэр і Ганна Гавальда. Ці шэраг іншых. Іх не будзе. Але, магчыма, у будучыні — Бегбедэр, прынамсі, не адмовіўся. Таму ўсё напярэдзе. Канешне, мы вывучалі беларускі рынак, стараліся знайсці кнігі, якія вас зацікавяць на французскай мове і на рускай, на беларускай таксама (хоць іх значна менш). Вызначыць іх нам дапамагалі ў выдавецтве «Макбел». Я спадзяюся, кнігі спадабаюцца беларусам.

Дзмітрый МАКАРАЎ, генеральны дырэктар «Макбел», выканаўчы дырэктар XVII Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу:

— Мы рабілі падборку — лепшых французскіх кніг, якія выдадзены за апошнія пяць гадоў у нас, у Расіі — яны будуць прапанаваныя. Гэтыя кнігі можна будзе не толькі паглядзець, але і набыць. А кнігі на французскай мове ў нас увогуле няма дзе купіць, таму выстава — унікальная магчымасць для гэтага. Мы разам з пасольствам Францыі выдаём серыю «Бібліятэка французскай літаратуры». Адзін з аўтараў гэтай серыі — Крысіцян Гарсэн — прыедзе ў Мінск. Будзе ўнікальная магчымасць набыць кнігу з аўтографам аўтара. Кніга ёсць у перакладзе на рускай мове — і пакуль яе больш ніхто на рускую не перакладаў.

Таксама будуць магчымасці цікавых сустрэч з выдатнымі асобамі, якія спецыяльна прыедуць з Францыі, каб пазнаёміць са сваёй краінай і як культуру — не толькі кніжнай. Шмат хто з гэтых людзей ўжо бываў у нашай краіне, добра яе ведаюць і будуць рады новым сустрэчам. Як напрыклад, Давід Фанкінос, ці гісторык Цьеры Ленц, дырэктар фонду Напалеона. Пісьменніца Ан-Мары Поль піша для падлеткаў і чакае патэнцыяльных беларускіх чытачоў на аўтограф-сесію. Таксама як ілюстратар П'ер Карнюэльуэл пакажа, як умее маляваць. Прыедуць Эрык Вінь, які працуе для выдавецкага вядомага дома «Галімар», і Жан-Поль Кале, які з'яўляецца гаспадаром кніжнай крамы ў цэнтры Парыжа.

Але ёсць цікавасць для наведвальнікаў, своеасаблівы падарунак ад Францыі: набываючы кнігу гэтай краіны, чалавек будзе ўдзельнічаць у розыгрышы двух квіткоў на канцэрт Патрысіі Каас. Такі прыгожы жэст Французскага Пасольства.

Ларыса ЦІМОШЫК.

БЕРНД ШТАНГЕ: «ПАШЧАСЦІЛА, ШТО НЕ АТРЫМАЛІ ІСПАНІЮ, ІТАЛІЮ ЦІ АНГЛІЮ»

У нядзелю ў Варшаве адбылася жараб'ёўка адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы па футболе, фінал якога адбудзецца ў 2012 годзе ў Польшчы і ва Украіне. Зборная Беларусі трапіла ў групу D разам з камандамі Францыі, Румыніі, Босніі і Герцагавіны, Албаніі і Люксембурга.

Астатнія каманды размеркаваліся наступным чынам:

Група A: Германія, Турцыя, Аўстрыя, Бельгія, Казахстан, Азербайджан.

Група B: Расія, Славакія, Ірландыя, Македонія, Арменія, Андора.

Група C: Італія, Сербія, Паўночная Ірландыя, Славенія, Эстонія, Фарэрскія астравы.

Група E: Нідэрланды, Швецыя, Фінляндыя, Венгрыя, Малдова, Сан-Марына.

Група F: Харватыя, Грэцыя, Ізраіль, Латвія, Грузія, Мальта.

Група G: Англія, Швейцарыя, Балгарыя, Уэльс, Чарнагорыя.

Група H: Партугалія, Данія, Нарвегія, Кіпр, Ісландыя.

Група I: Іспанія, Чэхія, Шатландыя, Літва, Ліхтэнштэйн.

Фаварытам нашай групы з'яўляецца, безумоўна, «сеяная» з першага кошыка зборная Францыі. Праўда, галоўнага трэнера гэтай каманды Раймана Даменека няшчадна крытыкуюць, і магчыма, у Мінск французаў прывязе зусім іншы трэнер. З гэтай камандай беларусам гуляць пакуль не даводзілася. А вось з другога кошыка нам трапілася каманда Румыніі, знаёмая па адборы да Еўра-2008. З гэтай камандай беларусы тройчы сустракаліся і столькі ж саступалі (двойчы з лікам 1:3 — у адборы да еўра 2008, аднойчы з лікам 0:2 — у 2004 годзе ў перадсезонным турніры на Кіпры). Не падарунак дастаўся і з трэцяга кошыка. Каманда Босніі і Герцагавіны папсавала нервы ў адборы да мундзіялю-2010, абышоўшы ў групе туркаў, бельгійцаў, эстонцаў і армян. Беларусам дагэтуль з гэтай балканскай камандай сустракацца не даводзілася. З албанцамі беларусы таксама знаёмыя па адборы да Еўра-2008. Тады наша каманда дома згуляла ўнічыю і перамагла суперніка на выездзе. Чатыры разы сустракаліся беларусы і з камандай Люксембурга. Двойчы перамагалі, аднойчы згулялі ўнічыю. А яшчэ раз ганебна прайгралі. Зноў-такі было гэта ў межах адбору да Еўра-2008, у 2007 годзе, на стадыёне ў Гомелі пад кіраўніцтвам цяперашняга галоўнага трэнера Бернда Штангe. І гэтую гульню дагэтуль многія называюць самай вялікай ганьбай беларускага футбола.

Але Бернд Штанге як да жараб'ёўкі, так і пасля застаецца аптымістам і верыць у сваю каманду. Вось яго меркаванне, якое ён выказаў афіцыйнаму сайту УЕФА адразу пасля жараб'ёўкі ў Варшаве:

— Пашчасціла, што ў нашу групу не трапілі такія каманды, як Іспанія, Італія ці Англія. Лічу, што цяпер яны — наймацнейшыя на кантыненце. Але і Францыю нельга недаацэньваць. Калі я быў трэнерам зборнай ГДР, тройчы гуляў супраць «трохкаляровых», і толькі аднойчы выйграў. Рады за беларускіх балельшчыкаў, якія ўбачаць такіх зорак, як Франк Рыберы, Цьеры Анры, Самір Насры. З іншага боку, я не надта задаволены, што нам зноў, як і ў кваліфікацыі да Еўра-2008, трапіліся Румынія, Албанія і Люксембург. Лепш бы наш глядач убачыў каго-небудзь іншага. Вельмі моцныя баснійцы, у якіх вядучыя футбалісты выступаюць за мяжой. Эдзін Джэко, Звездан Місімавіч — сапраўдныя зоркі, на якіх палююць вялікія еўрапейскія клубы. У любым выпадку мы пастараемся выкарыстаць свой шанц і заняць месца не ніжэй за другое. Гэта наша задача.

А вось як пракаментаваў вынікі жараб'ёўкі **старшыня Асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Генадзь НЯВЫГЛАС:**

— Нам дасталіся няпростыя супернікі. Францыя, Баснія і Герцагавіна, Румынія — тыя каманды, якія знаходзяцца вышэй за нас у рэйтынгу. Але, на мой погляд, мы павінны гуляць з імі на роўных. Наша задача — настройвацца на кожны матч. Узровень беларускай каманды значна вырас, і мы зможам дасягнуць станоўчага выніку. Баснія і Герцагавіна — вельмі няпростая для нас зборная. З албанцамі мы сустракаліся неаднойчы. На выездзе з імі, як і з любымі балканцамі, гуляць няпроста, аднак статыстыка на нашым баку. Мяркую, і на гэты раз зможам іх абгуляць.

Прадстаўнікі астатніх зборных у нашай групе, зразумела, не бачаць у беларускай камандзе фаварыта, аднак называюць яе камандай, якая можа прыпаднесці сюрпрыз. **Галоўны трэнер зборнай Румыніі Рэзван ЛУЧЭСКУ** выказаўся наступным чынам:

— Нашу групу цалкам можна назваць самай складанай. Яна збалансаваная, і некалькі камандаў здольныя на сюрпрызы. Зборныя Босніі і Герцагавіны і Беларусі не так даўно дасягалі вялікіх поспехаў...

Згодны з калегам і **галоўны трэнер зборнай Босніі і Герцагавіны:**

— Камандны накшталт беларускай ці албанскай у стане прыпаднесці сюрпрыз у паядынку з любым апанентам. Мяркую, у нашай групе барацьба будзе весціся да апошняга.

Нагадаем, што напрамую ў фінальную частку Еўра-2012 выходзяць усе зборныя, якія занялі ў сваіх групах першыя месцы, а таксама найлепшая зборная, якая заняла другое месца. Астатнія каманды, якія фінішуюць другімі, будуць весці барацьбу ў стыкавых матчах за права выступаць у фінале. На працягу найбліжэйшых 30 дзён павінен быць узгоднены каляндар матчаў у групе, які неабходна прадставіць ва УЕФА. Калі самі зборныя згоды не дасягнуць, гуляць прыйдзецца па раскладзе, які выдасць УЕФА.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Спорт-тайм

Самсонаў другі на «Топ-12»

Беларус Уладзімір Самсонаў заняў другое месца на прэстыжных спаборніцтвах па настольным тэнісе «Топ-12» з удзелам лепшых еўрапейскіх майстроў малой ракеткі.

У нямецкім Дзюсельдорфе ў фінальным паядынку Уладзімір Самсонаў (2-гі нумар еўрапейскага рэйтынгу) саступіў немцу Ціма Болю — 2:4. На папярэднім этапе наш суайчыннік перайграў з аднолькавым лікам 4:1 нямецкага тэнісіста Крысціяна Зюса і шведа Ёргена Персана. У чвэрцьфінале зноў з тым жа лікам беларус перайграў харвата Зорана Прымораца, а ў матчы за выхад у фінал разграміў аўстрыйца Чэн Вейксіна — 4:0. У жаночых спаборніцтвах беларуска Вікторыя Паўловіч не здолела выйсці ў чвэрцьфінал.

Наталля Цылінская зноў стала матуляй

Васьміразовая чэмпіёнка свету па веласпорце, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Афінах 34-гадовая Наталля Цылінская ў другі раз стала матуляй. 5 лютага ў яе нарадзілася дзяўчынка.

У першым сталічным раддоме Наталлі зрабілі Кесарава сячэнне. І матуля, і немаўля адчуваюць сябе добра, паведамляе «Салідарнасць». Нагадаем, што ў адной з самых адметных беларускіх спартсменак ёсць і старэйшая дачка Маша — ёй зараз 12 гадоў.

Алена КРАВЕЦ.

У ЗША 8 ЛЮТАГА АБ'ЯЎЛЕНА НЕРАБОЧЫМ ДНЁМ У СУВЯЗІ З МОЦНЫМ СНЕГАПАДАМ У ВАШЫНГТОНЕ

Федэральны ўрад ЗША аб'явіў панядзелак, 8 лютага, для сваіх служачых нерабочым днём у сувязі з моцным снегападам, які прайшоў у мінулыя пятніцу-суботу на цэнтральнай частцы Усходняга ўзбярэжжа краіны і практычна накрыў Вашынгтон.

Нягледзячы на тое, што нядзеля, як і абяцалі сіноптыкі, была вельмі сонечная, тэмпература паветра ў амерыканскай сталіцы і яе наваколлі трымалася на адзнацы каля мінус 7 градусаў па Цэльсію, і снег, таўшчыня якога ў Вашынгтоне дасягала прыкладна 60 см, практычна не раставаў. Большасць жа дарог у рэгіёне ў мінулы дзень так і заставаліся без перабольшання непраходнымі, хоць уборачная тэхніка працавала бесперапынна.

У штатах Мэрыленд, Вірджынія і Заходняя Вірджынія, дзе ападкаў выпала месцамі прыкладна па 90 см, ва ўборцы снегу задзейнічалі сілы Нацыянальнай гвардыі, якія падпарадкоўваюцца губернатарам. А ў Вашынгтоне да гэтай справы прыцягнулі нават зняволеных. Іх намаганні, аднак, сталі літаральна кропляй у моры. Сітуацыя ўскладняецца тым, што 9 лютага ўвечары сталіцу ЗША накрые, як папярэджваюць метэаролагі, новы атмасферны фронт, які нясе снег. Як чакаецца, яго можа выпасці амаль 13 см.

Праблемай застаюцца перабоі ў электразабеспячэнні насельніцтва Вашынгтона і прыгарадаў. Мяркуючы па ўсім, без святла да гэтага часу застаюцца не менш за 100 тыс. чалавек. Як сведчыць мясцовы друк, жыхары цэлага шэрагу закранутых кварталаў ледзь не ў масавым парадку часова перасяляюцца ў блізкія гасцініцы або да родных і блізкіх, у якіх ёсць электрычнасць.

Школы застаюцца закрытымі, прычым некаторыя — да 10 лютага. Вашынгтонскае метро абслугоўвала ў нядзелю толькі падземныя станцыі. Аўтобусны рух быў адменены. Аўтааматарам улады рэкамендуюць без крайняй неабходнасці не выязджаць з дому. У адной толькі Вірджыніі паліцыя адказала на 4373 выклікі, звязаныя з ДТЗ.

Аэрапорт імя Рэйгана, які абслугоўвае ўнутраныя рэйсы і закрыты з 5 лютага, плануе аднавіць паўнацэннае функцыянаванне сёння ў другой палове дня. Адміністрацыя міжнароднага аэрапорта імя Даласа на яго сайце ў інтэрнэце заклікае пасажыраў ехаць туды толькі ў тым выпадку, калі ў іх ёсць пацвярджэнне ад кампаніі-перавозчыка аб намеры выканаць рэйс.

Фота БЕЛТА.

11 марта 2010 г. в 12.30 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «ГОМЕЛЬЖИЛПРОЕКТ»

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основные направления деятельности Общества в 2010 г.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2009 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2010 году и первом квартале 2011 г.
6. О материальном вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Начало регистрации участников собрания — 12.00.

УНП 400022625.

ОБЪЯВЛЕНИЕ
УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!

ОАО «ОБУВЬТОРГ» сообщает о проведении 11 марта 2010 года общего собрания акционеров, которое состоится в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 28.

Регистрация участников проводится с 13.00 до 13.45 по предъявлению документов.

Начало собрания в 14.00.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и перспективах развития Общества на 2010 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.
3. О результатах проверки Общества Ревизионной комиссией за 2009 год.
4. Об утверждении годового баланса, направлений использования чистой прибыли, отчета по прибылям и убыткам за 2009 год.
5. Об утверждении дивидендов за 2009 год.
6. Об утверждении направлений использования чистой прибыли на 2010 год.
7. Об утверждении регламента работы ОАО «Обувьторг» с реестром владельцев ценных бумаг.
8. О приобретении ОАО «Обувьторг» акций Общества.
9. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
10. Об утверждении условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
11. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

С материалами, предлагаемыми для ознакомления акционерам по вопросам повестки дня собрания, можно ознакомиться: в рабочие дни — понедельник—пятница, начиная с 3 марта 2010 года по месту нахождения Общества.

УНН 100262852

Наблюдательный совет.

РУП «РЕЧИЦКИЙ ОПЫТНО-ПРОМЫШЛЕННЫЙ ГИДРОЛИЗНЫЙ ЗАВОД»
26 февраля 2010 года в 10.00 в городе Речица Гомельской области по ул. Ильича, 1 проводит торги в форме открытого аукциона без условий по продаже имущества:

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена продажи без НДС, руб.
1	Весы лабораторные равноплечие ВЛР-200	8646	541 215
2	Весы лабораторные равноплечие ВЛР-200	8807	466 830
3	Весы лабораторные равноплечие ВЛР-200	8233	466 830
4	Кислородометр К-215	8636	605 340
5	Кондиционер CHANGHONG KFR-28GW/WS	9814	438 615
6	Кондиционер CHIGO KFR-32GW/A	9859	466 830
7	Кондиционер CHIGO KFR-25GW	9860	420 660
8	Кондиционер CHIGO KFR-32GW/A	9861	605 340
9	Кондиционер CHANGHONG KFR-28GW/WS	9858	559 170
10	Кондиционер CHANGHONG KFR-28GW/WS	9857	559 170
11	Кондиционер SAMSUNG AW05MOYEA	9863	279 585
12	Кондиционер SAMSUNG AW05MOYEA	9864	279 585
13	Кондиционер SAMSUNG AW05MOYEA	9865	279 585
14	Биологический термостат ВТ-120	8983	1 680 075
15	Стерилизатор воздушный ГП-20	8635	307 800
16	Стерилизатор паровой ВК-75	8591	2 518 830
17	Световой прибор (министар) ZIG ZAG "C"	7563	112 860
18	Световой прибор (министар) ZIG ZAG "C"	7564	112 860
19	Проигрыватель дисков TEAC CD-P1100	7569	194 940
20	Дыммашина F-80 Fogger	7562	194 940
21	Комплект световой аппаратуры TESLA VRABLE	7551	166 725
22	Телефон "Panasonik модель КХ-ТСД-953 RUB"	9634	46 170
23	Подвесной одноблочный кран	5496	6 438 150
24	Пылесос ЗИЛ-930	8350	400 140
25	Станок балансировки	9151	513 000
26	Электротельфер г/п 2 тн Н=6м	8761	2 518 830
27	АСКУЭ "Эркон" в комплекте (ВУ, ИБП, УСД-4 шт.)	9853	1 492 830
28	Дробилка молотковая на плите без эл. двигателя	–	3 452 490
29	Металлоконструкция теплицы	–	2 331 585
30	Насос Ш 8/25	–	428 355
31	Насос ШГ 8/25	–	707 940
32	Воздухосборник	–	3 730 909
33	Трансформатор ТМ-400-10/04	4449	6 866 505
34	Холодильник "Снежинка"	7214	48 735
35	Холодильник "Снежинка М"	7215	48 735
36	Трельяж	7327	17 955
37	Электроталь 3.2 тн	8339	3 034 395
38	Электроталь 0.5 тн 18 м	8532	1 569 780
39	Точильно-шлифовальный станок ЗК-633	8899	446 310
40	Набор мебели "Речица"	9051	120 555
41	Трансформатор ТМ-630-10	9148	11 185 965
42	Тельфер г/п 1тн	9203	1 462 050
43	Емкость ТКН-50 м³	9238	5 786 640
44	Емкость ТКН-50 м³	9239	5 786 640
45	Емкость ТКН-50 м³	9240	5 206 950
46	Электротельфер г/п 2 тн	9269	1 649 295
47	Емкость V=75 м³	9277	7 674 480
48	Компрессор ПКР-8/12	–	1 431 270
49	Вентилятор Ц-14	9459	1 441 530
50	Вентилятор Ц-14	9460	1 441 530
51	Трансформаторная подстанция 2КТП-630	9831	18 532 125
52	Трансформатор ТМ-1000/10	9832	12 440 250
53	Трансформатор ТМ-1000/10	9833	12 440 250
54	Циклон ОЭКДМ К-12

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

НАШЫ КОНКУРСЫ

Працягваем іх чарговымі заданнямі міжнароднага гросмайстра Уладзіміра Матуса з Масквы (аўтарскі-9) і майстра ФМЖД Віктара Шульгі з Мінска (аўтарскі-10). Абодва конкурсы рашэнняў з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.



№ 9/8. **Белыя**: 25, 31, 34, 39, 40, 42, 43, 48 (8). **Чорныя**: 9, 13, 14, 20, 23, 26, 32, 35, 37 (9). Выйгрыш.



№ 10/3. **Белыя**: a7, c7, e3, f6, g1, g5 (6). **Чорныя**: b2, b4, c5, d4, d8, f2, h4, h8 (8). Перамога белых.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні.

Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

ЧЭМПІЯНАТ БЕЛАРУСІ

Ён адбыўся ў яго першай лізе. Па рускіх шашках пуцёўкі ў галоўны турнір заваявалі: у мужчын — міжнародны майстар Ігар Міхальчанка з Ваўкавыска, нацыянальныя майстры Міхаіл Кароткін з Віцебска, Віталь Аніська са Слоніма, майстар ФМЖД Віталь Варушыла з Мінска і кандыдат у майстры спорту Яўген Маеўскі з Гродна, у жанчын — Анастасія Стасючонак (Віцебск), мінчанкі Анастасія Барышава, Аляксандра Спірына, бабруйчанка Анастасія Гарлатава і Зоя Камедзька (Віцебск).

Па міжнародных шашках заслужылі права выступіць у турніры мужчын вышэйшай лігі В. Варушыла, майстар са сталіцы Уладзімір Беляеўскі, майстар ФМЖД Мікалай Кадзеснікаў (Бабруйск), мінскія майстар Наталля Герасімовіч і кандыдат у майстры спорту Аляксандр Цецяронак. У жанчын у мацнейшы эшалон першынства рэспублікі перайшлі кандыдаты ў майстры Вера Хвашчынская (Бабруйск), Анастасія Стасючонак, першаразрадніца Анастасія Барышава, кандыдаты ў майстры Ганна Вузлік з Мінска і Святлана Ланцэева з Жодзіна.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Бліц-52/5 (Л. Вітошкін): A(b6) a5, h6, ef4, ab2, f8, b2, fg7, e5, c3, c1#.

Па-за конкурсам (Л. Вітошкін): **№ 1** — g5, g7, d8, g5, e3, a1x; **№ 2** — d4, f4, b8 (b2) f2, a7, a1x.

Аўтарскі-9/4 (У. Матус): 4, 20, 18, 8 (46) 1, 5x.

Муз-news

БЕЛАРУСКАЯ АРТЫСТКА ТРАПІЛА ВА ЎКРАІНСКІЯ «ЗОРКІ»

Спявачка Берта стала лаўрэатам першага і прызёрам другога тура міжнароднага конкурсу «Я — зорка», зладжанага аднайменным украінскім парталам і кіеўскай радыёстанцыяй Music radio. Конкурсная песня беларускі «Птушка» заняла ў першым туры конкурсу 4-е месца і ўвайшла ў першы зборнік песень «Я — зорка», які арганізатары плануюць выпускаць штоквартальна. А завершыцца конкурс у студзені гэтага года вялікім канцэртам прызёраў усіх тураў у палацы «Украіна». Пераможцам і дыпламантам абяцана мноства прызоў, сярод якіх — запіс у прафесійнай студыі, здымкі кліпа, дуэт з «зоркай» або песня вядомага аўтара ў падарунак.

«Мне вельмі прыемна, што песня «Птушка» спадабалася ўкраінскай публіцы, — радуецца Берта, — бо ў першым туры галасаваць з Беларусі было немагчыма, і ўсё адно я абышла амаль 370 іншых песень, у асноўным украінскіх выканаўцаў. А ў другім туры я выставіла песню «Кіно», і не прагадала — заняла трэцяе месца і трапіла ў фінал, так што цяпер у мяне ёсць шанц пазмагацца за галоўныя прызы!»

Падтрымаць зямлячку ў наступных турах, а таксама прасачыць за далейшым ходам конкурсу можна на сайце http://ya-zvezda.com.

МУЗЫЧНЫ ГАРАСКОП ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ

Яго склала спявачка Іскуі Абалян, якая напярэдадні Дня святога Валянціна ўжо чацвёрты год запар прапануе слухачам свае тэматычныя аўтарскія праекты. Цяперашні канцэрт-прысвячэнне, які называецца «Гараскоп кахання», адбудзецца 12 лютага ў Палацы Рэспублікі і традыцыйна збярэ, акрамя ініцыятаркі, цэлы россып вядомых беларускіх артыстаў: Іна Афанасьева, Георгій Калдун, Венера, Аляксандр Патліс, Аня Шаркунова, Герман, Алеся, Ілья Міцько, «Атлантыка», «Тяни-Толкай» і іншыя выканаўцы праспяваюць пра каханне.

«Мы рыхтуем для публікі сюрпрыз — парад прэм'ер, — ледзь-ледзь прыадкрывае сакрэты будучага шоу Іскуі. — На канцэрце прагучыць каля 20 новых кампазіцый пра каханне — на самы розны густ і ўзрост. Няхай усе прыгадаюць пра тое, што каханне — містычнае пачуццё, поўнае таямніц і загадак, раскрыць якія дапамагаюць у тым ліку гараскопы».

Дарэчы, непасрэдна на свята закаханых, 14 лютага, тэлеверсію канцэрта пакажа Першы канал.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Шчыра віншуем **Віктара Канстанцінавіча КАЎЦЭВІЧА** з вёскі Галынь **з 55-годдзем**.

Жадаем моцнага здароўя, радасці ў жыцці, поспехаў у працы і доўгіх гадоў жыцця.

Родныя.

І мы там былі

ЗЛУЧАНЫЯ ЦЯРЭШКАМ

КРЫЎДНА і балюча бывае за тое, што нас часам імкнуцца пазбавіць таго ці іншага кавалка гісторыі, а яшчэ больш душа пакутуе ад таго, што камусьці хочацца, каб мы забыліся на свае карані, на глыбінныя вытокі, якія не сапсаваны цывілізацыяй, замежнымі запазычаннямі, якія здольныя наталіць смагу душы і паказаць духоўны свет нашых продкаў праз найбагацейшае суквецце традыцый, звычаяў, святаў, абрадаў, песень, карагодаў, строяў, прыкмет і павер'яў.

Вельмі хацелася б, каб ідэі калядных святкаванняў не сталі чужымі сэрцу і душы нашай сённяшняй моладзі, перш за ўсё гарадской, таму што вясковая да гэтага часу знаходзіць у калядным фэсце духоўны прытулак для сваёй душы. У гэтым мы пераканаліся падчас чарговай экспедыцыі ў Лепельскі і ва Ушацкі раёны.

Гістарычна склалася так, што адметная з'ява нашай народнай традыцыі — каляднае ігрышча «Жаніцьба Цярэшкі» — была распаўсюджана ў тым арэале, які ахоплівае Полацкі, Докшыцкі, Глыбоцкі, Мёрскі, Пастаўскі, Ушацкі і Лепельскі раёны. Фрагментарна гэта абрадавае ігрышча вядома і ў некаторых іншых, суседніх з імі раёнах Беларусі. Аднак найбольш поўна, цэласна гэты феномен беларускай традыцыйнай духоўнай спадчыны існаваў, захаваўся і дажыў да нашага часу менавіта ў адзначаным арэале.

Тыя два варыянты ігрышча, якія мы пабачылі ў вёсках Матырына і Касары, у структурным плане падобныя, а вось у дэталях адрозныя, але мы паспрабуем падаць іх апісанне разам, безумоўна, звяртаючы ўвагу на найбольш характэрныя мясцовыя рысы.

У кожнай вёсцы колькасць удзельнікаў была розная (дзе дзесяць, а дзе і трыццаць параў), але хлопцы і дзяўчаты імкнуліся збірацца так, каб кожны знайшоў сабе пару. Рыхтаваліся да гэтай падзеі загадзя. Трэба было дамовіцца з гаспадарамі вялікай хаты, упрасіць іх выканаць ролю бабы і дзеда, якім будзе даручана тайна ўзаемаадносінаў паміж маладымі людзьмі. Трэба было ўлічваць і артыстызм гаспадароў (уменне спяваць і танчыць), і іх дакладнае веданне традыцыі, і павагу да іх з боку вяскоўцаў, і адначасова шчыры давер з боку самой моладзі. Зразумела, што пасля вызначэння такой сям'і хата на некалькі дзён станавілася штаб-кватэрай маладога пакалення. Хлопцы прыходзілі папярэдзіць, каб старэйшыя не забыліся пра выказаныя пажаданні. Тыя ж, у сваю чаргу, маглі неўпрыкмет папярэдзіць дзяўчат аб тым, хто будзе да іх заляцацца. Здаралася так, што гаспадары выконвалі ролю вопытнага дыпламата, які аўтарытэтна мог падкарэктаваць папярэдні выбар пары, каб затым не было нейкіх непаразуменняў і крыўды.

Калі ўсе арганізацыйныя пытанні былі вырашаны, прызначаўся дакладны дзень правядзення ігрышча. Яшчэ раніцай хлопцы прыносілі гаспадарам свае дровы, палілі грубку, каб у хаце было цёпла і ўтульна. Адвячоркам невялікімі групамі моладзь кіравалася да абранай для ігрышча хаты. Чым у гэты час поўнілася душа і сэрца кожнай дзяўчыны і хлопца? Усе добра разумелі, што гэты вечар меў у іх жыцці вельмі важнае значэнне. У прасторы звычайнай вясковай хаты, як у кроплі вады, факусаваліся ўсе жыццёвыя перыпетыі вясковага ладу. Кожны з прысутных нёс у сабе адбітак свайго роду, яго аўтарытэт, статус, гонар, месца ў сацыяльнай іерархіі. Разам з тым, для маладых людзей гэта была тая сітуацыя, калі трэба было праявіць галоўныя рысы свайго характару, прадэманстраваць свае здольнасці.

Калі ўсе ўдзельнікі калядных вячорак збіраліся, гаспадары давалі каманду да пачатку святочнай забавы. Цікава тое, што ў в. Матырына абрадава-гульнёвая дзея распачыналася адразу ж пасля запрашэння ўсім узяць удзел у ігрышчы, а вось у в. Касары пачатку абрадавай дзеі папярэднічала непрацяглая па часе, але эмацыянальная па псіхалагічным настроі уверцюра. Музыка выконваў чатыры-пяць народных танцаў (кракавяк, падыспань, «На рэчаньку», «Лысы»), мэта якіх, хутчэй за ўсё, зводзілася да неабходнасці пераключыць увагу ўдзельнікаў, зняць скаванасць і настроіць іх на эмацыянальны лад каляднай імпрэзы.

Затым нехта з хлопцаў звяртаўся да прысутных з пытаннем-парадай: «Каб жаніць Цярэшку, трэба выбраць «бабу» з «дзедам». Давайце папросім, каб «бабай» была бабка Ганна (гаспадыня хаты), «дзедам» — дзед Хведар (гаспадар)». Усе прысутныя пагаджаліся з выказанай прапановай, пасля чаго галоўныя персанажы прыступалі да выканання сваіх пачэсных абавязкаў.

Як на ўсіх вясковых танцах, дзяўчаты займалі месца ўздоўж адной сцяны, хлопцы мясціліся непадалёк. Нарэшце «баба» выводзіла на сярэдзіну хаты аднаго з хлопцаў і ішла да гурта дзяўчат. Тыя ў гэты час рабілі выгляд, што яны спакойныя і ўпэўненыя, аднак насамрэч сэрцу моцна хвалявaліся, краем вока сачылі за тым, як паводзяць сябе старэйшыя. Бабуля магла яшчэ і падліць масла ў агонь: падыходзіла то да адной, то да другой дзяўчыны, нешта з імі шапталася-інтрыгавала і толькі праз некалькі хвілін брала за руку тую, з якой ужо была папярэдняя дамова і якая пацвердзіла сваю згоду «скруціцца» з хлопцам. Дзяўчыну падводзілі да хлопца — абодва свяціліся ад шчасця, што іх злучылі. Затым гаспадыня-сваха выводзіла на сярэдзіну хаты наступнага хлопца і пачынала выбіраць яму пару. Выбар-скручванне доўжыўся да таго часу, пакуль уся моладзь не была злучана ў доўгачаканыя пары.

Пасля гэтага пачынаўся другі этап святочнага гуляння. Моладзі трэба было паказаць сваю спрытнасць і вёрткасць і пераканаць прысутных у тым, што «баба» з «дзедам» не памыліліся і падабралі дастойных партнёраў. Хлопцы і дзяўчаты станавіліся ў дзве шарэнгі і пачыналі гуляць у даганялкі, пры гэтым рухацца можна было толькі вакол прысутных, не забягаючы ў сярэдзіну жывога калідора. Прычым, спачатку «ўцякалі» хлопцы, а дзяўчаты даганялі іх, а пасля яны мяняліся ролямі — ужо хлопцы даганялі дзяўчат. І зноў прыклад моладзі падавалі старэйшыя. «Дзед» хаваўся, а «баба» шукала-даганяла яго, пры гэтым яна прасіла дзеда бегаць не вельмі хутка.

Нарэшце распачынаўся заключны этап ігрышча. Музыка іграў «Лявоніху», моладзь станавілася ў круг і пачынала танчыць, «заплятаючы» вельмі прыгожы і надзвычай складаны па кампазіцыі ўзор. Дзяўчына кружылася, рухаючы па сонцы, беручы пад руку кожнага з хлопцаў, выконваючы з ім толькі паўкола і тут жа змяняючы руку і змяняючы партнёра. Незвычайная па прыгажосці рэч! Здавалася б, кола ўдзельнікаў было статычным, стаяла на адным месцы, але ў яго сярэдзіне віравала мора эмоцый.

На гэтым завяршалася, калі можна так сказаць, уласна абрадавая частка каляднага ігрышча. Затым пачыналіся танцы па імправізаванай праграме: музыка выконваў любыя просьбы моладзі...

Гулянне заканчвалася пад раніцу, гаспадарам трэба было хоць крыху паспаць, бо хутка ж ужо трэба было ўставаць, каб накарміць свойскую жывёлу. Разыходзілася і моладзь. Але праз колькі гадзін усе зноў збяруцца ў гэтай хаце — навесці парадак: паразносіць сталы, вымесці і вымыць падлогу, падзякаваць гаспадарам за магчымасць зладзіць гулянне і за тую іх пачэсную місію, якая можа аказацца шчаслівай.

З усяго таго, што нам пашчасціла пабачыць за гэтыя два дні, лагічна выцякала пытанне: «А ці здараецца так, што злучаныя падчас «Жаніцьбы Цярэшкі» пары затым аказаліся заручонымі і павенчанымі на ўсё жыццё?» Наша пытанне выклікала хвалю ўспамінаў, людзі пачалі прыводзіць мноства прыкладаў пра лёс вясковых сямейных параў, доля якіх была «скручана» ў адзінае цэлае на колішніх калядных ігрышчах.

Хацелася б спадзявацца на тое, што старажытная калядная гульня яшчэ надоўга захавае свой лёсавызначальны характар і паспрыяе хлопцам і дзяўчатам знайсці сваё шчасце.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Удзельнікаў «Еўрабачання-2010» раскідалі па «кошыках»

Пытанне, хто паедзе ад Беларусі на 55-ы міжнародны конкурс песні, што адбудзецца сёлета ў Осла (Нарвегія), дагэтуль застаецца адкрытым — да наступнага панядзелка ідзе прыём заявак ад кандыдатаў. Затое ўжо вядома, у які дзень беларускі артыст або артыстка выйдзе на конкурсную сцэну: у нядзелю адбылася папярэдняя жараб'ёўка краін — удзельніц «Еўрабачання».

Беларусі дасталося месца ў першым паўфінале, 25 мая — дакладней, у другой палове канцэрта. У гэты ж блок трапілі такія краіны, як Албанія, Бельгія, Грэцыя, Ісландыя, Македонія, Мальта, Партугалія і Польшча. У першым блоку апынуліся Боснія, Латвія, Малдова, Расія, Сербія, Славакія, Фінляндыя і Эстонія. Трансляваць і галасаваць у першым паўфінале будуць таксама ўдзельнікі «вялікай чацвёркі» краін — арганізатараў шоу, Іспанія і Германія. Другі паўфінал, 27 мая, пакажуць і прагаласуюць у ім Францыя, Вялікабрытанія і гаспадыня конкурсу Нарвегія.

У кожным паўфінале на сцэны выйдуць прадстаўнікі 17 краін. Парадак іх выступленняў пакуль не вызначаны (ён стане вядомы толькі ў сакавіку), але магчымыя шанцы аматары конкурсу ўжо прыкідваюць, зыходзячы з расстаноўкі сілаў. Так, наша краіна, хутчэй за ўсё, можа разлічваць «па звычцы» на галасы падтрымкі з боку Расіі, Латвіі, Польшчы, Малдовы, а далей — як пашанцуе. Зрэшты, арганізатары сёлета наўмысна раздрабнілі суседскія «кошыкі», каб мінімізаваць гэткае ж суседскае галасаванне і ўплыў дыяспар.

Аб сваім жаданні выступіць сёлета за Беларусь на «Еўрабачанні» ўжо абвясцілі спявачкі ПуляЯ і Гюнеш (якую правамерна можна назваць абсалютным доўгажыхаром нацыянальнага адбору), таксама ў ліку прэтэндэнтаў у кулуарах называюць дачку Анжэлікі Агурбаш Дар'ю Ялінскую. Сярод артыстаў-мужчын энтузіязму пакуль што не бачна.

Тым часам з учарашняга дня распачаўся продаж білетаў на «Еўрабачанне-2010». Кошт іх складае ад 35 да 200 еўра, у залежнасці ад таго, на якое з трох шоу, і на генеральную рэпетыцыю ці прамы фінал кожнага з іх, гледачы хочуць патрапіць.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЗА СМЯРОТНЫ ПАРАШОК — УЗМОЦНЕНЫ РЭЖЫМ

12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму атрымаў грамадзянін Літвы Барысас Заблоцкіс 1969 года нараджэння. Касацыйная скарга пакінутая без задавальнення.

Суд Іўеўскага раёна прызнаў вінаватым літоўца ў арганізацыі перамяшчэння праз мытную мяжу Беларусі асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва, а таксама незаконным набыцці, захаванні і перавозцы метамфетаміну ў буйным памеры. Паводле ацэнкі экспертаў, мінімальны кошт канфіскаванай партыі метамфетаміну на чорным рынку складае каля 60 тысяч долараў у выпадку аптовага продажу і звыш 240 тысяч долараў пры рэалізацыі фасаваных дозаў для разавага ўжывання. Скрутак з псіхатропным рэчывам захоўваўся ў тайніку ляснога масіву на тэрыторыі Іўеўскага раёна. Якраз у той момант, калі зламыснік забіраў наркотык з тайніка, ён і быў затрыманы аператыўнай групай упраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці і байцамі «Альфы».

Дарэчы, метамфетамін — моцнадзейны сродак, які ўзбуджае цэнтральную нервовую сістэму, павышае артэрыяльны ціск, тэмпературу цела і тэмп дыхання. Пастаяннае ўжыванне наркатычнага рэчыва прыводзіць да псіхозу, падобнага на шызафрэнію, да слыхавых і зрокавых галюцынацый. У хранічных спажыўцоў высокіх дозаў метамфетаміну назіраюцца разлютаваныя і сумбурныя паводзіны. Па сваім прамым уздзеянні на здароўе — адзін з самых небяспечных прэпаратаў. Нават непрацяглае ўжыванне апошняга можа прывесці да лятальнага выніку.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.42	17.06	9.24
Віцебск —	7.35	16.52	9.17
Магілёў —	7.32	16.56	9.24
Гомель —	7.24	16.58	9.34
Гродна —	7.56	17.22	9.26
Брэст —	7.52	17.27	9.35

Месяц

Апошняя квадра 6 лютага. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Івана (Іаана Златавуста).*

К. *Апалоніі, Бярнарды, Сабіны, Бярнарда, Кірылы, Раймунда, Эрыка.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



9 лютага

Дзве даты

1913 год — у Вільні Беларускі музычна-драматычны гурток упершыню паставіў камедыю Янкі Купалы «Паўлінка». Ролю Паўлінкі выканала Соф'я Маркевіч. На прэм'еры прысутнічаў і сам аўтар, які спецыяльна прыехаў з Санкт-Пецярбурга.

1493 год — стала вядомай (явілася) Жыровіцкая ікона Божай Маці — адна з найгалоўнейшых хрысціянскіх святынь Беларусі, якой праваслаўныя і грэка-католікі пакланяюцца як цудатворнай. Паводле падання, ікону знайшлі ў лесе, на дзічы-грушы. Абраз, упрыгожаны каштоўнымі камянямі і дарагім акладам, захоўваецца ў Жыровіцкім Успенскім манастыры, які быў пабудаваны на месцы, дзе ён і быў знойдзены.

Цытата дня:

«Ёсць толькі дзве формы жыцця: гніенне і гарэнне».

Максім Горкі (1868—1936), рускі пісьменнік і літаратурны крытык.

РЫТУАЛЬНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ВАДЫ НА ПРАЦЯГУ КАЛЯНДАРНАГА ГОДА: ПАЧАТАК ЛЕТА

Русальны тыдзень (восьмы пасля Вялікадня, першы пасля Тройцы)

● Духаў дзень у народнай свядомасці звязаны з ушанаваннем русалак, а ўвесь перыяд з панядзелка пасля Тройцы да наступнага панядзелка называецца Русальны тыдзень. Беларусы верылі, што ў гэтыя дні русалкі выходзяць з вады і могуць нашкодзіць чалавеку: заманіць маладых хлопцаў у сваё падводнае царства. Менавіта таму ўвесь гэты тыдзень дзяцей не пускалі гуляць каля адкрытых вадаёмаў, а дарослым забаранялася купацца.

● У той жа час трэба было раніцай абавязкова схадзіць да крыніцы або калодзежа і набраць вады, якая, па меркаванні многіх знахараў, была асабліва карыснай і гаючай.

● У чацвер на гэтым тыдні, які называлі Сухім або Аблівахам, маладыя людзі, нежанатыя і жанатыя, абавязкова аблівалі адно аднаго водой, каб улетку не было засухі.

Дзевятуха і Дзесятуха (дзявяты і дзясяты тыдні пасля Вялікадня)

● Асабліва гаючай лічылі ваду ў чацвер на дзявятым і дзясятым тыднях пасля Вялікадня. У гэтыя дні сяляне абавязкова ішлі да крыніц, каб папіць і ўзяць з сабой гаючай вады.

6 ліпеня — Купалле

● Можна з поўным правам сказаць, што Купалле — гэта свята ўшанавання стыхіі вады. Увечары каля вады палілі вогнішчы, чакалі раніцы (ноччу купацца забаранялася!!!), каб убачыць, як Купала (Бог Сонца Ярыла) купаецца ў вадзе. І пасля таго, як ваду асвяціла нябеснае свяціла, усе: і малыя, і старыя, таксама купаліся ў гэтай вадзе, каб набрацца моцы і здароўя на ўвесь год.

● Там, дзе не было вадаёмаў, у гэты дзень ставілі ваду пад «зоры», каб раніцай памыцца і тым самым засцерагчыся ад сурокаў.

7 ліпеня — Іван Купала, Іаан Хрысціцель

● У гэтую раніцу ўвесь вясковы люд сустракаў усход Сонца каля вады. Усе чакалі самую загадкавую і фантастычна цікавую падзею: Сонца, якое дасягнула свайго росквіту, ад радасці «купалася» ў вадзе, таму ўсе прысутныя ішлі з задавальненнем пакупацца ў гэтай чароўнай, цудадзейнай вадзе, каб таксама набрацца моцы, здароўя, энергіі.

● Пасля сустрэчы «іграючага» Сонца людзі ішлі да свяшчэнных крыніц, каб папіць святой вады з надзеяй направіць сваё здароўе.

12 ліпеня — Пятрок

● У гэты дзень стаўленне да вады было асабліваe. Існавала цудадзейная традыцыя — хадзіць да крыніц, каб папіць гаючай вільгаці, а затым трэба было «пакачацца» па ранішняй расе.

● Катэгарычна забаранялася ў гэты дзень купацца. У нашым народзе свята верылі, што вада на Пятра забірае ахвяру Богу: «Сож бярэ дваццаць пяць чалавек у дзень Пятра».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

З дзённіка халасцяка.

Сёння вярнуўся дадому і спачатку вырашыў, што кватэру абакралі. А потым зразумеў — гэта ж я з раніцы чыстыя шкарпэткі шукаў.

☺

Адысея — яркі прыклад таго, якія казкі можа прыдумаць мужык, тлумачачы сваёй жонцы, дзе ён бадзяўся апошнія пятнаццаць гадоў.

☺

— Колькі каштуе вада?

— Залежыць ад таго, што гэтай вадой развозіць...

Фота слова

Мне знаёмы філосаф
аднойчы казаў:
Ўвесь Сусвет
па агульным Законе жыве —
Ты багаты на тое,
што камусьці аддаў,
Ты на тое збяднеў,
што пакінуў сабе.
Дзеліш неруш,
ці песню якую спяваў,
Аддаеш незнаёмцу,
альбо дружбаку,
Нават хлеба крышанчык,
што птушцы аддаў —
Па Законе —
залічаць табе на вяку.

(Учарашнім марозным вечарам я зрабіў гэты здымак у мінскім парку даволі далёка ад закаванай ільдом рэчкі. Птушак, якія звычайна зімуюць у незамерзлых палонках, на заснежанай палянцы кармілі дзеці.)

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 626. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12